УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ П.М. МАШЭРАВА”

Факультэт гуманітарыстыкі і моўнай камунікацыі

Кафедра беларускай і рускай філалогіі

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА<br>Загадчык кафедры<br>_______________ Т.П. Слесарава<br>29.04.2024 | УЗГОДНЕНА<br>Дэкан факультэта<br>_______________ С.У. Нікалаенка<br>29.04.2024 |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

для спецыяльнасці

6-05-0232-01 Беларуская філалогія

Складальнік: Г.А. Гладкова

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні навукова-метадычнага савета 25.06.2024, пратакол № 6

УДК 378.016:821.161.3(075.8)
ББК 83.3(4Беи)р30я73
М54

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 3 от 29.02.2024.

Складальнік: дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Г.А. Гладкова**

Р э ц э н з е н т ы :
прафесар кафедры правазнаўства і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Віцебскага філіяла Міжнароднага ўніверсітэта “МІТСО”,
доктар педагагічных навук, дацэнт *Л.С. Васюковіч*;
дацэнт кафедры сусветных моў ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат педагагічных наук, дацэнт *Л.І. Бобылева*

**М54** **Методыка выкладання беларускай літаратуры для спецыяльнасці 6-05-0232-01 Беларуская філалогія :** вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне / склад. Г.А. Гладкова. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024. – 87 с.
ISBN 978-985-30-0155-6.

Вучэбна-метадычны комплекс утрымлівае тэзісны курс лекцый, матэрыялы да практычных заняткаў, кантрольныя матэрыялы, а таксама тэмы для самастойнай работы студэнтаў.

Выданне адрасавана студэнтам філалагічных спецыяльнасцей, выкладчыкам, настаўнікам, а таксама ўсім, хто цікавіцца пытаннямі сучаснага выкладання беларускай літаратуры.

**УДК 378.016:821.161.3(075.8)**
**ББК 83.3(4Беи)р30я73**

**ISBN 978-985-30-0155-6**
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024

## ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ** .................................................................................... 5

**1. ЛЕКЦЫЙНЫ РАЗДЗЕЛ** ................................................................ 6
**МОДУЛЬ 1** ....................................................................................... 6
Лекцыя 1. Методыка выкладання беларускай літаратуры як навуковая дысцыпліна............................................................................. 6
Лекцыя 2. Беларуская літаратура як вучэбны прадмет у сучаснай сярэдняй школе ..................................................................................... 7
Лекцыя 3. Прынцыпы, змест і асноўныя этапы адукацыі ў сучаснай школе .................................................................................................. 8
Лекцыя 4. Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу ............................................................................................... 9
Лекцыя 5. Літаратурнае развіццё школьнікаў .................................. 10
Лекцыя 6. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры ........................................................................................... 11
Лекцыі 7-8. Метады і прыёмы навучання літаратуры........................ 13
Лекцыя 9. Этапы вывучэння мастацкага твора ................................. 20

**МОДУЛЬ 2** ...................................................................................... 24
Лекцыя 10. Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы ........................................................................................... 24
Лекцыя 11-12. Урок літаратуры ў сучаснай школе ........................... 28
Лекцыя 13. Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм ................... 32
Лекцыя 14. Вывучэнне літаратурна-крытычных артыкулаў. Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні ..................................................... 34
Лекцыя 15. Развіццё маўлення вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі............................................................................................... 36
Лекцыя 16. Літаратурная творчасць навучэнцаў. Факультатыўныя заняткі................................................................................................. 40
Лекцыя 17. Пазакласная і пазашкольная работа па літаратуры .......... 41

**2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ** ............................................................. 43
**МОДУЛЬ 1** ...................................................................................... 43
Практычныя заняткі 1. Беларуская літаратура як вучэбны прадмет у сучаснай сярэдняй школе ................................................................. 43
Практычныя заняткі 2. Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу ............................................................... 44
Практычныя заняткі 3. Літаратурнае развіццё школьнікаў................ 44
Практычныя заняткі 4. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры .................................................................... 45
Практычныя заняткі 5. Метады і прыёмы навучання літаратуры...... 45
Практычныя заняткі 6. Этапы вывучэння мастацкага твора .............. 47

**МОДУЛЬ 2** .................................................................................... 49
Практычныя заняткі 7-8. Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы.............................................................................. 49
Практычныя заняткі 9. Урок літаратуры ў сучаснай школе............... 52
Практычныя заняткі 10. Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм 54
Практычныя заняткі 11. Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні 55
Практычныя заняткі 12. Развіццё маўлення вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі ...................................................................... 56
**3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ** ....................................................... 59
**4. ДАДАТКОВЫ РАЗДЗЕЛ** ................................................................... 67
4.1 Змест вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай літаратуры” ............................................................................................ 67
4.2 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны ........................ 70
4.3 Матэрыялы для самастойнай работы ............................................ 72
4.4 Узор плана-канспекта ўрока па беларускай літаратуры ................ 76
4.5 Асноўная і дадатковая літаратура .................................................. 81

**ДАДАТКІ** .......................................................................................... 82

# УВОДЗІНЫ

Вывучэнне дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай літаратуры” прадугледжана на спецыяльнасці 6-05-0232-01 Беларуская філалогія. Якасная прафесійная падрыхтоўка студэнтаў накіравана на аваладванне не толькі тэарэтычным матэрыялам, але і на фарміраванне навыкаў практычнага прымянення тэорыі ў школьным выкладанні беларускай літаратуры.

Вучэбна-метадычны комплекс (далей – ВМК) па методыцы выкладання беларускай літаратуры распрацаваны з улікам патрабаванняў, якія прад’яўляюцца да адукацыі на сучасным этапе, да ўдасканалення метадаў і прыёмаў выкладання слоўнага мастацтва ва ўмовах асобасна арыентаванага навучання беларускай літаратуры.

**Вучэбная** дысцыпліна адносіцца да кампаненту **“Дзяржаўны кампанент” (метадычны модуль).**

**Мэта выкладання вучэбнай дысцыпліны** – падрыхтоўка высокакваліфікаваных настаўнікаў беларускай літаратуры.

**Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны:** выпрацаваць навукова абгрунтаваную аптымальную сістэму літаратурнага навучання; даць студэнтам грунтоўныя веды па асноўных праблемах сучаснай методыкі выкладання літаратуры ў школе; выпрацаваць трывалыя навыкі выбару і выкарыстання аптымальных метадаў і прыёмаў выкладання літаратуры; навучыць правільнай арганізацыі ўрока літаратуры і пазакласнай працы па літаратуры; выпрацоўваць у студэнтаў уменне праводзіць выхаваўчую работу на ўроках літаратуры па фарміраванню палітычнай культуры вучняў, патрыятызму, дакладнаму разуменню нацыянальнай ідэі.

У выніку вывучэння дысцыпліны фарміруецца наступная кампетэнцыя:

**БПК-20.** Ажыццяўляць метадычна арыентаваны аналіз літаратурных твораў і з’яў літаратурнага працэсу, валодаць тэхналогіяй сучаснага ўрока літаратуры.

*Студэнт павінен:*

**ведаць:** спецыфіку літаратуры ў шэрагу іншых мастацтваў; асноўныя этапы і шляхі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры; агульныя заканамернасці гісторыка-літаратурнага працэсу; галоўныя факты жыцця і творчасці вывучаемых пісьменнікаў, этапы іх творчай эвалюцыі; змест, гісторыка-культурны кантэкст і творчую гісторыю вывучаемых твораў, спецыфіку арганізацыі працэсу навучання літаратуры;

**умець:** даваць ідэйна-эстэтычную ацэнку мастацкаму твору як з'яве мастацтва; аналізаваць і інтэрпрэтаваць літаратурны твор як мастацкае цэлае ў яго гісторыка-літаратурнай абумоўленасці і культурным кантэксце з выкарыстаннем паняційнай прасторы літаратуразнаўства; аналізаваць тэксты ў адзінстве формы і зместу, гісторыка-літаратурных звестак і тэарэтыка-літаратурных паняццяў, у залежнасці ад іх родавай і жанравай спецыфікі;

– карыстацца сучаснымі метадамі вывучэння літаратурных з'яў і працэсаў, выяўляючы і крытычна ацэньваючы іх сутнасць і генезіс; прымяняць веды, атрыманыя ў вобласці літаратуразнаўства, для рашэння філалагічных канкрэтных навукова-практычных і выкладчыцкіх задач, а менавіта – у праектаванні і практычнай рэалізацыі працэсу навучання літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, выкарыстанні тэхналогій пабудовы сучаснага ўрока літаратуры, метадаў, прыёмаў, форм навучання гэтай дысцыпліне;

**валодаць:** навыкамі планавання і правядзення ўрокаў па прадмеце “Беларуская літаратура”; канцэптуальнымі падыходамі да вывучэння літаратуры ў школе.

# 1. ЛЕКЦЫЙНЫ РАЗДЗЕЛ

## МОДУЛЬ 1

### Лекцыя 1. Методыка выкладання беларускай літаратуры як навуковая дысцыпліна

**Праблемнае поле:**

- Тэарэтычныя асновы курса методыкі выкладання літаратуры.
- Прадмет, змест і задачы курса, яго структура.
- Сувязь з прадметамі гуманітарнага, псіхолага-педагагічнага, літаратуразнаўчага і лінгвістычнага цыклу.

**Методыка выкладання беларускай літаратуры (МВБЛ)** - навука педагагічнага цыкла, якая дазваляе эфектыўна арганізаваць вывучэнне літаратуры як вучэбнага прадмета, а таксама паспяхова вырашаць задачы выхавання і развіцця асобы.

**Змест** методыкі выкладання беларускай літаратуры складаецца з **наступных раздзелаў:**

1. **Агульныя асновы методыкі** (развіццё методыкі, метадычныя школы; праблемы, прынцыпы і метады выкладання).
2. **Сістэма вывучэння літаратуры на ўроках** (шляхі, метады, прыёмы вывучання літаратуры; выпрацоўка ўменняў і навыкаў; самастойная праца вучняў).
3. **Сістэма пазакласнай працы** (разнастайнасць і сістэмнасць пазакласнай працы).

Як і кожная навучальная дысцыпліна, МВБЛ мае свае **задачы:**

- пазнаёміць вучняў з тэарэтычнымі асновамі беларускай літаратуры;
- выпрацаваць першапачатковыя практычныя ўменні і навыкі для падрыхтоўкі да ўрока літаратуры;
- дапамагчы настаўніку падрыхтаваць эфектыўныя заняткі, якасна праводзіць самарэфлексію.

МВБЛ цесна звязана з такімі навукамі, як педагогіка, псіхалогія, лінгвістыка, сусветная і нацыянальная гісторыя, этыка і эстэтыка, этнаграфія і мастацтвазнаўства, рыторыка, агульная педагогіка і дыдактыка, філасофія, сацыялогія, культуралогія.

МВБЛ цесна звязана з ***метадалогіяй, тэорыяй літаратуры***. Гэта сувязь выяўляецца ў вызначэнні мэты, зместу і структуры курса літаратуры. Метадалогія літаратуразнаўства аказвае ўплыў і на метады навучання.

МВБЛ звязана з ***педагогікай*** **і** ***псіхалогіяй***. Псіхалогія дае настаўніку веды аб узроставых адметнасцях дзяцей, садзейнічае наладжванню цеснага кантакту з вучнямі, выяўленню іх характару ўспрымання твора, асаблівасцей памяці. Дзякуючы педагогіцы настаўнік мае магчымасць даведацца пра агульнадыдактычныя прынцыпы, метады і прыёмы выкладання, віды ўрокаў і інш.

Літаратуразнаўства дапамагае адказаць на першае пытанне методыкі – ***што вывучаць?*** Педагогіка і псіхалогія даюць настаўніку адказ на другое пытанне методыкі: ***як вывучаць?***

Нельга вывучаць беларускую літаратуру, не звяртаючы ўвагі на маральна-этычны бок мастацкага твора. У гэтым праяўляецца сувязь літаратуры з ***этыкай***.

Неабходным бачыцца веданне ***гісторыі,*** бо пісьменнік – гэта прадстаўнік пэўнага гістарычнага часу. Мастацкія творы могуць быць створаны на аснове летапісаў, дакументальных крыніц і г.д. Гістарычны аспект у дачыненні да аналізуемага твора методыка літаратуры рэкамендуе выкарыстоўваць з улікам часу напісання твора, часу, які адлюстраваны ў творы, і сённяшняга часу.

# Лекцыя 2. Беларуская літаратура як вучэбны прадмет у сучаснай сярэдняй школе

**Праблемнае поле:**

- Своеасаблівасць літаратуры ў шэрагу іншых школьных прадметаў.
- Мэты і задачы вывучэння беларускай літаратуры ў школе.

Беларуская літаратура як вучэбны прадмет уведзена ў школьныя вучэбныя планы ў 1923 г. У наш час ва ўстановах адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй адукацыі, вывучаецца як самастойны прадмет у V–XI класах. Яна выконвае розныя функцыі: *пазнавальную, выхаваўчую, эстэтычную і геданічную*. Аднак найперш яна – крыніца чалавеказнаўства, грамадазнаўства і мастацтвазнаўства. Праз яе вучні вывучаюць гісторыю і культуру свайго народа, далучаюцца да агульначалавечых каштоўнасцей.

Агульныя мэты школьнага курса беларускай літаратуры акрэслены "**Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі"** (нов. рэд. ад 14.01.2022 г.). Вывучэнне беларускай літаратуры спрыяе гарманічнаму развіццю асобы; фарміруе і ўмацоўвае нацыянальую свядомасць грамадзяніна Рэспублікі Беларусь; фарміруе экалагічную свядомасць; выхоўвае павагу да сямейнага жыцця; садзейнічае выхаванню чалавечнасці і міласэрнасці і інш.

У адпаведнасці з "**Адукацыйным стандартам базавай адукацыі**" (АСБА) (зацв. 26.12.2018 г.) аснову зместу літаратуры як вучэбнага прадмета складаюць "чытанне і вывучэнне мастацкіх твораў беларускай літаратуры". Асноўным крытэрыем адбору мастацкіх твораў для абавязковага чытання, абмеркавання і вывучэння, дадатковага чытання з'яўляюцца іх высокая мастацкая значнасць, гуманістычная накіраванасць, пазітыўны ўплыў на асобу навучэнца, адпаведнасць задачам яго развіцця і ўзроставым асаблівасцям, а таксама культурна-гістарычныя традыцыі і вопыт айчыннай адукацыі.

Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе павінна вырашаць наступныя **задачы**:

- ❖ фарміраванне здольнасці разумець і эстэтычна ўспрымаць творы беларускай літаратуры;
- ❖ пашырэнне духоўнага вопыту навучэнцаў шляхам іх далучэння да маральных каштоўнасцей беларускай літаратуры,
- ❖ фарміраванне ўменняў супастаўляць творы беларускай літаратуры з творамі сусветнага прыгожага пісьменства, знаходзіць у іх сугучныя тэмы, праблемы, ідэі, выяўляць нацыянальна- і культурна абумоўленыя адрозненні;
- ❖ развіццё і ўдасканальванне вуснага і пісьмовага беларускага маўлення".

Беларускай літаратуры як вучэбнаму прадмету ў школе належыць асобнае месца. З аднаго боку, беларуская літаратура – дысцыпліна культуралагічнай скіраванасці са сваім суб'ектыўным пачаткам, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ў школе – сродак эстэтычнага асваення жыцця, яго маральных нормаў і вартасцей. З другога боку, пры вывучэнні нацыянальнай літаратуры акрамя знаёмства з пэўнай інфармацыяй і засваеннем яе найлепшым чынам можна рэалізаваць усе адукацыйныя мэты. Вялікая культурная каштоўнасць літаратуры ў тым, што яна ўяўляе неацэннае і незамянімае ідэйна-эстэтычнае багацце, вялікі духоўны здабытак беларускага народа, валодае магутным ідэйна-выхаваўчым і грамадска-педагагічным патэнцыялам.

Такім чынам, **асноўныя мэты і задачы вывучэння беларускай літаратуры ў школе** – далучыць вучняў да набыткаў айчыннай мастацкай славеснасці (у кантэксце сусветнай), развіць іх здольнасці да эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі з'яў літаратуры; фарміраваць на гэтай падставе эстэтычны густ, акрэсленую грамадзянскую пазіцыю, духоўна-маральныя каштоўнасці, камунікатыўную культуру вучняў.

## Лекцыя 3. Прынцыпы, змест і асноўныя этапы адукацыі ў сучаснай школе

**Праблемнае поле:**

- Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і іх рэалізацыя пры выкладанні літаратуры.
- Канцэпцыя развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура".
- Прынцыпы выкладання літаратуры. Кампаненты зместу літаратурнай адукацыі. Этапы літаратурнай адукацыі.

Літаратура як прадмет школьнага навучання адыгрывае асабліва важную ролю ў ажыццяўленні мэт, якія вызначаны "**Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі**" і "**Адукацыйным стандартам базавай адукацыі**". У апошнім дакуменце падкрэслена, што дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі грунтуецца на прынцыпе прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей.

Так, мэтамі выкладання беларускай літаратуры ў АСБА названы:

✓ выхаванне духоўна развітай асобы, фарміраванне гуманістычнага светапогляду, грамадзянскай свядомасці, пачуцця патрыятызму, павагі да літаратуры і каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры;

✓ развіццё эмацыянальнага ўспрымання мастацкага тэкста, вобразнага і аналітычнага мыслення, творчага ўяўлення, чытацкай культуры і разумення аўтарскай пазіцыі; фарміраванне ўяўленняў пра спецыфіку літаратуры сярод іншых мастацтваў, патрэбы ў самастойным чытанні мастацкіх твораў; развіццё вуснага і пісьмовага маўлення навучэнцаў;

✓ засваенне тэкстаў мастацкай літаратуры ў адзінстве формы і зместу, асноўных гісторыка-літаратурных звестак і тэарэтыка-літаратурных паняццяў;

✓ авалоданне ўменнямі чытання і аналізу мастацкіх твораў з улікам базавых літаратуразнаўчых паняццяў і неабходных звестак па гісторыі літаратуры; выяўленне ў творах канкрэтна-гістарычнага і агульначалавечага зместу; граматнага выкарыстання беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

Праграмны матэрыял па беларускай літаратуры дае настаўніку шырокія магчымасці для рэалізацыі пастаўленых задач.

**Дыдактычныя і літаратуразнаўчыя прынцыпы**: навуковасць, гістарызм, сувязь навучання і выхавання, устаноўка на развіццё вучня, аналіз твора ў адзінстве зместу і формы і інш.

**Метадычныя прынцыпы выкладання літаратуры** прадугледжваюць узаемадзеянне мастацтва і рэчаіснасці ў эстэтычнай свядомасці школьнікаў, улік узроставых асаблівасцей літаратурнага развіцця вучняў, улік асобаснага характару чытацкай і літаратурна-творчай дзейнасці, сувязь літаратуры з законамі мастацкага

мыслення, варыятыўнасць заняткаў па літаратуры, адзінства літаратурнага і моўнага развіцця, вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай.

**Этапы літаратурнай адукацыі:**

**Першая ступень – пачатковыя класы (I-IV).** Прапедэўтычны курс чытання ў пачатковых класах прадугледжвае пераемнасць дадзенага этапа з дашкольным. Спецыфіка ўспрымання мастацкага твора малодшымі школьнікамі грунтуецца на псіхалагічных асаблівасцях вучняў. Задачы курса: выпрацоўка элементарных механізмаў работы вучняў з літаратурным тэкстам, развіццё эмоцый і фантазіі вучняў, здольнасць пачаткоўцаў ахапіць поглядам змест мастацкага твора, ацаніць некаторыя элементы формы.

**Другая ступень – базавая школа (V-IX).** Беларуская літаратура як самастойны прадмет выступае з V класа. На дадзеным этапе рэалізуецца прынцып бесперапыннасці і паслядоўнасці літаратурнай адукацыі (V-VIII класы); фарміруецца цэласнае ўяўленне пра выдатныя ўзоры беларускага мастацтва слова, гістарычнае развіццё літаратуры і яе ідэйна-эстэтычнае багацце (IX клас). Задачы курса: фарміраванне ў вучняў здольнасцей разумець мастацкую манеру пісьменніка ў межах асобнага твора; успрымаць літаратуру як від мастацтва.

**Трэцяя ступень – сярэдняя школа (X-XI).** Адбываецца вывучэнне літаратуры на гістарычнай аснове. Фарміруецца ўяўленне пра агульныя заканамернасці і асноўныя этапы развіцця беларускай і сусветнай літаратуры, пра пераемнасць літаратурных эпох; паказваецца своеасаблівасць беларускай літаратуры, яе месца і роля ў сусветным літаратурным працэсе; працягваецца выхаванне эстэтычна развітага чытача, які ўспрымае літаратурны твор у адзінстве ідэйна-мастацкага зместу і валодае крытэрыямі эстэтычнай ацэнкі. Задачы курса: развіццё канцэптуальнага чытацкага мыслення; вывучэнне канкрэтных твораў і творчасці пісьменнікаў у некалькіх колах кантэксту.

## Лекцыя 4. Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу

**Праблемнае поле:**

- Прафесійныя веды і педагагічныя ўменні настаўніка-славесніка.
- Класіфікацыя педагагічных уменняў педагога. Асобасныя якасці настаўніка.
- Планаванне і імправізацыя як умовы педагагічнай творчасці. Уплыў асобы настаўніка на школьнікаў. Роля самаадукацыі. Светапоглядная аснова асобы настаўніка, ажыццяўленне ім сучаснай культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.
- Школьны кабінет літаратуры.

Ідэалы і роля прафесіі настаўніка-славесніка гістарычныя, яны мяняюцца з развіццём грамадства, залежаць ад яго сацыяльнай арганізацыі, ідэалогіі і культуры.

Гаворачы пра гістарычнасць настаўніцкай прафесіі, нельга не зазначыць, што ёсць у гэтых ідэалах ўстойлівасць, якая фармавалася на працягу стагоддзяў, - гэта гуманістычная накіраванасць прафесіі настаўніка-літаратара. Яна абумоўлена як педагагічнай сутнасцю, так і непарыўнай сувяззю з мастацкай літаратурай. Зыходзячы з гэтага, можна вылучыць **патрабаванні** да настаўніка беларускай літаратуры. Яны падзяляюцца на агульнадыдактычныя і вузкаспецыяльныя.

***Агульнадыдактычныя патрабаванні:***

1. Ведаць дыялектычныя асновы выкладаемай навукі.
2. Валодаць агульнымі метадамі перадачы ведаў.
3. Быць камунікабельным, кантактным, цярплівым (К.С. Усманаў);
4. Быць стрыманым, ураўнаважаным, добразычлівым, ветлівым, паважаць асобу навучэнца (А.А. Жураўлёў);

5. Ведаць і ўлічваць узроставыя асаблівасці мыслення вучняў, аб'ём і характар іх жыццёвага вопыту.

6. Быць паслядоўным, прынцыповым, захоўваць такт, удасканальваць самадысцыпліну (У.С. Гронеў); валодаць такімі якасцямі, як дабрыня, любоў да дзяцей, эмпатыя.

7. Разумець сутнасць выкладаемага прадмета, этапы яго развіцця, сучасны стан, сувязь з іншымі навукамі і практыкай.

8. Цікавіцца і авалодваць новымі тэхналогіямі навучання.

9. Уяўляць сабой узор высокамаральнай асобы.

***Вузкаспецыяльныя патрабаванні:***

1. Быць пасрэднікам паміж пісьменнікам і навучэнцамі-чытачамі.
2. Мець уласную ацэнку мастацкага твора, які вывучаецца ў школьным курсе беларускай літаратуры.
3. Сачыць за літаратурнымі навінкамі.
4. Быць эмацыянальна настроеным на чытанне мастацкага твора.
5. Мець творчы падыход да выкладання літаратуры.
6. Бездакорна валодаць роднай мовай у яе вуснай і пісьмовай формах.
7. Ведаць гісторыю беларускага народа, асобнага рэгіёна.
8. Быць папулярызатарам культурных традыцый беларускага народа.

Творчасць ляжыць у самой прыродзе настаўніцкай працы, хоць, як вядома, не кожны настаўнік – творца. Каб быць творцам, трэба мець сваю пазіцыю, сваё педагагічнае крэда, трэба ўдасканальваць майстэрства, шукаць свой стыль, выпрацоўваць індывідуальную выхаваўча-педагагічную сістэму.

**Школьны кабінет літаратуры** – гэта арганізацыйна-метадычны цэнтр работы настаўніка-славесніка. Афармленне кабінета адыгрывае важную ролю ў стварэнні атмасферы, якая стымулюе цікавасць да прадмета. Пажадана ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры размясціць партрэты пісьменнікаў, мовазнаўцаў і літаратуразнаўцаў, краязнаўчыя матэрыялы, зрабіць пастаянную выставу (напрыклад, "Віцебшчына літаратурная"), дзе пад кожным партрэтам размясціць кароткую біяграфічную інфармацыю, цытаты з твораў пісьменнікаў. Настаўніку пажадана мець камплект рэпрадукцый карцін выяўленчага мастацтва, ілюстрацый да мастацкіх твораў, якія рэкамендуецца выкарыстоўваць на ўроках для развіцця творчага мыслення навучэнцаў.

Стэнды – абавязковая частка кабінета. Настаўніку карысна стварыць стэнды, прысвечаныя літаратурным жанрам, тут можна размясціць Літаратурны каляндар, цытатную скрыню, інтэрактыўны стэнд "Літаратурны герой месяца" і г.д.

Афармленне кабінета беларускай мовы і літаратуры – творчы працэс, які матывуе настаўніка і вучняў на эфектыўную працу.

Карысныя парады можна атрымаць, азнаёміўшыся з артыкулам: Навумчык, М.І. Дзейнасць кабінета беларускай мовы і літаратуры // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2009. – № 5. – С. 19-23.

## Лекцыя 5. Літаратурнае развіццё школьнікаў

### Праблемнае поле:

- Узроставыя асаблівасці і этапы літаратурнага развіцця вучняў.
- Літаратурныя здольнасці вучняў: чытацкія і творчыя. Праблема крытэрыяў літаратурнага развіцця вучняў.
- Вывучэнне чытача-школьніка як метадычная праблема. Этапы развіцця чытача-школьніка: пачатковы, малодшыя падлеткі, старэйшыя падлеткі, юнацкі ўзрост.

Традыцыйна школьнікаў V – XI класаў падзяляюць на 3 ўзроставыя групы:

- малодшы падлеткавы ўзрост (V – VII класы)
- старэйшы падлеткавы ўзрост (VIII – IX класы)
- старэйшы школьны ўзрост: ранняе юнацтва (X – XI класы)

*Падлеткавы ўзрост* вучняў (V – IX класы) адпавядае пачатку пераходу ад дзяцінства да юнацтва. Асаблівасцю гэтага ўзросту з'яўляецца дапытлівасць, імкненне да пазнання і інфармацыі, падлетак імкнецца авалодаць як мага большай колькасцю ведаў. Для падлеткаў уласцівы актыўнае імкненне далучыцца да жыцця дарослых, арыентацыя паводзін на ўласныя нормы і каштоўнасці, развіццё самасвядомасці і самаацэнкі, цікавасць да сябе як да асобы, да сваіх магчымасцей і здольнасцей. Адным з вядучых відаў дзейнасці у гэтым узросце з'яўляецца камунікатыўная дзейнасць.

*Старэйшы школьны ўзрост (перыяд ранняга юнацтва*) прыпадае на час навучання ў *X–XI класах*. Юнацтва разглядаецца у навуковай літаратуры як узрост пераходу да самастойнасці, перыяд самавызначэння, набыцця псіхічнай і грамадзянскай сталасці, фарміравання светапогляду, маральнай свядомасці і самасвядомасці. Юнацкі ўзрост характарызуецца павышанай эмацыянальнай узрушанасцю (неўраўнаважанасць, рэзкая змена настрою, трывожнасць). Адметнай рысай гэтага ўзросту з'яўляецца і юнацкі *максімалізм*, своеасаблівы *эгацэнтрызм* (катэгарычнасць, празмерная палярнасць у сітуацыях выбару або ацэнкі), што, безумоўна, адбіваецца і на ўспрыманні твораў мастацкай літаратуры.

**Крытэрыі літаратурнага развіцця**:

• начытанасць школьнікаў;

• аб'ём тэарэтыка-літаратурных ведаў;

• здольнасць да выяўлення праблематыкі;

• развітасць успрымання літаратурных твораў на 4-х узроўнях: эмацыянальная чуйнасць,

асэнсаванне зместу твора, мастацкай формы;

• уменні аналізаваць тэкст мастацкага твора;

• здольнасці і ўменні, звязаныя з літаратурна-творчай дзейнасцю школьнікаў (У.Г. Маранцман).

**Этапы развіцця чытача-школьніка.**

**Пачатковы этап (дашкольны і школьны, I-IV класы).** Этап мае важнае значэнне для далейшай літаратурнай адукацыі школьнікаў. У пачатковых класах ідзе фарміраванне чытацкіх уменняў і здольнасцей, з'яўляюцца першыя спробы літаратурнай творчасці.

Для вучняў **V-VI класаў** як спосаб успрымання мастацтва і рэчаіснасці характэрны “наіўны рэалізм”, спалучэнне эмацыянальнай цэласнасці і лагічнай фрагментарнасці ў непасрэдным чытацкім успрыманні, цяжкасці спасціжэння мастацкай формы.

**VII-VIII класы** – перыяд інтэнсіўнага развіцця чытацкага ўяўлення і абстрактнага мыслення, паглыбленая ўвага да сваёй асобы. Абвостраная назіральнасць і ўспрымальнасць старэйшых падлеткаў становяцца ўмовамі для паглыбленага прачытання мастацкіх твораў.

Юнацкі ўзрост (**IX-XI класы**) – важны этап у развіцці чалавечай асобы, перыяд асэнсавання гістарычных і эстэтычных сувязей мастацтва з жыццём. Для чытачоў юнацкага ўзросту характэрны высокі ўзровень чытацкага ўспрымання, развітая здольнасць абстрагавання і пазнання заканамернасцей акаляючага свету, багацце і асэнсаванасць эмоцый.

# Лекцыя 6. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры

**Праблемнае поле:**

- Выдатныя беларускія асветнікі і мысліцелі. Роля рускіх педагогаў і метадыстаў XIX – XX ст.
- Першыя беларускія чытанкі.
- Выкладанне беларускай літаратуры ў 20-я гг. XX ст., асаблівасці выкладання ў 30-я гг. Развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры ў 40-80-я гг. XX ст.
- Перыядычны друк, метадычная літаратура. Праграмы і падручнікі. Метадычныя дапаможнікі настаўніку.
- Сучасны стан і перспектывы літаратурнай адукацыі.

Методыка выкладання беларускай літаратуры як навука грунтуецца на багатых традыцыях народнай педагогікі беларусаў і прагрэсіўных асветніцкіх ідэях Ф. Скарыны, В. Цяпінскага, С. Полацкага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча.

У XIX ст. станаўленне методыкі выкладання беларускай літаратуры адбывалася пад уплывам дасягненняў расійскіх метадыстаў (Ф.І. Буслаеў, В.І. Вадавозаў, У. Я. Стаюнін, В. П. Астрагорскі і інш.).

Выдатнымі беларускімі метадыстамі былі Цётка, Я. Колас, Я. Лёсік, якія ў пачатку XX ст. падрыхтавалі і выдалі для пачатковай школы першыя падручнікі на беларускай мове.

«Першае чытанне для дзетак беларусаў» – менавіта так называецца выдадзеная ў 1906 г. хрэстаматыя для дзяцей першага года навучання ***Цёткі***. У яе ўвайшлі невялікія апавяданні пра сялянскі побыт, вершы аб прыродзе, апрацаваныя народныя казкі, байкі, прыпеўкі, прыказкі, загадкі. У гэтым жа годзе выйшаў з друку падрыхтаваны Цёткай «Беларускі лемантар» (буквар), а таксама перакладзеная з украінскай мовы кніга «Гасцінец для малых дзяцей”.

Пачатую Цёткай справу прадоўжыў ***Якуб Колас***, які ў 1909 г. выдаў «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Дыдактычная задача большасці твораў, напісаных спецыяльна для чытанкі, – пашыраць асвету сярод сялянскіх дзяцей, фарміраваць у іх эстэтычнае пачуццё і уплываць на маральны воблік маленькіх навучэнцаў.

Функцыю падручніка па беларускай літаратуры ў школе і ВНУ выконвала «Гісторыя беларускае літаратуры» ***Максіма Гарэцкага*** (першае выданне 1920 г.).

Вялікі ўклад у станаўленне методыкі выкладання літаратуры ў Беларусі зрабіў прафесар ***Іван Замоцін***. Асабліва папулярнымі былі два выпускі яго метадычных нарысаў «Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні» (1927 – 1928). Гэта была першая навуковая праца па методыцы выкладання беларускай літаратуры.

У 1920-я гг. асаблівых поспехаў дасягнула школьнае краязнаўства, якое стала галоўным відам пазакласнай працы ў школах Беларусі. Першым тэарэтыкам школьнага краязнаўства ў Беларусі стаў ***Мікалай Каспяровіч***. Ён аўтар манаграфіі «Краязнаўства» (1929) і шэрагу артыкулаў, прысвечаных пытанням практычнай арганізацыі краязнаўчай працы ў школе.

Істотнай з’явай 1920-х гг. стала развіццё педагагічнага друку ў Беларусі. У чэрвені 1924 г. выйшаў у свет першы нумар часопіса «Асвета». Пастаяннымі аўтарамі часопіса былі вядомыя ў той час метадысты І.Замоцін, І.Самковіч, І.Пратасевіч, а таксама краязнаўца М.Каспяровіч.

У 1930-я гг. МВБЛ развівалася пад уплывам расійскіх вучоных. Найбольшых поспехаў у галіне методыкі ў гэты час дасягнула вядомы педагог ***Марыя Рыбнікава***. Яе тэарэтычныя напрацоўкі і педагагічны вопыт адлюстраваны ў працы «Очерки по методике литературного чтения» (1941).

З 1940 г. у Беларусі пачаў выдавацца часопіс "Савецкая школа", у якім праблемы выкладання беларускай мовы і літаратуры разглядаліся вельмі рэдка.

У пасляваенны перыяд у саюзных рэспубліках нацыянальная літаратура вывучалася ў асноўным па методыцы, распрацаванай маскоўскімі і ленінградскімі навукоўцамі, без уліку асаблівасцей нацыянальнай спецыфікі славеснага мастацтва.

Метадычную дапамогу па пытаннях выкладання беларускай літаратуры ў пасляваенны перыяд настаўнікі маглі атрымаць на старонках часопісаў "Савецкая школа" і "У дапамогу настаўніку", а таксама "Настаўніцкай газеты" (выдаецца з 1948 г. па сённяшні дзень).

У перыяд "адлігі" у рэспубліцы намецілася актывізацыя метадычнай думкі, у тым ліку і ў галіне МВБЛ. У школьныя праграмы ўпершыню былі ўключаны манаграфічныя тэмы, прысвечаныя творчасці П. Панчанкі, І. Шамякіна, Я. Брыля, І. Мележа.

У 1960–1970-х гг. бібліятэка настаўніка-філолага была папоўнена дапаможнікамі, прысвечанымі асобным метадычным пытанням: вывучэнне твораў з улікам іх родавай спецыфікі, выразнае чытанне, выкарыстанне твораў выяўленчага мастацтва на ўроках літаратуры, пазакласная праца, літаратурнае краязнаўства і інш. Міністэрства асветы БССР сумесна з выдавецтвам "Народная асвета" актыўна працавала над забеспячэннем настаўнікаў серыямі кніг "Бібліятэка настаўніка беларускай мовы і літаратуры", "Пісьменнік у школе" і інш.

У 1967 г., з'явілася кніга ***Міхаіла Лазарука*** "Тэорыя літаратуры ў школе", што сведчыла пра цікавасць да школьнага вывучэння тэорыі літаратуры. Створаны ў 70-я гг. М. Лазаруком і В. Івашыным падручнік "Беларуская літаратура" для 8 класа стаў лепшым падручнікам гістарыка-літаратурнага тыпу за ўвесь папярэдні перыяд. Вучні 9–10 класаў у гэты час вывучалі родную літаратуру па падручніках "Беларуская савецкая літаратура", напісаных Рыгорам Шкрабам.

Значны ўклад у развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры ўнёс ***Васіль Івашын***. Пад яго навуковым кіраўніцтвам быў падрыхтаваны падручнік для студэнтаў ВНУ "Вывучэнне літаратуры: пытанні методыкі" (1980). Значных поспехаў у галіне методыкі ў гэты час дасягнула ***Вера Ляшук***, якая стала ініцыятарам напісання першага грунтоўнага падручніка для студэнтаў "Методыка выкладання беларускай літаратуры" (1986).

Значнай падзеяй для настаўнікаў-філолагаў стала штомесячнае выданне з 1988 г. навукова-метадычнага часопіса "Беларуская мова і літаратура ў школе", які з 1992 г. выходзіць пад назваю "Роднае слова".

Значны ўклад у развіццё методыкі беларускай літаратуры ўнеслі ***Мікола Мішчанчук***, ***Вольга Русілка***, ***Валянціна Смыкоўская***, ***Аляксандр Лугоўскі*** і інш.

## Лекцыі 7-8. Метады і прыёмы навучання літаратуры

**Праблемнае поле:**

- Асноўныя класіфікацыі метадаў у дадактыцы. Класіфікацыя метадаў навучання ў методыцы выкладання літаратуры.

- Суадносіны паняццяў “метад” і “прыём”. Прыёмы эмацыянальна-вобразнага спасціжэння літаратурнага твора. Прыёмы спасціжэння аўтарскай пазіцыі.
- Інавацыйныя метады і прыёмы аналізу мастацкага твора. Камунікатыўна-дзейнасны, крэатыўны, культуралагічны падыходы да літаратуры.

**Метады выкладання** – гэта спосабы працы настаўніка і вучняў, з дапамогаю якіх дасягаецца авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі, фарміруецца светапогляд вучняў, развіваюцца іх здольнасці.

Кожны метад рэалізуецца праз прыватныя **метадычныя прыёмы**.

У методыцы выкладання літаратуры найбольш замацаваліся дзве класіфікацыі метадаў: ***па крыніцы атрымання ведаў*** (Васіль Галубкоў) і ***па характары дзейнасці настаўніка і вучняў*** (Мікалай Кудрашоў).

- **Па крыніцы атрымання ведаў (класіфікацыя В. Галубкова):**




Рыс. 1

## Славесныя метады

***Метад чытання*** – найважнейшы метад вывучэння літаратуры, а таксама эфектыўны сродак маральнага і эстэтычнага выхавання школьнікаў. Прымяняецца на ўсіх этапах вывучэння мастацкага твора (Рыс. 2).

Творы розных жанраў чытаюцца па-рознаму. М. Рыбнікава адзначала, што кожны твор павінен быць прачытаны і разабраны адпаведна яго прыродзе. Казкі і легенды не чытаюцца, а “расказваюцца па памяці”. Чытанне баек павінна ўспрымацца як толькі што прыдуманая гісторыя або выпадак. Пры чытанні лірычных вершаў трэба ўлічваць, што вершаваная мова больш эмацыянальная, дынамічная, у ёй ёсць рытм,

рыфма, памер. Пры вывучэнні драматычных твораў выкарыстоўваецца чытанне па ролях.

***Слова настаўніка*** можа быць рэалізавана ў наступных формах: *уступнае слова, гістарычны каментарый, гісторыка-культуралагічны каментарый, біяграфічная даведка, тэарэтычная даведка, лексічны каментарый, каментарый партрэта пісьменніка, каментарый эпіграфа да ўрока, заключнае слова* і інш.




Рыс. 2

**Пераказам** (Рыс. 3) называецца перадача ў вуснай ці пісьмовай форме прачытанага ці ўспрынятага на слых тэксту. Пераказ – адзін з асноўных відаў вусных і пісьмовых прац у працэсе выкладання літаратуры ў сярэдніх класах. Ён з'яўляецца дзейсным сродкам выпрацоўкі ў вучняў уменняў і навыкаў успрымання і асэнсавання тэксту, яго тэмы, ідэі. Праца над пераказам узбагачае слоўнікавы запас вучняў, спрыяе развіццю іх маўлення.

Віды пераказаў:

***Падрабязны (блізкі да тэксту) пераказ*** вымагае дакладнай і найбольш поўнай перадачы зместу невялікіх эпічных твораў або кампазіцыйна завершаных

урыўкаў з гэтых твораў. Навучанне падрабязнаму пераказу патрабуе ад настаўніка карпатлівай падрыхтоўчай працы з вучнямі: выразнае чытанне і каменціраванне тэксту, выкананне лексічных практыкаванняў, складанне плана.

***Сціслы пераказ*** накіраваны на выпрацоўку ў вучняў умення вылучаць у тэксце галоўнае, апускаць другараднае. Сціслы пераказ актыўна прымяняецца для праверкі ведання вучнямі зместу твора і ў час яго аналізу.

***Выбарачны пераказ*** у адрозненне ад падрабязнага і сціслага прадугледжвае «выбіранне» матэрыялу з усяго тэксту для раскрыцця вызначанай тэмы або праблемы. Ён часцей за ўсё прымяняецца пры вывучэнні значных па аб’ёме эпічных твораў. Выбарачны пераказ з’яўляеца дзейсным сродкам у падрыхтоўцы вучняў да напісання сачыненняў.




Рыс. 3

***Творчы пераказ.*** Найбольш пашыранай разнавіднасцю творчага пераказу з’яўляецца пераказ ад імя аднаго з герояў твора. Так, пры вывучэнні аповесці К. Чорнага «Насцечка» карысным будзе пераказ на тэму «Як прайшоў урок арыфметыкі» ад імя літаратурных аднагодкаў вучняў – Насцечкі і Сержа.

Блізкім да творчага пераказу з’яўляецца ***мастацкае расказванне***. Яно дазваляе больш вольна абыходзіцца з мастацкім творам: змяняць парадак эпізодаў, дапаўняць твор уласнымі разважаннямі, замяняць або дадумваць канцоўку твора. Мастацкае расказванне шырока выкарыстоўваецца пры вывучэнні эпічных твораў, асабліва народных казак, паданняў і легендаў.

***Гутарка*** з'яўляецца самым распаўсюджаным і ўніверсальным метадам навучання літаратуры, яна рэалізуецца на практыцы ў выглядзе старанна прадуманай сістэмы пытанняў настаўніка і адказаў вучняў.

Гутарка бывае *рэпрадуктыўная і эўрыстычная*.

*Рэпрадуктыўная* гутарка звычайна праводзіцца ў час праверкі дамашняга задання, выяўлення першапачатковага ўспрымання твора школьнікамі, пры паўтарэнні і абагульненні вывучанага матэрыялу. Такая гутарка размечана на

узнаўленне вучнямі ведаў, атрыманых з мастацкай літаратуры, з падручніка, са слоў настаўніка і іншых крыніц.

*Эўрыстычная* гутарка патрабуе ад вучняў роздуму, пошуку, вядзе іх да пэўных абагульненняў і «адкрыццяў». Яна выкарыстоўваецца ў асноўным пры аналізе твора мастацкай літаратуры (ацэнка ўчынкаў герояў, пошукі іх матывацыі, выяўленне аўтарскай пазіцыі і г.д.). Эўрыстычная гутарка ўяўляе сабою строгую сістэму пытанняў і заданняў, такую іх паслядоўнасць, каб кожнае наступнае як бы вынікала з папярэдняга адказу.

***Лекцыя*** – гэта вусны выклад якой-небудзь навуковай тэмы. На лекцыі вучні атрымліваюць максімальную колькасць інфармацыі з вуснаў настаўніка. Да метаду лекцыі славеснік звычайна звяртаецца ў старшых класах пры вывучэнні аглядавых тэм і біяграфіі пісьменніка.

## Наглядныя метады

❖ ***Ілюстраванне*** (Рыс. 4) прадугледжвае выкарыстанне слыхавога, зрокавага, мастацка-выяўленчага, графічнага, слоўна-вобразнага і камбінаванага відаў нагляднасці (радкі з твора, урыўкі з успамінаў, творы жывапісу, партрэт пісьменніка, ілюстрацыі да твораў, табліцы, схемы, літаратурныя карты).




Рыс. 4

***Вуснае славеснае маляванне*** заключаецца ў тым, што вучань пасля прачытання мастацкага твора (або ўрыўка) сваімі словамі малюе ўяўленую ім карціну. Славеснае маляванне атрымліваецца больш паспяховым, калі паралельна настаўнік праводзіць з вучнямі гутарку па ілюстрацыях мастакоў да твораў, што вывучаюцца на ўроку літаратуры. Па магчымасці неабходна паказваць вучням малюнкі, рэпрадукцыі карцін, ілюстрацыі па матывах вывучаемага твора. Школьнікам цікава супастаўляць карціны, створаныя іх уяўленнем, з творамі мастакоў-ілюстратараў.

***Складанне кадраплана*** вызначаецца дынамікай і нагадвае працу над стварэннем дыяфільма або сцэнарыя кінафільма. Пяцікласнікі, напрыклад, з ахвотаю складаюць кадраплан да раздзела «На рэчцы» з паэмы Я. Коласа «Новая зямля». Пры складанні кадраплана тэкст дзеліцца на часткі, але не адвольна, а з такім разлікам, каб кожная частка ўяўляла сабою асобны кадр з дыяфільма або эпізод з кінафільма. Затым вучні даюць падрабязнае апісанне кожнага кадра або эпізоду. Загалоўкі да асобных сцэн для будучага фільма могуць прыдумаць самі вучні або выкарыстаць для гэтага цытату з твора. Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка вызначаюць парадак змены кадраў, прадумваюць іх гукавое афармленне.

***Інсцэніраванне*** – распрацоўка сцэнарыя і пастаноўка п’есы паводле апавядання, урыўка з аповесці або рамана. Прымяняецца ў старэйшых класах. Тэкст не павінен быць аб’ёмным, шматпланавым, з вялікаю колькасцю дзеючых асоб. Абавязковым патрабаваннем да тэксту з’яўляецца прысутнасць у ім дынамічнага дзеяння і наяўнасць дыялагічнай мовы. Інсцэніраванне найчасцей прымяняецца ў працэсе аналізу мастацкага твора або на заключным этапе яго вывучэння.

***Мізансцэніраванне*** эфектыўна прымяняецца пры вывучэнні драматычных твораў. Мізансцэна – размяшчэнне акцёраў на сцэне ў той ці іншы момант спектакля. Прыём мізансцэніравання дапамагае раскрыць зрокавы бок п’есы. Пры вывучэнні драматычнага твора праз мізансцэніраванне вучні спрабуюць уявіць месца дзеяння, знешні выгляд персанажаў, іх жэсты, міміку, манеру хадзіць і тым самым глыбей зразумець адметнасць характару кожнага з іх.

❖ **Дэманстрацыя** (Рыс. 5) – наглядны спосаб азнаямлення школьнікаў з якой- небудзь з’явай.




Рыс. 5

Часта на ўроках літаратуры дэманструюцца партрэты пісьменнікаў.Гэта адбываецца не толькі пры вывучэнні біяграфіі мастака слова, але і наўступных занятках, і пры вывучэнні аглядавых тэм. Нярэдка настаўнік звяртаеццада мастацкіх партрэтаў, выкананых вядомымі жывапісцамі, графікамі іскульптарамі.

Магчымасці рэалізацыі метаду дэманстрацыі значна пашырыліся зукараненнем у вучэбны працэс найноўшых тэхнічных сродкаў навучання. Наўроках літаратуры актыўна выкарыстоўваюцца камп’ютарныя прэзентацыі. Здапамогай кам’ютараў дэманструюцца фрагменты кіна- і відэафільмаў, сцэны саспектакляў, відэазапісы з літаратурных вечарын і інш. Шмат каштоўнагаматэрыялу ў наш час настаўнік літаратуры можа адшукаць у сеціве.

## Практычныя метады

Практычныя метады і прыёмы ў выкладанні літаратуры рэалізуюцца праз ***самастойную працу*** вучняў. Метад самастойнай працы рэалізуецца праз наступныя прыёмы: *план, тэзісы, канспект, рэферат, даклад.*

***План*** – адзін з прыёмаў метаду самастойнай працы, з дапамогай якога ў тэксце вылучаюцца самастойныя часткі. План бывае *просты і складаны*. План, кожны пункт якога з’яўляецца вытрымкай з раздзела (часткі) твора называецца *цытатным* планам.

***Тэзісы*** – палажэнні, якія сцісла перадаюць асноўныя думкі лекцыі, даклада, артыкула. Тэзіраванню звычайна папярэднічае складанне плана, кожны пункт якога пасля «расшыфроўваецца» ў выглядзе тэзіса. Гэты прыём выкарыстоўваецца

ў час працы над літаратуразнаўчымі артыкуламі або артыкуламі падручніка, а таксама пры канспектаванні лекцыі настаўніка.

***Рэферат*** – кароткі выклад у пісьмовай або вуснай форме зместу адной ці некалькіх літаратуразнаўчых крыніц па прапанаванай тэме.

***Даклад*** паведамленне, якое ўяўляе сабою разгорнуты выклад на пэўную тэму. Даклад як прыём метаду самастойнай працы выкарыстоўваецца ў старшых класах на розных этапах аналізу твора мастацкай літаратуры і пры вывучэнні аглядавых тэм. У дакладзе вучань не толькі паведамляе, як у рэфераце, змест прачытаных публікацый, але і выказвае свае адносіны да прачытанага, уступае ў палеміку з аўтарамі літаратуразнаўчых крыніц.

➢ **Па характары дзейнасці настаўніка і вучняў (класіфікацыя М. Кудрашова)**:

**Метад творчага чытання** рэалізуецца такімі прыёмамі, як *слова настаўніка, выразнае (мастацкае) чытанне твораў настаўнікам або майстрамі мастацкага слова (у запісе), каменціраванае чытанне настаўнікам, гутарка, накіраваная на выяўленне і паглыбленне першаснага ўспрымання твора, творчыя заданні па асабістых уражаннях, пастаноўка на ўроку вучэбнай праблемы.*

Віды вучэбнай дзейнасці школьнікаў пры метадзе творчага чытання: *класнае і дамашняе чытанне, праслухоўванне чытання твораў майстрамі мастацкага слова, завучванне на памяць, складанне планаў, блізкія да тэксту і сціслыя пераказы, мастацкае расказванне, славеснае маляванне, разгляд ілюстрацый, адказы на пытанні настаўніка і падручніка па ідэйна-мастацкім змесце твора, падрыхтоўка вусных і пісьмовых водгукаў, сачыненні.*

Метад творчага чытання спрыяе навуковаму пазнанню літаратуры на першай ступені, паколькі першай і неабходнай ступенню гэтага пазнання з’яўляецца мастацкае ўспрыманне і эстэтычнае перажыванне, у працэсе якога адбываецца непасрэднае засваенне спецыфікі літаратуры: вобразнасць, адметнасць мовы і г.д.

**Эўрыстычны метад** выкарыстоўваецца на другой ступені ў логіцы пазнаваўчай дзейнасці і накіраваны на паглыбленне першапачатковага ўспрымання твора, на яго аналіз, на выяўленне, асэнсаванне і вырашэнне праблем маральнага, сацыяльнага і мастацкага характару. Найбольш пашыранай формай эўрыстычнага метаду з’яўляецца ***эўрыстычная гутарка***, якая складаецца з сістэмы ўзаемазвязаных пытанняў, кожнае з якіх набліжае вучняў да вырашэння пастаўленай праблемы. Эфектыўна дзейнічаюць метад ***ролевай і дзелавой гульні*** (напрыклад, арганізацыя пастаноўкі п’есы А. Дударава “Князь Вітаўт”), ***метад калектыўнага абмеркавання*** (яго формы: круглы стол, брэйнстормінг (мазгавы штурм) і інш.), метад эўрыстычнага дыялогу (формы: складанне пісьмовых дыялогаў / інтэрв’ю, дапісванне фрагментаў дыялогаў, стварэнне і прамаўленне ўласных дыялогаў, інсцэніроўка дыялагічных тэкстаў і інш.).

Віды дзейнасці вучняў пры эўрыстычным метадзе: *падбор матэрыялу з мастацкага твора або падручніка; пераказ тэксту з элементамі аналізу; складанне плана як прыём аналізу, падбор цытат, аналіз эпізоду, аналіз вобраза літаратурнага героя, параўнальная характарыстыка герояў; складанне плана адказу, даклада, сачынення; канспектыўны выклад вынікаў аналізу твора, параўнальнага аналізу твораў розных аўтараў* і г.д.

**Даследчы метад** – спосаб арганізацыі пошукавай дзейнасці вучняў шляхам пастаноўкі перад імі задач, якія патрабуюць самастойнага творчага вырашэння. Мэта гэтага метаду - падрыхтаваць вучняў да самастойнага вывучэння літаратурных твораў,

сфарміраваць уменні ацэньваць іх ідэйныя і мастацкія вартасці. Выкарыстоўваецца ў старэйшых класах.

Віды дзейнасці вучняў пры даследчым метадзе: *самастойны аналіз усяготвора або яго часткі; супастаўленне двух або некалькіх праграмных твораў;супастаўленне розных поглядаў у літаратурнай крытыцы; супастаўленне твора з яго інтэрпрэтацыяй у тэатры або ў кіно* і інш. Вынікі такой працы могуць быць аформлены ў выглядзе вучнёўскіх дакладаў або сачыненняў.

**Рэпрадуктыўны метад** – спосаб атрымання ведаў вучнямі ў гатовым выглядзе, але не дагматычна, са слоў настаўніка, з падручніка, крытычнагаартыкула і інш.

Прыёмы праяўлення рэпрадуктыўнага метаду: *аповед настаўніка пра жыццё пісьменніка, лекцыя або лекцыя з элементамі гутаркі пра творчы шлях пісьменніка, аглядавая лекцыя з дэманстрацыяй наглядных дапаможнікаў і выкарыстаннем ТСН, пастаноўка перад вучнямі праблемных пытанняў і пошукавых задач, тлумачэнне заданняў па падручніку і вучэбных дапаможніках*.

Віды дзейнасці вучняў пры рэпрадуктыўным метадзе: *запіс плана або канспекта лекцыі настаўніка, складанне плана або канспекта прачытаных артыкулаў падручніка, складанне сінхронных табліц; падрыхтоўка адказаў па матэрыялах лекцыі або падручніка; падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў, сачыненняў*.

Інавацыйныя метады аналізу мастацкага твора:

*Эксплікацыя (тлумачэнне)* – гэта метад, які прымяняецца для пільнага аналізу тэксту альбо ўрыўка з больш буйнога тэксту.

*Метад кагнітыўнай камунікацыі* (ці кагнітыўна - камунікатыўны метад) - адзін са спосабаў актыўнага навучання, які характарызуецца сучаснымі навукоўцамі як найбольш эфектыўны ў частцы ўплыву на ўзровень пазнавальнай цікавасці навучэнцаў. Сучасны этап развіцця методыкі выкладання літаратуры прадугледжвае свядома-камунікатыўны падыход, які яшчэ называюць кагнітыўна-камунікатыўным. Пры прымяненні яго ў адукацыйным працэсе навучанне зносінам спалучаецца са свядомым спазнаннем сістэмы звестак пра літаратуру, развіццём і актывізацыяй пазнавальных здольнасцяў навучэнца.

*Метад літаратурнага пошуку* прадугледжвае развіццё школьнага літаратуразнаўства, пэўных даследчых магчымасцей. Стандартныя метады пошуку ахопліваюць наступныя спосабы выяўлення і знаходжанне неабходных тыпаў публікацый: прагляд манаграфій і падручнікаў; зварот да энцыклапедычных слоўнікаў і даведнікаў; выкарыстанне бібліятэчных каталогаў і паказальнікаў; прагляд перыядычнай літаратуры; прагляд інтэрнэт-крыніц і інш.

## Лекцыя 9. Этапы вывучэння мастацкага твора

**Праблемнае поле:**

- Уступныя заняткі як этап вывучэння мастацкага твора.
- Чытанне твора і арыенціровачныя заняткі.
- Заключны этап вывучэння літаратурнага твора
- Аналіз як этап вывучэння літаратурнага твора.

У аснове школьнага курса ляжыць вывучэнне літаратурнага твора. Гэта працаёмкі працэс, які складаецца з шэрагу этапаў: ***уступныя заняткі, чытанне, вывучэнне чытацкага ўспрымання твора вучнямі, аналіз, заключныя заняткі***.

**Уступныя заняткі** неабходныя амаль заўсёды: яны павінны інтэлектуальна і эмацыянальна падрыхтаваць вучняў да ўспрымання новага твора, абудзіць

цікавасць, стварыць спрыяльную эмацыянальную атмасферу, забяспечыць узаемасувязь вывучаемага твора з раней вядомым, настроіць клас на аналітычную працу.

Класіфікацыя ўступных заняткаў:

– заняткі, якія дапамагаюць вучням зразумець гістарычную эпоху, адлюстраваную ў творы, або эпоху, у якую пісаўся твор;

– заняткі, на якіх вучні даведваюцца пра гісторыю напісання твора;

– заняткі, звязаныя з выкарыстаннем біяграфічнага матэрыялу;

– заняткі, заснаваныя на выкарыстанні жыццёвага вопыту і назіранняў вучняў;

– заняткі, на якіх выкарыстоўваюцца творы сумежных відаў мастацтва.

Выбар формы правядзення ўступных заняткаў залежыць ад спецыфікі літаратурнага твора, агульнага накірунку працы над тэкстам, задач, вылучаных педагогам для вырашэння на ўроку. Улічваюцца ўзроставыя асаблівасці вучняў, склад класа. Уступныя заняткі павінны быць арганічна звязанымі з далейшай працай па вывучэнні твора.

У сучаснай школе найчасцей выкарыстоўваецца ***камбінаваны*** від уступных заняткаў, на якіх вучні вывучаюць біяграфію пісьменніка, знаёмяцца з эпохай, адлюстраванай у творы і гісторыяй яго напісання, разглядаюць рэпрадукцыі карцін, слухаюць выразнае (мастацкае) чытанне ўрыўка з твора.

Асноўным этапам вывучэння мастацкага твора з’яўляецца **чытанне**. Першае чытанне звычайна мае эмацыянальную афарбоўку, яно павінна стварыць адпаведны настрой, зацікавіць вучняў, выклікаць у іх эстэтычнае перажыванне. Першае чытанне ў класе павінна быць чытаннем уголас і абавязкова выразным, нельга падмяняць яго працай над тэхнікай чытання: для гэтага адводзіцца адпаведны час.

Чытанне бывае *вольнае і мэтанакіраванае*. Пры вольным чытанні вучань мае поўную свабоду: прымае або аспрэчвае тое, пра што напісана ў творы, эмацыянальна ўспрымае напісанае. Прысутнасць вольнага чытання абавязковая. Першае чытанне павінна быць вольным. Паўторнае чытанне, як правіла, мэтанакіраванае, яно праходзіць пад кіраўніцтвам настаўніка. Педагог задае вучням апераджальныя пытанні, прапануе выканаць падчас чытання заданні аналітычнага характару, з якіх пачынаецца аналіз твора.

Чытанне можа быць *класным і дамашнім*. У сярэдніх класах перавага аддаецца класнаму чытанню і, як правіла, ўголас. Дамашняе чытанне мае таксама свае перавагі: яно больш асабістае, няма пасрэдніка паміж чытачом і аўтарам, ніхто не аказвае ўплыву на чытача сваёй трактоўкай, сваім чытаннем уголас.

Працягласць бесперапыннага чытання на ўроку для вучняў сярэдняга школьнага ўзросту не павінна перавышаць 25 – 30 хвілін. У старшых класах у сувязі з вывучэннем вялікіх твораў першае чытанне пераважна дамашняе, у класе зачытваюцца асобныя ўрыўкі пры аналізе твора. Значныя па аб’ёму творы ў старшых класах павінны быць прачытаны да пачатку іх вывучэння. Перад летнімі канікуламі варта знаёміць вучняў са спісам праграмных твораў, якія будуць вывучацца ў наступным класе.

Выяўленне ўзроўню першаснага ўспрымання твора вучнямі з’яўляецца абавязковым прамежкавым этапам паміж чытаннем і аналізам. Для гэтага праводзяць ***арыенціровачныя заняткі***, на якіх настаўнік выяўляе, якія эмоцыі выклікаў прачытаны твор, наколькі глыбока вучні зразумелі змест. На занятках карысна задаць пытанні, накіраваныя на выяўленне агульнага ўражання ад твора: *«Якім настроем прасякнуты верш?»; «Якія пачуцці выклікаў прачытаны твор?»; «Які з эпізодаў апавядання вам запомніўся больш і чаму?»* і інш.

Арыенціровачныя заняткі могуць праводзіцца ў форме гутаркі, інтэрв'ю, вусных паведамленняў вучняў, пісьмовага анкетавання, можна выкарыстаць складанне планаў і розныя віды пераказу.

На **заключных занятках** неабходна не толькі паўтарыць і замацаваць вывучанае, пракантраляваць веды вучняў, а найперш асэнсаваць твор нібы спачатку. Да таго ж важна не паўтараць ход аналізу ў сціслым выглядзе. На заключных занятках патрэбны новыя прыёмы разбору, якія б стымулявалі жаданне вучняў і на гэтым этапе атрымаць новыя веды.

У методыцы вылучаюцца наступныя віды заключных заняткаў – ***абагульняльныя, праблемныя і паглыбляючыя***. Асноўныя метады і прыёмы на заключных занятках: *паўторнае чытанне твора, абагульняльная гутарка (дыспут), лекцыя настаўніка, віктарына, літаратурны дыктант, конкурс чытальнікаў, даклады і рэфераты вучняў, супастаўленне мастацкага твора з яго рэальнай асновай, са спектаклем або кінаверсіяй* і інш.

Заключныя заняткі – гэта не паўтарэнне раней вывучанага, а менавіта падвядзенне вынікаў, таму выбар формаў працы павінен быць абгрунтаваны. Вывучэнне лірыкі лагічна завяршыць конкурсам на лепшую дэкламацыю вершаў, драматычнага твора – абмеркаваннем спектакля або лекцыяй пра тэатральнае жыццё п'есы, эпічнага твора – дыспутам, канферэнцыяй, супастаўленнем з іншымі мастацкімі творамі. Пасля вывучэння шматпланавых, шматпраблемных твораў заключныя заняткі можна правесці ў форме семінара і засяродзіць увагу вучняў на асноўных праблемах, узнятых аўтарам.

**Аналіз** – найбольш адказны і складаны этап работы над творам. У аснову школьнага аналізу мастацкага твора пакладзены прынцыпы літаратуразнаўства: навуковасць, гістарызм, адзінства зместу і формы, цэласнасць аналізу, улік родавай і жанравай спецыфікі.

Спецыфічнымі прынцыпамі аналізу літаратурнага твора ў школе з’яўляюцца: выхаваўча-развіццёвая накіраванасць, адзінства рацыянальнага і эмацыянальнага, адзінства навуковай логікі і творчага натхнення, улік ўзроставых асаблівасцей вучняў.

У сучаснай методыцы вылучаюцца наступныя тыпы аналізу: *аглядавы, выбарачна-накіраваны, тэкстуальны, “скрыты”.*

Пры ***аглядавым аналізе*** размова ідзе пра твор увогуле або пра асобныя яго часткі, сістэму вобразаў, але выбранае кола пытанняў разглядаецца ў агульных рысах і без асаблівай увагі на дэталі.

Да такога аналізу настаўнік звяртаецца пры вывучэнні аглядавых тэм (у старшых класах («Шляхі развіцця беларускай літаратуры ў пачатку ХХ стагоддзя»), на ўводных уроках да манаграфічнай тэмы («Жыццёвы і творчы шлях Івана Мележа») і на ўроках пазакласнага чытання.

***Выбарачна-накіраваны аналіз*** прадугледжвае разгляд твора з пункту погляду скразных пытанняў.

***Тэкстуальны аналіз*** мае на мэце падрабязны разгляд тэксту на розных узроўнях, калі з’яўляецца магчымасць пільна прыглядзецца да кожнай мастацкай дэталі. Аб’ектам тэкстуальнага аналізу звычайна з’яўляюцца раздзелы, эпізоды, вобразы і інш.

***«Скрыты» аналіз*** – нетрадыцыйны прыём, пры ім разуменне тэкста адбываецца праз стварэнне да яго малюнкаў або ілюстрацый (у тым ліку вусных), складанне кадрапланаў і кінасцэнарыяў, супастаўленне варыянтаў.

Часцей за ўсё назіраецца ***змешаны, або свабодна-накіраваны, аналіз***, калі настаўнік чаргуе аналітычныя пытанні з гутаркай, дыскусіяй.




Рыс. 6

Практыка паказвае, што ў чыстым выглядзе разгледжаныя шляхі выкарыстоўваюцца рэдка. Настаўнікі-славеснікі часцей звяртаюцца да камбінаванага шляху аналізу, у ходзе якога разглядаюцца і падзеі твора ў іх сюжэтнай паслядоўнасці, і вобразы герояў, і скразныя тэмы ці праблемы.

# МОДУЛЬ 2

## Лекцыя 10. Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы

**Праблемнае поле:**

- Асаблівасці вывучэння лірычных твораў
- Вывучэнне эпічных твораў у школьнай практыцы выкладання літаратуры
- Методыка вывучэння драматургіі на ўроках літаратуры

Лірыка вызначаецца як найбольш складаны, спецыфічны літаратурны род. Ён характарызуецца адметным тыпам пабудовы мастацкага вобраза, які ўяўляе сабою вобраз-перажыванне, у той час як у драме і эпасе ў аснове вобраза ляжыць шматбаковы паказ чалавека ў складаных жыццёвых падзеях. Лірычны твор, як правіла, напісаны вершаванай мовай. Лірычнае маўленне – гэта маўленне з павышанай экспрэсіўнасцю асобных слоў і моўных канструкцый. Вызначальнымі ў лірыцы з'яўляюцца такія паняцці як «лірычны герой» і «лірычная сітуацыя», якія замяняюць паняцці «персанаж» і «сюжэт», характэрныя для эпасу і драмы. *Лірычны герой* – гэта вобраз паэта, носьбіт перажывання ў лірычным творы. Яго нельга атаясамліваць з аўтарам.

**Вывучэнне лірыкі ў V – VIII класах**. Школьнікі вывучаюць асобныя вершы, якія разглядаюцца па-за кантэкстам агульнай творчасці паэта, пры гэтым вобраз аўтара, яго асоба не застаецца па-за ўвагай. У V – VI класах творы згрупаваны ў адпаведныя тэматычныя блокі, сярод якіх значнае месца займае прыродаапісальная лірыка. У час падрыхтоўкі вучняў да ўспрымання пейзажнай лірыкі настаўнікі часта выкарыстоўваюць творы выяўленчага мастацтва і музыкі. Калі лірычны твор звернуты да мінулага, патрэбна ўступная гутарка. Неабходна вярнуцца ў гісторыю, даць гістарычны каментарый, паказаць вучню сучаснае гучанне твора.

Чытанне твора асабліва важнае пры вывучэнні лірыкі. Верш чытаецца цалкам мінімум два разы, да аналізу і пасля яго. Пры неабходнасці чытанню папярэднічае тлумачэнне незразумелых слоў. Школьны аналіз на гэтым этапе складаецца з выяснення самастойных уражанняў аб прачытаным вершы; аднаўлення ў думках вобразаў, створаных аўтарам; выяўлення настрою верша; разумення аўтарскай думкі-пачуцця. Аналіз твора найчасцей вядзецца ў форме гутаркі па загадзя падрыхтаваных пытаннях і заданнях.

**Вывучэнне лірыкі ў IX – XI класах**. Спосаб разбору паэтычнага тэксту ў IX – XI класах у многім залежыць ад характару твора. Найбольш складаныя і важныя ў творчасці паэта вершы (напрыклад, «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...» М. Багдановіча) неабходна разглядаць манаграфічна. Некаторыя творы могуць быць прапанаваны вучням для самастойнага вывучэння.

***Шляхі вывучэння лірычных твораў*** ў старэйшых класах:

- тэматычны (разгляд асноўных тэм, матываў у шэрагу лірычных твораў паэта);
- засваенне лірычных твораў адначасова з біяграфіяй паэта;
- разгляд лірыкі пасля знаёмства вучняў з жыццём і дзейнасцю паэта.

Вывучэнне лірычнай паэзіі, такім чынам, праходзіць праз наступныя этапы:

1) арыенціровачныя заняткі, на якіх вучні знаёмяцца з важнейшымі, характэрнымі асаблівасцямі лірычнай творчасці паэта;

2) вывучэнне асобных, прадугледжаных праграмай, вершаў;

3) заключныя заняткі – высвятленне значэння лірычнай творчасці паэта ў гісторыі развіцця літаратуры, падвядзенне вынікаў.

Пры вывучэнні лірыкі ў старшых класах эфектыўныя наступныя метады і прыёмы: *эўрыстычная гутарка, выкананне індывідуальных дамашніх заданняў з наступным абмеркаваннем іх у класе, падрыхтоўка дакладаў і рэфератаў, параўнанне лірычных твораў розных аўтараў, каменціраванае чытанне, самастойны аналіз вершаў па прапанаваным плане.*

Апрабаванымі ***эфектыўнымі прыёмамі вывучэння лірыкі*** (асабліва ў старэйшых класах) сталі:

- супастаўленне верша і адпаведных дзённікавых матэрыялаў, выяўленне фактаў біяграфіі паэта, якія пакладзены ў аснову твора; знаёмства з гісторыяй яго напісання;
- параўнанне розных варыянтаў аднаго верша; супастаўленне вершаў, напісаных аўтарам у розны час;
- супастаўленне вершаў розных аўтараў на адну і тую ж тэму;
- параўнанне арыгінальнага верша і яго перакладаў на блізкароднасныя мовы;
- складанне хрэстаматыі з твораў паэта, “паэтычнага кодэксу” паэта;
- разгорнутае выказванне паводле афарыстычных радкоў верша;
- параўнанне верша і блізкіх да яго твораў іншых відаў мастацтва (музыка, выяўленчае мастацтва, у тым ліку ілюстрацыі да твора);
- стымуляванне ўласнай вершатворчасці вучняў: дапісванне апошняга радка або страфы, напісанне вершаў на зададзеную тэму па апорных словах ці без іх і інш.

Вопыт школьнага вывучэння літаратуры пастаянна ўзбагачаецца новымі формамі правядзення заключных заняткаў (урокаў) па лірыцы. Можна сустрэць урокі-канцэрты, падрыхтаваныя самімі вучнямі, урокі-віктарыны і ўрокі-конкурсы на лепшага чытальніка і інш. Шырока выкарыстоўваецца чытанне лепшых ўзораў лірыкі майстрамі мастацкага слова, выкананне песень на словы лірычных твораў.

Вывучэнне эпічных твораў адбываецца паралельна з засваеннем агульных прынцыпаў аналізу, авалоданнем тэарэтыка-літаратурнымі паняццямі і гісторыкалітратунымі ведамі. Настаўнік пры вывучэнні літаратуры павінен навучыць не проста пераказваць, а аналізаваць творы.

**Вывучэнне эпічных твораў у V–VIII класах**. Вывучэнне эпічных твораў пачынаецца з V класа, увага канцэнтруецца на тэме, ідэі, сюжэце мастацкага твора, сродках стварэння літаратурнага героя. Пры знаёмстве з ***літаратурнай казкай*** вучні павінны не толькі параўнаць аўтарскую з народнай, але і адчуць асаблівасць таленту канкрэтнага пісьменніка. *Чытанне па ролях, разнастайныя віды пераказу, мастацкае расказванне, выразнае чытанне, гутарка, выбарачнае чытанне, суаднясенне ідэі казкі з прыказкамі* – прыёмы, накіраваныя на глыбокае разуменне твора.

Пры працы над ***апавяданнямі*** паглыбляецца лінгвістычны аналіз: разглядаюцца не толькі сюжэт, тэма, ідэя, але і літаратурны герой, сродкі яго паказу (партрэт, учынкі, маўленне, перажыванні, аўтарская характарыстыка). Па магчымасці твор варта прачытаць у класе, пры немагчымасці павінны гучаць урыўкі з яго, якія падцвярджаюць высновы вучняў. Больш разнастайна эпічныя творы прадстаўлены ў VI класе. Гэта апавяданні гістарычнага і біблейскага зместу, літаратурныя паданні, творы рэалістычныя, байкі.

Вывучэнне ***байкі*** (ліра-эпічнага твора) прадугледжвае абавязковае чытанне яе на ўроку; прычым немэтазгодна, як заўважае В. Ляшук, спяшацца з раскрыццём алегарычнага зместу твора: важна, каб у працэсе аналізу быў асэнсаваны не толькі гістарычны сэнс байкі, але і агульначалавечае значэнне. Да метадаў і прыёмаў аналізу

байкі адносяць *эўрыстычную гутарку, каменціраванае чытанне, вуснае славеснае маляванне, выразнае чытанне вучняў, складанне цытатнага плану твора, праслухоўванне баек у выкананні артыстаў, разглядванне ілюстрацый, падрыхтоўку вучнямі малюнкаў, лепкі* і да т.п.; да чытання ж баек па ролях рэкамендуецца звяртацца на заключных занятках.




Рыс. 7

Пры аналізе апавяданняў можна выбіраць розныя шляхі. Даволі распаўсюджаны – «следам за аўтарам». Варта выкарыстоўваць і павобразны аналіз, пры гэтым улічваць **спосабы стварэння вобразаў персанажаў**:

– аўтарская характарыстыка;
– партрэт героя;
– учынкі, дзеянні героя;
– мова персанажа;
– выказванні іншых герояў пра персанаж;
– апісанні інтэр'еру, навакольля, рэчаў, што належаць персанажу і г.д.

Праграма VII класа разглядае эпічныя творы ў параўнанні з паэтычнымі, паказвае розныя мастацкія магчымасці прозы і паэзіі. У VIII класе паняцці пра эпас паглыбляюцца, больш увагі надаецца вобразу-характару, што дазваляе сканцэнтраваць увагу на спосабах яго раскрыцця, пры гэтым дастаткова поўна разглядзець сюжэт, праблематыку твораў.

**Вывучэнне эпічных твораў у IX–XI класах**. Сістэма ўрокаў, прысвечаных вывучэнню вялікага эпічнага твора, павінна быць скіраваная на развіццё канцэптуальнага разумення месца твора ў літаратуры, уменне параўноўваць асобныя

кампаненты тэксту (часткі, раздзелы, эпізоды; вобразы герояў; асэнсаванне аўтарскай пазіцыі і г.д.). Увага надаецца агульнай характарыстыцы гістарычных абставін, у якіх быў напісаны твор або пра якія напісаны твор; месцу твора ў літаратурнай дзейнасці пісьменніка; звесткам аб першай публікацыі твора, крытычных ацэнках твора (звяртаецца ўвага і на новае прачытанне), месца твора ў гісторыі нацыянальнай і сусветнай літаратуры.

Эпічны твор разглядаецца з улікам:

– тэматыкі, праблематыкі, яго асноўных канфліктаў;

– асаблівасцей сюжэту, кампазіцыі, стылёвай манеры пісьменніка;

– сістэмы персанажаў;

– моўных мастацка-выяўленчых сродкаў;

– ідэйнага зместу твора, мастацка-філасофскай канцэпцыі.

У IX класе ўводзіцца паняцце сусветная культура, абдываецца паглыбленне разумення папярэдне вядомых паняццяў. Асаблівай увагі патрабуе выбар розных шляхоў аналізу: павобразны, кампазіцыйны, праблемна-тэматычны, аглядавы, камбінаваны. Такі шлях аналізу як “следам за аўтарам” не мэтазгодна выкарыстоўваць пры вывучэнні буйных твораў, таму што займае шмат часу, яго можна прымяняць толькі пры разглядзе асобных эпізодаў дзеля тлумачэння сюжэтных ліній. Выніковай мэтай усіх этапаў працы над асобнымі часткамі тэкста павінна стаць выпрацоўка цэласнага ўяўлення пра твор.

У X–XI класах вучні павінны ўдасканальваць свае літаратуразнаўчыя веды і навыкі, выяўляць большую самастойнасць у аналізе твораў.

Вялікія эпічныя творы, урокі па вывучэнні якіх, на думку В.Я. Ляшук, належаць да ліку самых складаных для настаўніка, становяцца своеасаблівым «выпрабаваннем на прафесійнасць». Аднак уменне зацікавіць падлеткаў, паказаць актуальнасць праблем дасць свой плён толькі пры пошуку новых падыходаў да асэнсавання вядомых твораў.

**Драматычныя творы** з’яўляюцца, напэўна, самымі складанымі для вывучэння ў школе. Гэта абумоўлена перш за ўсё іх сцэнічным прызначэннем, спецыфікай драмы як літаратурнага роду. Драма (ад грэч. drama – дзеянне) – род літаратуры, у аснове якога – паказ напружанага, скразнога дзеяння, вырашэнне канфліктанай сітуацыі. У творах адлюстроўваюцца вострыя супярэчнасці жыцця, не бачна аўтара, які свае пачуцці, думкі перадавярае дзеючым асобам. Характары герояў выяўляюцца праз маўленне і ўчынкі, таму неабходна звярнуць увагу вучняў на маналогі, дыялогі, рэмаркі.

Упершыню школьнікі звяртаюцца да драматычных твораў у VIII класе, калі для вывучэння твораў складаецца сістэма ўрокаў. На гэтым этапе знаёмства варта даць кароткія гістарычныя звесткі пра асноўныя драматычныя жанры : камедыю, трагедыю, драму. Аналізаваць драматычны твор можна рознымі шляхамі: *“следам за аўтарам”, павобразным, праблемна-тэматычным, камбінаваным.*

Пры разглядзе драматычных твораў варта акцэнтаваць увагу на тыпажах герояў, што дазволіць узняцца пры аналізе да абагульненняў, вывесці агульначалавечыя тэмы.

Адным з плённых прыёмаў работы з’яўляецца *каменціраванае чытанне*, якое дапаможа зразумець ідэйны змест, асаблівасці падачы матэрыялу. *Выбарачны пераказ, пераказ ад імя аднаго з персанажаў* дасць магчымасць зразумець настаўніку адносіны вучняў да твора. *Праблемная дыскусія* дапаможа высветліць праблемы, узнятыя ў творы. Выключнае месца займае *чытанне па ролях і інсцэніраванне*. Для актывізацыі вучнёўскіх уяўленняў можна выкарыстаць *распрацоўку мізансцэн*, *стварэнне афішы* да спектакля.

Падагульненнем працы над драматычнымі творамі з’яўляецца прагляд спектакляў і абмеркаванне ўражанняў ад п’есы.

## Лекцыя 11–12. Урок літаратуры ў сучаснай школе

**Праблемнае поле:**

- Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры.
- Класіфікацыі ўрокаў літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
- Традыцыйная структура ўрока.
- Традыцыйныя і нетрадыцыйныя ўрокі як метадычная праблема. Віды нетрадыцыйных урокаў.

Урок – асноўная форма арганізацыі адукацыйнага працэсу, якая ўзнікла ў XVII стагоддзі пасля ўвядзення класна-ўрочнай сістэмы чэшскім педагогам Янам Амосам Каменскім. Урок можна назваць калектыўнай формай навучання, якой уласцівыя пастаянны састаў навучэнцаў, устойлівыя часавыя рамкі (45 хвілін). Урок праводзіцца ў адпаведнасці з загадзя састаўленым раскладам і арганізацыяй вучэбнай працы па адзінай праграме. Для ўрока ставяцца арганізацыйныя, гігіенічныя, дыдактычныя, метадычныя і літаратуразнаўчыя патрабаванні.

***Арганізацыйныя патрабаванні***: наяўнасць раскладу, праграмы, падручнікаў, памяшкання.

***Гігіенічныя патрабаванні***: тэмпературны рэжым; фізіка-хімічныя ўласцівасці паветра (неабходнасць праветрывання); асвятленне; чаргаванне відаў дзейнасці (змена слухання выкананнем прац); своечасовае правядзенне фізкультхвілінак; прытрымліванне правільнай працоўнай паставы вучня; адпаведнасць класнай мэблі росту навучэнца.

***Дыдактычныя патрабаванні***: выразнае фармуляванне адукацыйных задач і іх састаўных элементаў; вызначэнне месца ўрока ў агульнай сістэме заняткаў; яго аптымальнага зместу; прагназаванне ўзроўню засваення вучнямі навуковых ведаў, сфарміраванасці ўменняў і навыкаў; выбар найбольш рацыянальных метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання, стымулявання і кантролю; стварэнне ўмоў паспяховага навучання школьнікаў.

***Метадычныя патрабаванні***: выкарыстанне не толькі агульнадыдактычных, але і спецыфічных прынцыпаў, метадаў і прыёмаў выкладання прадмета; урок павінен быць эмацыянальным, выклікаць цікавасць да вучэння; тэмп і рытм урока павінны быць аптымальнымі, павінна дамінаваць атмасфера добразычлівасці і актыўнай творчай працы.

***Літаратуразнаўчыя патрабаванні***: урок павінен уключаць веды па адпаведнай навуцы – літаратуразнаўстве: тэорыю і гісторыю літаратуры; настаўнік павінен прытрымлівацца правіл літаратуразнаўчага аналізу; веды па літаратуры павінны быць навуковымі, а таксама ўтрымліваць індывідуальны падыход да ацэнкі літаратурных з’яў.

**Сучасны ўрок беларускай літаратуры павінен**:

- быць цэласным (мець сваю канцэпцыю);
- мець сувязь з папярэднімі і наступнымі заняткамі;
- уключаць метады і прыёмы, мець эмацыянальны фон, якія адпавядаюць прыродзе, характару вывучаемага матэрыялу;
- працэс засваення павінен рухацца ад простага да складанага;
- арганічна спалучаць дзейнасць настаўніка і навучэнцаў;
- быць эмацыянальным, цікавым, насычаным адукацыйным матэрыялам.

**Традыцыйная структура ўрока**




Рыс. 8

Да любога ўрока літаратуры ставіцца трыадзіная мэта – спалучэнне *адукацыйных, развіццёвых і выхаваўчых* задач. У практыцы сучасных настаўнікаў папулярна паведамленне толькі тэмы ўрока, а мэты і задачы настаўнік фармулюе разам з класам. На этапе рэфлексіі звяртаецца ўвага вучняў на іх дасягненне.

Можна карыстацца наступнымі парадамі пры фармулёўцы **мэт урока**:

*адукацыйныя мэты і задачы*: спрыяць знаёмству вучняў з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка; садзейнічаць вызначэнню месца і ролі пісьменніка у нацыянальнай літаратуры; стварыць умовы для засваення вучнямі асаблівасцей эпохі (напрамку і г.д.); даць характарыстыку героям твора; паказаць узаемаадносіны....; прааналізаваць змест паэмы (апавядання, аповесці, верша); адметнасці кампазіцыі (сюжэта, вобразных сродкаў і г.д.); праз мастацкі аналіз даследаваць асноўную праблему твора; спрыяць засваенню паняцця (тэорыя літаратуры); дапамагчы раскрыць грамадзянскі (патрыятычны) пафас твора, яго ідэйна-тэматычны змест; дапамагчы вучням спасцігнуць свет паэтычнага слова; раскрыць шматаспектнасць творчасці …; раскрыць погляд пісьменніка на (тэма, праблема і г.д.); праверыць, як вучні засвоілі матэрыял па тэме; абагуліць і сістэматызаваць веды вучняў і г.д.;

*развіццёвыя мэты і задачы*: развіваць вуснае (звязнае, пісьмовае, лагічнага тыпу маўленне); развіваць уменні лагічна выказваць свае думкі; развіваць навыкі выразнага чытання, эмацыянальнасць; развіваць уменні аналізу мастацкага твора як мастацкага цэлага; развіваць уменне вызначаць мастацкую ролю тропаў; развіваць уменне вызначаць і аналізаваць тэму і ідэю твора (праблему, асноўную думку і г.д.), развіваць уменне ўспрымаць матэрыял лекцыі, пісаць план, тэзісы, канспект, сачыненні,

рыхтаваць даклады і рэфераты (самастойна працаваць з раздзелам падручніка); развіваць уменне рабіць параўнальную характарыстыку вобразаў герояў (дзеючых асоб); развіваць лагічнае (абстрактнае, крытычнае, вобразнае) мысленне вучняў; выпрацоўваць даследчыя (камунікатыўныя, творчыя) здольнасці; развіваць фантазію;

*выхаваўчыя мэты і задачы*: выхоўваць дабрыню і спагаду; выхоўваць назіральнасць; праз аналіз твора паўплываць на фарміраванне ўнутранага свету вучняў, іх эмацыянальнага вопыту; выхоўваць цікавасць да разумення і асэнсавання вечных праблем; выхоўваць патрыятычныя пачуцці; выхоўваць любоў да роднага слова (Радзімы, мовы, літаратуры, культуры, гісторыі, спадчыны, мінуўшчыны); выхоўваць высокія маральныя якасці; выхоўваць экалагічную (грамадзянскую, эстэтычную, мастацкую) культуру вучняў; выхоўваць мастацкі густ (любоў да кніг, жаданне іх чытаць).

Наступны этап урока – паўтарэнне ці актуалізацыя апорных ведаў, праверка дамашняга задання, які займае ад 5 хвілін да паловы ўрока.

Асноўны этап ўрока – вывучэнне новага матэрыялу, адбываецца падчас чытання, знаёмства з паняццямі па гісторыі і тэорыі літаратуры.

Замацаванне новага матэрыялу адбываецца пры дапамозе аналізу і пераказу твораў.

Абагульненне вывучанага найчасцей адбываецца ў форме заключнага слова настаўніка, якое падводзіць вучняў да больш абагуленых высноў і назіранняў.

Дамашняе заданне абавязкова запісваецца настаўнікам на дошцы і каменціруецца. У агульнаадукацыйных установах дамашнія заданні павінны задавацца вучням з улікам магчымасці іх выканання: у V–VI класах – да 2 гадзін, VII–VIII класах – 2,5 гадзіны, IX–XI класах – 3 гадзіны.

У метадычнай літаратуры сустракаюцца розныя класіфікацыі тыпаў урокаў па літаратуры. На рыс. 9 прадстаўлена **традыцыйная сучасная тыпалогія ўрокаў**.




у залежнасці ад месца ў сістэме работы па вывучэнні мастацкага твора
(Васіль Галубкоў)
уступныя заняткі;
чытанне і арыенціровачныя заняткі;
урокі аналізу;
заключныя ўрокі;
урокі пазакласнага чытання
у залежнасці ад зместу прадмета
(Мікалай Кудрашоў)
урокі вывучэння мастцкіх твораў;
урокі вывучэння гісторыі і тэорыі літаратуры;
урокі развіцця маўлення
у залежнасці ад роду і жанру твора
урокі вывучэння лірычных твораў;
урокі вывучэння эпасу;
урокі вывучэння драматычных твораў;
урокі вывучэння фальклору
па форме
пазакласнай працы
урок-экскурсія;
урок-спаборніцтва;
урок-гульня;
урок-канцэрт;
урок-літаратурна-музычная кампазіцыя;
урок-спектакль;
урок-віктарына і інш.
формы нетрадыцыйных урокаў
урок-суд
урок-прэс-канферэнцыя
урок-інтэрв'ю
урок-літаратурная гасцёўня
урок-памяць

Рыс. 9

**Нетрадыцыйныя формы ўрокаў** – адна з праблем сучаснай адукацыі. Вылучаюць тры напрамкі пошукаў нетрадыцыйных форм урока:

- у вучэбныя заняткі ўносяцца формы з пазакласнай дзейнасці (урок-КвіЗ і інш.);
- укараняюцца формы заняткаў з вышэйшай школы (семінары, практыкумы, канферэнцыі, залікі і інш.);
- мадыфікуюцца наяўныя формы (бінарны ўрок, урок-творчая справаздача, брэйнстормінг (мазгавы штурм, мазгавая атака), інтэграваны ўрок і інш.).
- Інтэграваны ўрок – урок, у ходзе якога рэалізуецца ўзаемасувязь сумежных вучэбных дысцыплін, у выніку чаго адбываецца ўзаемадапаўненне ведаў па розных вучэбных прадметах.

**Тыпы інтэграваных урокаў літаратуры** (паводле Наталлі Бяловай):

- Інтэграваны ўрок на ўзроўні міжпрадметных сувязей;
- Інтэграваны ўрок развіцця маўлення на аснове працы з мастацкім тэкстам (назіранне над моўнымі сродкамі, вызначэнне іх стылістычнай ролі, стварэнне навучэнцамі ўласных тэкстаў – пераказаў і сачыненняў);
- Урок славеснасці (у цэнтры ўвагі – вывучэнне стылю пісьменніка).

Згодна з прынцыпам “навучанне мастацтву ў формах самога мастацтва” вызначальнымі арганізацыйнымі формамі нестандартнага ўрока з’яўляюцца: урокі творчасці, урокі-майстэрні, урокі з элементамі інсцэніравання, урокі-“паэтычныя хвілінкі”, урокі-канцэрты, урокі-верінсажы і інш.

Інавацыйны патэнцыял адукацыі звязаны з тэрмінам “**змешанае навучанне**”. Гэта сучасная адукацыйная тэхналогія, якая аб’ядноўвае элементы класна-урочнай сістэмы, электроннага навучання і дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій. Папулярная форма змешанага навучання – “**перавернутае навучанне**”. Змешанае навучанее прадугледжвае замяшчэнне часткі традыцыйных вучэбных заняткаў рознымі відамі інтэрактыўнага ўзаемадзеяння ў гібкім і даступным электронным мабільным асяроддзі. Такое навучанне адпавядае запатрабаванням часу, стымулюе новае пакаленне навучэнцаў да самаадукацыі, павышае яго матывацыю і творчую актыўнасць.

У адукацыйнай практыцы выкарыстоўваецца дыстанцыйнае навучанне з прымяненнем электроннай пошты, настаўніцкіх сайтаў (гл. сайты настаўнікаў на www. acenka.by) і блогаў. Відавочна, што пастунова знікае мяжа паміж вочным, завочным, дастанцыйным, электронным і мабільным навучаннем. Адукацыйныя практыкі ўсё больш будуць развівацца з улікам парадыгмы “навучання без межаў”.

## Лекцыя 13. Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм

**Праблемнае поле:**

- Гістарызм у выкладанні літаратуры на розных этапах курса. Значэнне і месца гісторыка-літаратурных ведаў на ўроках літаратуры ў V-IX класах.
- Спецыфіка сістэматычнага курса літаратуры на заключным этапе літаратурнай адукацыі.
- Задачы і спецыфіка вывучэння аглядавых і манаграфічных тэм. Задачы вывучэння аглядных тэм і іх роля ў літаратурнай адукацыі школьнікаў. Тыпы аглядавых тэм. Змест і структура.

У якасці асноўнага прынцыпу структуравання літаратурных курсаў у IX–XI вылучаюць *гісторыка-храналагічны* прынцып, які спрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу.

**Аглядавыя тэмы** ўтрымліваюць характарыстыку літаратурна-мастацкіх эпох (Сярэднявечча, Адраджэння, Асветніцтва, барока і г.д.) або перыядаў развіцця літаратуры ў межах той ці іншай эпохі. Тут акрэсліваюцца асноўныя тэндэнцыі агульнакультурнага і літаратурнага развіцця, падаюцца звесткі пра пісьменнікаў, у творчасці якіх знайшлі ўвасабленне актуальныя для разглядаемага перыяду асаблівасці, а таксама пазначаюцца найбольш значныя творы (магчыма прыводзіць іх кароткі аналіз).

Пры падачы матэрыялу варта прытрымлівацца **алгарытму**:

- называецца эпоха, яе часавыя межы;
- даецца агульная характарыстыкаграмадска-палітычнага жыцця;
- раскрываецца адметнасць культуры дадзенай эпохі (тэатр, музыка, жывапіс і інш.);
- характарызуецца літаратурны працэс (літаратурныя школы, кірункі, стылі, найбольш значныя імёны, творы);
- разгяладецца творчасць асобных пісьменнікаў.

Разнавіднасці аглядавых тэм:

1. Аглядавыя тэмы, якія папярэднічаюць курсу літаратуры (раздзелу) – "Беларуская літаратура перыяду 1960-1985 гг.";
2. Аглядавыя тэмы, якія завяршаюць вывучэнне пэўнага перыяду – "Беларуская літаратура на сучасным этапе";
3. Аглядавыя тэмы, якія папярэднічаюць вывучэнню творчасці пэўнага пісьменніка.

Асноўны **метад вывучэння** аглядавых тэм – лекцыя настаўніка. Карысна ўулючаць паведамленні вучняў, чытанне вершаў, урыўкаў прозы, дзённікавыя матэрыялы, успаміны. Пры магчымасці дабаўляецца краязнаўчы матэрыял. Шырока практыкуюцца выступленні вучнаяў з дакладамі, рэфератамі, справаздачы груп па выкананні апераджальных заданняў.

**Манаграфічныя тэмы** ў курсе беларускай літаратуры вывучаюцца на заключнай ступені літаратурнай адукацыі. Іх змест закліка,ны канкрэтызаваць уяўленні вучняў пра агульныя заканамернасці і тэндэнцыі развіцця літаратурнага працэсу на прыкладзе жыцця і творчасці аднаго пісьменніка.

**Структура манаграфічнай тэмы**:

- біяграфія пісьменніка;
- творы, рэкамендаваныя праграмай для тэкстуальнага вывучэння і дадатковага чытання;
- звесткі па тэорыі літаратуры, а таксама літаратуразнаўчыя крытычныя артыкулы.

**Шляхі вывучэння манаграфічнай тэмы**:

- паслядоўны (на першым уроку вывучаецца біяграфія, на наступных – творчасць);
- паралельны (паэтапнае вывучэнне жыцця і творчасці).

**Метадычныя формы**: урок-семінар, урок-канферэнцыя, урок-лекцыя (з элементамі гутаркі, дыспуту, абмеркаваннем дакладаў, паведамленнямі вучняў і інш.).

Вывучэнне манаграфічнай тэмы варта завяршыць падагульняючым урокам. Сістэматызацыі ведаў спрыяюць творчыя заданні (напісанне сачыненняў, эсэ, рэцэнзій, прадмоў да твораў і інш.).

## Лекцыя 14. Вывучэнне літаратурна-крытычных артыкулаў. Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні

**Праблемнае поле:**

- Літаратурна-крытычныя артыкулы ў гісторыка-літаратурным аспекце.
- Этапы вывучэння літаратурна-крытычных артыкулаў. Прыёмы работы над літаратурна-крытычным артыкулам ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
- Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні. Сістэмна-функцыянальны падыход да вывучэння тэорыі літаратуры ў школе. Паслядоўнасць фарміравання тэорыка-літаратурных паняццяў.

Артыкулам літаратурна-крытычнага зместу належыць важная роля ў змесце і структуры кожнай тэмы падручнікаў.

Формы працы над крытычнымі артыкуламі залежаць ад спецыфікі матэрыялу, змешчанага ў падручніках, і ад узроставых асаблівасцей вучняў.

У V-VI класах змест такіх артыкулаў звычайна складаюць ацэнкі тых ці іншых твораў, трапныя характарыстыкі майстэрства іх аўтараў іншымі пісьменнікамі ці крытыкамі. Дадзены матэрыял абавязкова зачытваецца і абмяркоўваецца. Можна даваць вучням заданне адшукаць у артыкулах змястоўныя выказванні пра твор, які вывучаецца, і выкарыстаць іх у сваіх адказах.

У VII-IX класах падручнікі хрэстаматыйнага тыпу, але ў іх пададзены грунтоўныя артыкулы літаратуразнаўчага зместу. Задача настаўніка — праз чытанне, абмеркаванне, каменціраванне, самастойныя назіранні, канспектаванне дапамагчы вучням убачыць сувязь артыкула з мастацкімі творамі і мэтанакіравана выкарыстаць яго пры аналізе тэкстаў, раскрыць творчую індывідуальнасць пісьменніка, паглыбіць веды па тэорыі літаратуры. Настаўнік павінен даць узоры творчага выкарыстання артыкулаў у разгорнутых адказах на пытанні, пры выкананні пісьмовых прац.

У старэйшых класах вучні знаёмяцца з самім паняццем “**літаратурная крытыка**”. Артыкулы навукова-метадалагічнага кшталту (напрыклад, К. Крапіва “Канфлікт — аснова п’есы”) неабходна падрабязна аналізаваць на ўроках. Аглядавыя артыкулы неабходна канспектаваць. Вучням варта даваць заданні складаць на аснове літаратуразнаўчага матэрыялу табліцы, схемы, апоры. Настаўнік павінен нацэльваць вучняў звяртацца не толькі да артыкулаў, пададзеных у падручніках, але і да тых, якія змешчаны ў зборніках і літаратурных часопісах.




Сучасная літаратурная адукацыя павінна выхаваць крытычна-развітага чытача. Менавіта таму школьная праграма па беларускай літаратуры акрэслівае тэарэтычна-літаратурныя веды ў якасці аднаго са значных элементаў навучання мастацкай славеснасці. Ідэя неабходнасці навучання школьнікаў тэорыі літаратуры належыць М. Лазаруку.

Школьны аналіз мастацкага твора павінен абапірацца на сістэмнае засваенне тэарэтыка-літаратурных паняццяў. Іх фарміраванне адбываецца паэтапна: ад узнікнення першапачатковых уяўленняў да ўдакладнення паняцця, уключэння яго ў адпаведную сістэму, суаднясенне з новым матэрыялам.

У IX, X-XI класах актывізуюцца тэарэтыка-літаратурныя веды па розных кірунках тэорыі літаратуры (літаратурны працэс, сувязь літаратуры з грамадскім жыццём. Літаратурныя напрамкі і стылі, развіццё жанраў, традыцыі і наватарства, нацыянальная своеасаблівасць беларускай літаратуры, літаратура і культура і інш.). Вучні павінны засвоіць пачатковыя паняцці стылю пісьменніка, творчага метаду і інш (рыс. 10).




Рыс. 10

Зарыентаванасць праграм на вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай пашырае ўяўленні пра шляхі развіцця літаратуры, узмацняе культуралагічны характар навучання прадмету. Школьнікі павінны мець уяўленне пра своеасаблівасць развіцця нацыянальнай літаратуры ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя на фоне сусветнага літаратурнага працэсу.

Канцэптуальнасць навучання беларускай літаратуры забяспечваецца гісторыка-літаратурным падыходам, што дае магчымасць прасачыць дынаміку асноўных эпох нацыянальнага і сусветнага мастацтва. Асновы падобнага падыходу закладваліся на папярэднім этапе, пачынаючы з IX класа, пашыраючца набытыя веды, узрастае роля тэарэтычнага кампаненту ў іх паглыбленні. У X і XI паглыбляецца разуменне паняццяў, якія звязаны з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацкага слова. Варта адзначыць, што канцэпцыя сучаснай літаратурнай адукацыі дае настаўнікам магчымасць дыферэнцыраваць тэарэтычны матэрыял у залежнасці ад узроўню падрыхтоўкі класа.

## Лекцыя 15. Развіццё маўлення вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі

**Праблемнае поле:**

- Развіццё маўлення як сацыяльная і метадычная задача.
- Асноўныя прынцыпы работы па развіцці маўлення.
- Накірункі работы: узбагачэнне, удасканаленне, актывізацыя слоўнікавага запасу.
- Крытэрыі маўленчага развіцця вучняў.

Вывучэнне мастацкіх твораў спрыяе развіццю вуснага і пісьмовага маўлення вучняў. Развіццё маўлення заснавана на трох падыходах: *псіхалінгвістычным, лінгвадыдактычным, методыка-літаратурным.*

**Прынцыпы работы** па ўзбагачэнні маўлення вучняў: жыццёвыя і літаратурныя ўражанні, сістэматычны характар заняткаў па развіцці маўлення, творчая накіраванасць заданняў і практыкаванняў па ўзбагачэнні маўлення.

**Напрамкі работы**: узбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў, удасканаленне звязнага маўлення, работа над логікай і выразнасцю выказванняў, актывізацыя міжпрадметных узаемасувязей у аспекце маўленчай дзейнасці, улік узроставай паслядоўнасці ў аваладанні вучнямі сродкамі моўнай выразнасці праз сістэму спецыяльных заданняў.

**Крытэрыі маўленчага развіцця вучняў**:

- валоданне актыўнай лексікай, нормамі літаратурнай мовы, навуковай тэрміналогіяй, сродкамі мастацкай выразнасці;
- разуменне асаблівасцей віду і жанру выказвання;
- змястоўнасць, лагічнасць, стройнасць кампазіцыі выказвання;
- валоданне прыёмамі зносін са слухачамі падчас выступлення;
- вядзенне дыялогу на літаратурныя тэмы;
- самастойнасць у падрыхтоўцы выступлення;
- валоданне асаблівасцямі моўнага стылю ў адпаведнасці з жанрам выказвання і моўнай сітуацыяй.

Вуснае маўленне школьнікаў развіваецца праз:

- **слуханне** – гэта ўзорнае слова настаўніка, лекцыя, абмеркаванне вусных паведамленняў аднакласнікаў;
- **чытанне** – гэта чытанне тэкстаў літаратурных твораў, крытычных і іншых матэрыялаў, выразнае чытанне;
- **назіранне** – праца над мовай твора, лінгвістычны аналіз;
- **выступленне** – расказванне, пераказы, адказы на пытанні, разгорнутыя маналагічныя выказванні, выступленні з рэфератамі і дакладамі.

Дзейсным сродкам развіцця вуснай мовы школьнікаў з’яўляецца павучанне іх ***выразнаму чытанню мастацкіх твораў***. Актыўна практыкуецца самастойнае дамашняе чытанне вучняў. Яно стымулюецца абменам ўражанняў на ўроку пасля дамашняга прачытання і аналізам твора па прапанаваных у падручніку пытаннях і заданнях.

Партытура выразана чытання прадугледжвае выкарыстанне наступных умоўных абазначэнняў:

1. Асноўны націск _______ (слова падкрэсліваецца адной гарызантальнай рыскай).
2. Апорны націск ---------- (слова падкрэсліваецца пунцірам).
3. Кароткая паўза ⊥ (перпендыкуляр).
4. Паўза першай даўжыні | (адна вертыкальная рыска).
5. Паўза другой даўжыні | | (дзве вертыкальныя рыскі).
6. Псіхалагічная паўза V (лацінская літара V).
7. Верхняя мадуляцыя – павышэнне голасу ↗(стрэлка ўверх).
8. Ніжняя мадуляцыя – паніжэнне голасу ↘(стрэлка ўніз).

Важным сродкам узбагачэння памяці, развіцця маўлення і пашырэння слоўнікавага запасу з’яўляецца ***завучванне мастацкіх тэкстаў па памяць***.

Адно з асноўных месцаў у маўленчым развіцці вучняў займае **сачыненне** – пісьмовая або вусная работа творчага характару. Вучэбная праграма па беларускай літаратуры найбольшую ўвагу звяртае на навучанне сачыненням на літаратурныя тэмы і сачыненням на вольныя тэмы, заснаваныя на асабістых уражаннях, жыццёвых назіраннях, чытацкім вопыце (Рыс. 11).

Па мэтах навучання школьныя сачыненні бываюць навучальныя і кантрольныя, па месцу выканання – класныя і дамашнія.




Рыс. 11

Методыка работы над сачыненнем прадугледжвае сем этапаў:
1. Асэнсаванне тэмы і яе межаў.
2. Фармуляванне асноўнай думкі.
3. Адбор матэрыялу для сачынення.

4. Сістэматызацыя сабранага матэрыялу.
5. Работа над кампазіцыйнай будовай сачынення.
6. Выбар стылю і тыпу мовы.
7. Рэдагаванне тэксту сачынення (стылістычная папраўка напісанага).

**Кампазіцыя сачынення** трохчасткавая: уступ (1/6 частка ўсяго сачынення, або 1/4 галоўнай часткі) – прадмова, падрыхтоўка да ўспрыняцця разважання вучня; асноўная частка – сістэма тэзісаў і аргументаў, разважанне; заключэнне – вывады з напісанага, абагульненне назіранняў.

Асноўнымі **крытэрыямі ацэнкі** якасці пісьмовых работ па літаратуры выступаюць наступныя:

– змястоўнасць, глыбіня пісьмовага выказвання як адлюстраванне якасці ўспрымання і разумення мастацкага твора;

– сфарміраванасць аналітычных і маўленчых уменняў;

– самастойнасць маральна-псіхалагічных ацэнак падзей і характараў;

– дакладнасць стылю, моўная кампетэнцыя.

***Праверка сачыненняў***. У сачыненнях, водгуках, творчых работах настаўнік выпраўляе не толькі арфаграфічныя, пунктуацыйныя памылкі, але і моўныя, а таксама памылкі ў змесце. Няправільна напісаную літару або пунктуацыйны знак настаўнік закрэслівае, падкрэслівае, надпісвае правільны варыянт і адзначае на палях наступнымі ўмоўнымі знакамі: I – арфаграфічная; V – пунктуацыйная; Г – граматычная; З – памылка ў змесце; М – моўная; а – аднатыпныя; н – нягрубыя: I(н), V (а); частку слова, сказ – закрэслівае тонкай гарызантальнай лініяй; лічбы, літару – закрэслівае наўскос.

У навучальных і кантрольных работах памылкі ў змесце і моўныя памылкі падкрэслівае ў тэксце хвалістай лініяй і адзначае ўмоўнымі знакамі на палях. Памылкі на правілы, якія яшчэ не вывучаліся, настаўнік падкрэслівае, выпраўляе, але на палях не адзначае.

Пры праверцы водгукаў, сачыненняў, творчых работ на наступным радку пасля тэксту дробам запісвае колькасць памылак у змесце і колькасць моўных недахопаў (лічнік), а ў назоўніку дробу ўказвае колькасць арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак і выстаўляе дзве адзнакі (Табл. 1):

$$\frac{\text{З – М}}{\text{I – V – Г}} \qquad \frac{2\text{-}2}{2\text{-}2\text{-}1} \qquad 6/5$$

*Табліца 1*

**Ацэнка навучальных пісьмовых работ**

| бал | змест | пісьменнасць |
|---|---|---|
| 1 | Напісанае не ўяўляе тэкст | Больш, чым на 2 балы |
| 2 | Тэкст фрагментарны, не адпавядае тэме | 9/0, 8/1, 7/2, 7/3, 6/4, 5/5, 4/6, 3/7 |
| 3 | Тэкст фрагментарны, часткова адпавядае тэме, парушана логіка і паслядоўнасць выкладу | 8/0, 7/1, 6/2, 6/3, 5/4, 4/5, 3/6, 2/7 |
| 4 | Частковая адпаведнасць тэме і галоўнай думцы, выклад непаслядоўны | 6/1, 5/2, 5/3, 4/4, 3/5, 7/0, 2/6 |
| 5 | Частковая адпаведнасць тэме і галоўнай думцы, выклад у асноўным паслядоўны, лагічны (3-4 памылкі ў перадачы зместу) | 5/1, 4/2, 4/3, 3/4, 2/5, 6/0, 1/6 |
| 6 | Частковая адпаведнасць тэме і галоўнай думцы, выклад у асноўным паслядоўны, лагічны (1-2 памылкі ў перадачы зместу) | 4/1, 3/2, 3/3, 2/4, 5/0, 1/5, 0/6 |

| | | |
|---|---|---|
| 7 | Адпаведнасць тэме і галоўнай думцы, выклад у асноўным паслядоўны, лагічны (3-4 памылкі ў перадачы зместу) | 3/1, 2/2, 2/3, 4/0, 0/5, 1/4 |
| 8 | Адпаведнасць тэме і галоўнай думцы, выклад у асноўным паслядоўны, лагічны (1-2 памылкі ў перадачы зместу) | 2/1, 1/2, 1/3, 3/0, 0/4 |
| 9 | Адпаведнасць тэме і галоўнай думцы, выклад паслядоўны, лагічны (1 памылка ў перадачы зместу) | 1/0, 1/1, 2/0, 0/1, 0/2, 0/3 |
| 10 | Адпаведнасць тэме і галоўнай думцы, выклад паслядоўны, лагічны | 0/0, 1 нягрубая |

У школьнай практыцы выкарыстоўваецца наступная ***паслядоўнасць аналізу сачыненняў***:

- даецца агульная характарыстыка вучнёўскіх работ;
- называюцца статыстычныя дадзеныя (па балах);
- чытаюцца лепшыя сачыненні ці ўрыўкі з іх;
- настаўнік адказвае на пытанні вучняў;
- калектыўна выпраўляюцца тыповыя памылкі;
- індывідуальна выпраўляюцца асобныя (уласныя) памылкі.

Методыку работы над сачыненнем можна разглядаць як прапедэўтычны этап навучання **водгуку** на мастацкі твор.

Водгук на мастацкі твор – найскладанейшы від маўленчай дзейнасці. Мэта водгуку – выявіць адносіны да прачытанага твора, даць уласную ацэнку таму, пра што ў ім расказваецца. Водгук уключае прыметы рэцэнзіі, сачынення-разважання, эсэ.

***Жанравыя асаблівасці водгуку***:

- Ацэначны складнік. Ацэначнасць уключае ў сябе эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць, усе віды стылістычнай афарбоўкі;
- Ацэначнае выказванне складаецца з інфармацыйнага элемента і ўласна ацэнкі: першы можа быць прадстаўлены апісаннем ці апавяданнем, другі – разважаннем;
- Ацэнка, сфармуляваная ў пачатку водгуку ў выглядзе тэзісаў, аргументуецца ў асноўнай частцы.

Навучанне методыцы падрыхтоўкі водгуку мэтазгодна пачаць з размежавання жанравых формаў (водгуку і рэцэнзіі) (Табл. 2).

*Табліца 2*

**Водгук і рэцэнзія: параўнальны аналіз**

| **крытэрый** | **водгук** | **рэцэнзія** |
|---|---|---|
| жанравыя прыметы | Разгорнутае асабістае выказванне пра мастацкі (публіцыстычны) твор | Разгорнутая характарыстыка-ацэнка мастацкага (публіцыстычнага) твора |
| аднесенасць да жанру | Публіцыстыка, эмацыянальна-ацэначны тып тэксту | Жанр крытыкі, ацэначна-крытычны тып тэксту |
| мэта | Перадаць уражанне ад твора, даць аргументаванае тлумачэнне і ацэнку ідэйна-мастацкіх адметнасцей твора | Тое, што і ў водгуку |
| асаблівасці падыходу | Аўтар дэманструе ўласнае інтэлектуальна-эмацыянальнае | Пераважае не эмацыянальна-суб’ектыўная, а аб’ектыўная ацэнка |

| | | |
|---|---|---|
| | ўспрыманне твора, сістэма аргументацыі заснавана на ўласным чытацкім досведзе, гусце і прыярытэтах | твора як мастацкага тэксту, паэтыкі, аўтарскай пазіцыі і сродкаў яе выражэння; самастойнасць мыслення аўтара рэцэнзіі вызначаецца індывідуальнасцю стылю, глыбінёй меркаванняў, абгрунтаваннем уласных высноў |
| кампазіцыя | свабодная | строгая |
| мова | Эмацыянальна-афарбаваная лексіка, выкарыстанне выразных сродкаў мовы | Ацэначная лексіка з выкарыстаннем прафесіяналізмаў і тэрмінаў (дэманстрацыя філалагічнай кампетэнтнасці аўтара рэцэнзіі) |

## Лекцыя 16. Літаратурная творчасць навучэнцаў. Факультатыўныя заняткі

**Праблемнае поле:**

- Літаратурная творчасць школьнікаў. Літаратурная творчасць школьнікаў як адзін з кампанентаў зместу літаратурнай адукацыі.
- Факультатыўныя заняткі. Месца факультатыўных заняткаў у сістэме школьнай літаратурнай адукацыі. Асноўныя віды, змест і прынцыпы пабудовы факультатыўных курсаў.

Вопыт самастойнай літаратурна-творчай дзейнасці набываецца вучнямі ў працэсе першаснага ўспрымання тэксту на эмацыянальна-вобразным узроўні, самастойнай яго інтэрпрэтацыі, выяўлення ўласных адносін да твора, авалодання відамі творчай дзейнсці. На важнасць развіцця літаратурна-творчай самадзейнасці вучняў указваў яшчэ І. Замоцін.

**Мэты літаратурнай творчасці вучняў**: выхаванне творчай асобы, развіццё звязнага вуснага і пісьмовага маўлення, індывідуальнага моўнага стылю, літаратурна-творчых здольнасцей; практычнае авалодванне асноўнымі жанрамі мастацкай літаратуры.

**Метадычныя шляхі, прыёмы і ўмовы** развіцця літаратурнай творчасці вучняў: стварэнне атмасферы духоўнасці, творчасці; стымулюючая дзейнасць настаўніка; інтэграцыя курса літаратуры з іншымі відамі мастацкай творчасці; сістэматычная публікацыя твораў вучняў у насценгазетах, на старонцы школы ў сеціве, альманахах з далейшым абмеркаваннем; арганізацыя конкурсаў, віктарын, літаратурных свят, кіраўніцтва працай літаратурна-творчых гурткоў, факультатываў.

**Факультатыўныя заняткі (ФЗ)** – гэта форма арганізацыі адукацыйнага працэсу, накіраваная на пашырэнне і паглыбленне ведаў вучняў па вучэбных прадметах у адпаведнасці з іх запытамі, здольнасцямі і схільнасцямі, а таксама на павышэнне актыўнасці іх пазнавальнай дзейнасці. Сучасная метадычная навука разглядае факультатыўныя заняткі як варыятыўны кампанент зместу адукацыі і эфектыўны сродак павышэння якасці навучальнага працэсу. Як правіла, ФЗ збліжаюцца з вучэбнымі заняткамі: яны ўключаны ў расклад урокаў, віды вучнёўскага ўдзелу ў іх

фіксуюцца настаўнікам, вядзецца журнал уліку наведвання, даецца ацэнка работы ўдзельнікаў, у атэстаце адзначаецца, які факультатыўны курс праслуханы.

Вучні запісваюцца на ФЗ па жаданні, але ўдзел з'яўляецца абавязковым. Мінімальнае напаўненне груп для правядзення факультатыўных заняткаў для ўсіх агульнаадукацыйных вучэбных устаноў ў гарадах у колькасці 5 вучняў, а максімальная для I–IV класаў школ, гімназій і ліцэяў – 20 вучняў, для V–XI класаў агульнаадукацыйных устаноў – 25 вучняў.

Для правядзення ФЗ прапануецца выкарыстанне вучэбных праграм, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Заняткі павінны праводзіцца на падставе адпаведных вучэбна-метадычных комплексаў, размешчаных на нацыянальным адукацыйным партале (http: //e-vedy.adu.by). ВМК складаецца з вучэбнай праграмы, дапаможніка для навучэнцаў, метадычных рэкамендацый (дапаможнік для настаўніка).

Вучэбныя праграмы разлічаны на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень).

Методыка арганізацыі ФЗ па беларускай літаратуры надзвычай багатая: практыкуюцца тэарэтычныя і практычныя заняткі, выразнае чытанне твораў і чытанне па асобах, усе віды творчых работ па літаратуры, конкурсы, віктарыны, вучнёўскія канферэнцыі, ролевыя гульні, наведванне тэатраў і г.д.

## Лекцыя 17. Пазакласная і пазашкольная работа па літаратуры

**Праблемнае поле:**

- Узаемадзеянне ўрокаў, пазакласнай і пазашкольнай работы.
- Урокі пазакласнага (дадатковага) чытання, іх мэты і спецыфіка. Задачы і роля пазакласнага (дадатковага) чытання, формы яго арганізацыі і кантролю.
- Віды і формы пазакласнай працы па літаратуры.

**Пазакласная праца па літаратуры** – адна з форм вучэбнага працэсу, якая будуецца на прынцыпе добраахвотнасці і прадугледжвае выкананне адукацыйнай і выхаваўчай функцый у іх непарыўным адзінстве. Пазакласныя заняткі па літаратуры праводзяцца ў пазаўрочны час пад кіраўніцтвам настаўніка, яны цесна звязаны з паўсядзённымі ўрокамі, з'яўляюцца іх працягам і накіраваны на замацаванне, пашырэнне і паглыбленне ведаў вучняў, акрэсленых вучэбнай праграмай.

У залежнасці ад колькасці ўдзельнікаў пазакласная праца па літаратуры можа быць *масавай, камернай, групавой і індывідуальнай.*

У методыцы склалася таксама класіфікацыя формаў пазакласнай працы па літаратуры, заснаваная на часавай працягласці яе правядзення: *паўсядзённая праца* (кіраўніцтва пазакласным чытаннем), *эпізадычныя мерапрыемствы* (правядзенне вечарын, канферэнцый, дыспутаў, экскурсій, экспедыцый), *цыклічная праца* (дзейнасць гурткоў, клубаў, музеяў).

***Дадатковае чытанне*** – гэта педагагічна арганізаванае чытанне вучнямі мастацкай, навукова-папулярнай і іншай літаратуры, накіраванае на інтэлектуальнае, маральнае і эстэтычнае развіццё вучняў, прывучэнне іх да самастойнага чытання, развіццё літаратурных інтарэсаў і густаў.

Методыка выпрацавала шэраг прыёмаў кіраўніцтва пазакласным чытаннем.

Для прыкладу, рускі (савецкі) метадыст В. Галубкоў лічыў эфектыўнымі спосабамі складанне рэкамендацыйных каталогаў, арганізацыю школьнай бібліятэкай перыядычных выставак кніжных навінак, стварэнне з ліку вучняў актыву – «групы

аматараў добрай кнігі», правядзенне настаўнікам своеасаблівага агляду – «гадзіны пазакласнага чытання».

Прачытанае вучнямі не павінна заставацца па-за ўвагай настаўніка: пры адсутнасці кантролю і ўліку пазакласнага чытання ўсе папярэднія намаганні вучняў і педагогаў будуць марнымі. Праверка і аналіз самастойна прачытаных твораў звычайна адбываецца на ўроках пазакласнага чытання, а таксама пры напісанні сачыненняў, пры вывучэнні аглядавых тэм, на пазакласных мерапрыемствах (дыспутах, канферэнцыях, літаратурных вечарынах), ў час прамежкавага кантролю ў форме тэсціравання. Начытанасць вучняў улічваецца пры выніковай атэстацыі вучняў па прадмеце за чвэрць або за год.

***Літаратурная вечарына*** – адзін з самых папулярных відаў эпізадычнай пазакласнай працы ў школе. Літаратурная вечарына спрыяе паглыбленаму вывучэнню літаратуры, развіццю творчых здольнацей школьнікаў і ўплывае на фарміраванне іх эстэтычнага густу. Настаўнік з'яўляецца дарадчыкам і памочнікам пры падрыхтоўцы вечарын. Літаратурная вечарына можа быць прысвечана жыццю і творчасці пісьменніка; аднаму жанру ў яго творчасці; творчасці некалькіх пісьменнікаў звязаных падабенствам жыццёвага і літаратурнага шляху; адной літаратурнай тэме, роду, жанру; сувязі літаратуры з іншымі відамі мастацтва (тэатр, музыка, жывапіс). Літаратурныя вечарыны, прысвечаныя дзяржаўным і каляндарнаабрадавым святам, юбілею пісьменніка праводзяцца як святочнае мерапрыемства.

Сучасная беларуская методыка вылучае наступныя формы правядзення літаратурных вечарын: вечарына шырокай праграмы (даклад настаўніка або вучня і канцэрт мастацкай самадзенасці), вечарына-сустрэча з пісьменнікам; вечарына-спектакль, вечарына чытання, вечарына пытанняў і адказаў, вечарына гульняў (віктарыны, інсцэніроўкі-загадкі, турніры, КВіЗ).

***Літаратурная канферэнцыя*** – таксама адна з формаў пазакласнага мерапрыемства або ўрока ў старшых класах, у час якой вучні чытаюць і абмяркоўваюць даклады на літаратурную тэматыку. Метадысты вылучаюць наступныя віды канферэнцый: рэкамендацыйныя, выніковыя, тэматычныя. На літаратурных канферэнцыях могуць разглядацца творы, вызначаныя праграмай для вывучэння на ўроках, а таксама рэкамендаваныя настаўнікам для пазакласнага чытання. Пытанні для канферэнцыі рыхтуе настаўнік, улічваючы маральнаэтычную, эстэтычную і філасофскую праблематыку твораў. Пры падрыхтоўцы дакладаў вучні карыстаюцца дадатковай літаратурай. На літаратурных канферэцыях па кожным пытанні можа выступаць адзін або некалькі дакладчыкаў. Астатнія вучні могуць задаваць пытанні, дапаўняць дакладчыка або выступаць у якасці апанентаў. Значную дапамогу вучням пры падрыхтоўцы да літаратурнай канферэнцыі можа аказаць школьны бібліятэкар.

***Літаратурныя гурткі*** арганізоўваюцца з мэтаю пашырэння і паглыблення ведаў па літаратуры, развіцця творчых здольнасцей і інтарэсаў да філалагічнай навукі. Заняткі ў літаратурных гуртках фарміруюць у іх удзельнікаў эстэтычны густ і навыкі самастойнага аналізу літаратурнага твора, спрыяюць развіццю вуснай і пісьмовай мовы. У школьнай практыцы замацаваліся наступныя літаратурныя гурткі: *літаратуразнаўчы, літаратурна-творчы, выразнагага чытання, літаратурна-краязнаўчы, драматычны*.

***Школьнае літаратурнае краязнаўства*** вывучае літаратурную гісторыю мясцовасці, на тэрыторыі якой знаходзіцца школа: фальклор, жыццё і творчасць пісьменнікаў-землякоў, мясціны, звязаныя са знакамітымі пісьменнікамі, іншыя літаратурныя факты. Сучасная методыка вылучае наступныя формы пазакласнай працы па літаратурным краязнаўстве ў школе: *гурткі, экскурсіі і экспедыцыі, вечарыны, канферэнцыі, арганізацыя куткоў, музеяў.*

# 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## МОДУЛЬ 1

### Практычныя заняткі 1. Беларуская літаратура як вучэбны прадмет у сучаснай сярэдняй школе

**Пытанні:**

**Папераджальнае заданне:** Пазнаёмцеся з наступнымі нарматыўнымі прававымі актамі (размешчаны на сайтах Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь www.edu.gov.by і навукова-метадычнай установы "Нацыянальны інстытут адукацыі" www.adu.by).

1. Аналіз вучэбных праграм па беларускай літаратуры. Школьная праграма па беларускай літаратуры, яе змест і структура. Прынцыпы адбору і канструявання зместу адукацыі ў праграмах. Раздзелы вучэбнай праграмы.
2. Мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура".
3. Асноўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі.
4. Асноўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.
5. Асноўныя паказчыкі якасці літаратурнай адукацыі; сутнасць паняцця "начытанасць".
6. Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры:

- вучэбная праграма;
- падручнік, падручнік-хрэстаматыя, вучэбны дапаможнік;
- хрэстаматыя для пазакласнага чытання;
- вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўніка;
- дыдактычныя матэрыялы для вучняў;
- літаратуразнаўчыя слоўнікі;
- кнігі, выдадзеныя ў серыі "Школьная бібліятэка";
- выстаўкі-альбомы, прысвечаныя жыццю і творчасці беларускіх пісьменнікаў, альбомы ілюстрацый;
- аўдыявізуальныя сродкі навучання;
- электронныя сродкі навучання розных тыпаў.

**Заданні**:

1. Напішыце рэцэнзію на 2 вучэбна-метадычныя дапаможнікі па беларускай літаратуры (на выбар студэнта). Карыстайцеся алгарытмам, размешчаным ў Блоку самастойнай работы.
2. Запішыце пяць асацыяцый, якія ўзнікаюць у вашым уяўленні, калі вы чуеце выраз "беларуская літаратура".
3. Практыкаванне "Рэклама". Абапіраючыся на асабістыя ўспаміны са школьных гадоў, а таксама на прачытанае, пераканайце навучэнцаў у неабходнасці вывучэння прадмета "Беларуская літаратура".

## Практычныя заняткі 2. Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу

**Пытанні і заданні:**

**Апераджальнае заданне:** Падрыхтуйцеся да дэбатаў на тэму “Настаўнік літаратуры: як рэалізавацца ў прафесіі?”

**Метадычны каментарый:** заняткі праводзяцца ў форме дэбатаў.

**Тэзіс:** педагагічнай прафесіяй можа авалодаць кожны.

**Антытэзіс**: для педагагічнай прафесіі павінны быць пэўныя якасці і здольнасці.

У пацвярджэнне пазіцый падбярыце прыклады з асабістага вопыту, перыядычнага друку, мастацкай і педагагічнай літаратуры.

1. Выканайце практыкаванне “На працу патрабуецца педагог”: сфармулюйце тэкст аб’явы, зрабіце акцэнт на асаблівасцях педагагічнай прафесіі.
2. Назавіце творы мастацкай літаратуры (кінамастацтва), у якіх адлюстраваны погляд на прафесію (асобу) настаўніка.
3. Закончыце выказванне: “настаўнік адбыўся ў прафесіі, калі…”

**Творчае заданне**: пазнаёмцеся з “Клятвай Сакрата” М. Борхерта і “Клятвай Настаўніка” Ш. Аманашвілі. Напішыце клятву педагога XXI стагоддзя, адлюструйце ў ёй сучасныя ўяўленні пра педагагічны ідэал.

**Рэфлексія.** Праранжыруйце прафесійна значныя якасці настаўніка беларускай літаратуры ў парадку, у якім яны важныя для вас, пачынаючы з найгалоўнейшай. Выкарыстайце тэхналагічную карту рэфлексіі “Сонца і хмара”.

**Інструкцыя па выкананні**: на “сонцы” адзначце дамінантныя, прафесійна значныя якасці асобы настаўніка, на “хмары” – прафесійна недапушчальныя якасці.



## Практычныя заняткі 3. Літаратурнае развіццё школьнікаў

**Пытанні:**

**Апераджальнае заданне**: падрыхтуйцеся да дыскусіі на тэму “Крызіс літаратурацэнтрызму – прыгавор сучаснай цывілізацыі?” Прааналізуйце метадычныя работы па пытаннях пераадолення крызісу чытання беларускай літаратуры (гл. метадычныя часопісы “Беларуская мова і літаратура”, “Роднае слова”).

**Метадычны каментарый**: заняткі праводзяцца ў форме дыскусіі.

***Абмеркаванне пытанняў, абмен думкамі***:

1. Шляхі і спосабы фарміравання ў вучняў устойлівай цікавасці да чытання.
2. Як захаваць вучня-чытача? Як пераадолець крызіс чытання мастацкай літаратуры ва ўмовах інфармацыйнага грамадства?
3. Пералічыце спосабы і шляхі фарміравання ў вучняў устойлівай цікавасці да чытання.

**Заданні:**

1. Прапануйце спіс “педагагічных рэцэптаў” для актывізацыі чытацкай дзейнасці вучняў.
2. Распрацуйце варыянт анкеты сучаснага чытача для старшакласнікаў.
3. Прааналізуйце наступныя метадычныя публікацыі:

*Радзюк, Т.* Фарміраванне чытацкіх уменняў навучэнцаў на ўроках беларускай літаратуры : (з вопыту працы) / Т. Радзюк // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2020. – № 11. – С. 44-47.

*Мойса, Т.* Дзейнасць настаўніка беларускай мовы і літаратуры па фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў : Сцэнарый метадычнага трэнінгу / Т. Мойса // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2021. – № 8. – С. 3-7.

4. **Творчыя заданні**:

❖ Ці згодны вы з думкай Я. Брыля: "Чытаць – гэта і праца, і свята…"? Складзіце невялікі цытатнік, уключыўшы ў яго афарыстычныя выказванні пра ролю чытання ў жыцці чалавека.

❖ Стварыце метадычны калаж "Вучань як чытач". Метадычны калаж – адзін са спосабаў стварэння новых ілюстрацый. Ствараецца новы малюнак з фрагментаў ілюстрацый і тэкстаў. Можна выкарыстоўваць загалоўкі газет, цікавыя выказванні, рэкламныя матэрыялы, фрагменты буклетаў, календароў, плакатаў, афіш, паштовак і іншую друкаваную прадукцыю. Матэрыял размяшчаецца на ліст ватмана, плотнай тканіны.

## Практычныя заняткі 4. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры

**Пытанні:**

1. Праблема барацьбы за школу на роднай мове ў дарэвалюцыйны час.
2. Праца па адкрыцці школ на роднай мове ў 20-я гады ХХ ст., асаблівасці выкладання ў школах беларускай літаратуры. Асноўныя напрамкі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры ў 20-я гады ХХ стагоддзя.
3. Выкладанне беларускай літаратуры ў школах рэспублікі ў 30-я гг. ХХ стагоддзя.
4. Развіццё метадычнай думкі ў канцы 40-х пачатку 50-х гадоў ХХ стагоддзя.
5. Напрамкі метадычнай думкі ў другой палове ХХ стагоддзя.
6. Стан методыкі выкладання беларускай літаратуры на сучасным этапе. Сучасныя метадысты і іх працы**.**

**Заданні:**

1. Назавіце беларускія навукова-метадычныя часопісы. Падрыхтуйце агляд двух нумароў (на ваш выбар).
2. Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм:

- "*Метадычныя погляды Якуба Коласа на праблемы вывучэння мастацкай літаратуры";*
- *"Гісторыя беларускае літаратуры" М. Гарэцкага як першы падручнік па беларускай літаратуры для школ усіх ступеняў у 20-я гг. ХХ ст.";*
- *Асноўныя прынцыпы методыкі выкладання літаратуры ў школе ў працы І.І. Замоціна "Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні";*
- *"Айчынныя метадысты ХХ і ХХ стагоддзя*".

## Практычныя заняткі 5. Метады і прыёмы навучання літаратуры

**Пытанні:**

1. Агульнадыдактычныя і прыватныя прынцыпы выкладання беларускай літаратуры.
2. Паняцце аб метадах і прыёмах выкладання літаратуры. Пытанне аб метадах і іх класіфікацыі.

3. Класіфікацыя метадаў выкладання па крыніцы атрымання ведаў: *славесныя, наглядныя, практычныя*.

4. Класіфікацыя метадаў выкладання ў залежнасці ад пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў: *метад творчага чытання, эўрыстычны, даследчы, рэпрадуктыўны*.

**Заданні:**

- Запоўніце табліцу па ўзоры:

| | **метады** | **прыёмы** |
|---|---|---|
| па крыніцы атрымання ведаў | славесныя | |
| | наглядныя | |
| | практычныя | |
| па спецыфіцы пазнавальнай дзейнасці і ступені самастойнасці | творчага чытання | |
| | рэпрадуктыўны | |
| | эўрыстычны | |
| | даследчы | |

- Складзіце тэзісы наступных метадычных публікацый:

*Васюковіч, Ж.* Актыўныя метады і прыёмы навучання на ўроках беларускай мовы : (план-канспект майстар-класа) / Ж. Васюковіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2019. – № 6. – С. 31-35.

*Герасімовіч, А.* Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры : (з вопыту працы) / А. Герасімовіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2015. – № 5. – С. 22-25.

*Салавей, Л.* Выкарыстанне элементаў інавацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / Л. С. Салавей // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2018. – №12. – С. 20-27.

*Ступчык, Н.* Выкарыстанне эмодзі на ўроках беларускай літаратуры / Н. Ф. Ступчык // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2020. – № 5. – С. 28-30.

*Макавецкая, К.* Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прыемаў пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры : (з вопыту працы) / К. Макавецкая // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2016. – № 5. – С. 7-12.

*Качкан, Т.* Майстар-клас "Прыёмы візуалізацыі вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры" / Т. Качкан // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2019. – № 9. – С.21-25.

*Кароза, Т.* Інавацыйная тэхналогія вэб-квэстаў на ўроках літаратуры / Т. Кароза // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2020. – № 8. – С. 53-55.

*Казакевіч-Альшанец, Н.* Сродкі візуалізацыі на ўроках літаратуры : з вопыту працы / Н. Казакевіч-Альшанец // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2023. – № 11. – С. 34-39.

*Казакевіч-Альшанец, Н.* Выкарыстанне інструмента “рабочы аркуш” на ўроках беларускай літаратуры / Н. Казакевіч-Альшанец // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2023. – № 1. – С. 3-10.

*Арлова, А.* Каб праца дала жаданы плён : Арсенал метадаў і прыёмаў - трывалы падмурак у працы настаўніка-філолага / А. Г. Арлова // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2012. – № 5. – С. 12-17.

- Падрыхтуйце розныя віды нагляднасці, якія, на вашу думку, мэтазгодна выкарыстоўваць настаўніку пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка.
- Распрацуйце сістэму пытанняў для арганізацыі эўрыстычнай гутаркі па змесце твора са школьнай праграмы.
- Складзіце партытуру чытання верша Рыгора Барадуліна “Бацьку” (10 клас), падрыхтуйце выразнае чытанне верша.

**Творчыя заданні** (накіраваны на стварэнне навучэнцамі творчага адукацыйнага прадукту).

❖ Прыдумайце эмблему паэзіі Янкі Купалы (Максіма Танка, Р. Барадуліна і інш.).

❖ Абапіраючыся на змест п’есы В. Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта”, распрацуйце эскізы гербаў “шляхецкіх родаў” герояў камедыі. Дайце абгрунтаванне вашага выбару.

## Практычныя заняткі 6. Этапы вывучэння мастацкага твора

**Пытанні:**

1. Мэты і задачы ўступных заняткаў.
2. Вывучэнне настаўнікам чытацкага ўспрымання твораў навучэнцамі: мэты, этапы, формы, змест.
3. Аналіз мастацкага твора ў школе: мэты, структура, формы і змест, асаблівасці ў залежнасці ад ступені адукацыі.
4. Заключныя заняткі: іх мэта, задачы, змест, формы вучэбнай дзейнасці на іх.

**Заданні:**

- Запоўніце табліцу:

| | **Уступныя заняткі** | **Заключныя заняткі** |
|---|---|---|
| Мэта правядзення | | |
| Формы правядзення | | |
| Методыка правядзення | | |

- Складзіце кластар “Шляхі аналізу мастацкага твора”.
- Дапоўніце кластар “Метады і прыёмы аналізу мастацкага твора”:




- Распрацуйце фрагмент урока (уступныя заняткі) пры вывучэнні казкі Уладзіміра Караткевіча “Нямоглы бацька” (5 клас), п’есы Аляксея Дударава “Князь Вітаўт” (11 клас) ці іншых тэм (на выбар студэнта).
- Падрыхтуйце паведамленне на тэму “Спецыфіка мастацкага ўспрымання і яго ўзроставая дынаміка”.
- Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні рамана Уладзіміра Караткевіча “Чорны замак Альшанскі” (11 клас), выбіраючы розныя шляхі аналізу мастацкага твора.
- Прапануйце варыянты высвятлення ўзроўню чытацкага ўспрымання вучнямі наступных твораў: навелы Георгія Марчука “Канон Гарыні”, “Канон Маці” (11 клас), апавядання І. Пташнікава “Львы” (11 клас), камедыі К. Крапівы “Хто смяецца апошнім” (10 клас), аповесці В. Быкава “Жураўліны крык” (8 клас) і інш.

# МОДУЛЬ 2

## Практычныя заняткі 7-8. Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы

**Пытанні:**

1. Асаблівасці вывучэння фальклорных твораў. Роля фальклорнай спадчыны ў выхаванні навучэнцаў. Спецыфіка вывучэння міфаў, казак, легендаў і паданняў, прыказак, прымавак, прыкмет і павер'яў, загадак, песень. Чаму сучаснаму чалавеку патрэбна вывучаць, зберагаць і папулярызаваць нацыянальны фальклор?
2. Лірыка як аб'ект чытацкай увагі на ўроку літаратуры. Асаблівасці літаратуразнаўчага аналізу лірычнага твора: мэты, формы, іх змест у залежнасці ад ступені адукацыі. Асаблівасці вывучэння лірыкі ў V – XI класах. Метадычная сістэма навучання школьнікаў завучванню лірычных твораў (урыўкаў з іх) на памяць.
3. Метады і прыёмы вывучэння эпічных твораў. Асаблівасці вывучэння эпічных твораў малой формы. Вывучэнне эпічных твораў вялікай формы ў V–VIII, IX–XI класах.
4. Спецыфіка працы з драматычнымі тэкстамі ў школьным вывучэнні літаратуры. Шляхі аналізу драматургічнага твора. Метады і прыёмы вывучэння драматургічных твораў.

**Заданні**:

***Вывучэнне фальклорных твораў***

- Падрыхтуйце мастацкае расказванне легенды (падання), якое тлумачыць паходжанне назвы вашай мясцовасці.
- Падрыхтуйце паведамленне "Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры".
- Складзіце казку ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па развіцці маўлення з "Прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання" (5 клас).
- Складзіце табліцу "Тэматыка беларускіх прыказак".
- Устанавіце адпаведнасць паміж фальклорнымі жанрамі і іх азначэннямі:

| жанр | азначэнне |
|---|---|
| А. Казка | 1. Апавядальны твор пра фантастычную з'яву ці народных персанажаў, што падаюцца як верагодныя |
| Б. Легенда | 2. Трапны народны выраз, у якім прадказваецца пэўны вынік, пацверджаны шматвяковым народным вопытам |
| В. Загадка | 3. Выдуманае народнае выслоўе пра невядомы факт, які не пацверджаны жыццёвым вопытам чалавека |
| Г. Прыказка | 4. Вуснае народнае апавяданне пра выдуманыя падзеі |
| Д. Прыкмета | 5. Кароткае вобразнае народнае выслоўе з павучальным зместам, якое мае прамы і пераносны сэнс |
| Е. Павер'е | 6. Вобразнае апісанне ўтоенага прадмета, падзеі ці з'явы, якія патрабуюць разгадкі |

- Азнаёмцеся з артыкуламі, заканспектуйце карысныя знаходкі:

*Марцэвіч, Т.* Стэндавая віктарына “Прыказка слова згубіла”: : пагуляем у дэтэктываў" для вучняў 6-8 класаў / Т. Марцэвіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2021. – № 2. – С. 54-57.

*Машканава, С.* Падарожжа па краіне “Вусная народная творчасць” : (урок у 5-м класе) / С. Машканава // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2015. – № 8. – С. 31-33.

*Праскаловіч, В*. “Ішоў Бай па сцяне…”: да пытання абаяльнасці і гісторыі жанру казкі / В. Праскаловіч // Роднае слова. – 1999. - № 10. – С. 54-60.

*Праскаловіч, В*. Вучы народ, вучыся і ў народа: з гісторыі выкладання беларускага фальклору ў школе / В. Праскаловіч // Роднае слова. – 2000. – № 2. – С. 52-54.

*Праскаловіч, В*. Вучымся складаць казкі / В. Праскаловіч // Роднае слова. – 2011. - № 9. – С. 58-61.

*Шамякіна, С.* Мастацкі вобраз і мастацкая дэталь у беларускіх чарадзейных казках // Беларуская мова і літаратура. - 2007. - № 7. - С. 41-45.

- Падрыхтуйце канспект урока (пазакласнага мерапрыемства) па вывучэнні фальклорнай спадчыны ў школе (клас, тэма – на выбар).

### *Вывучэнне лірычных твораў*

✓ Дакажыце слушнасць думкі “Жывапіс – гэта паэзія, якую бачаць, а паэзія – жывапіс, які чуюць” (Л. да Вінчы). Якімі зрокавымі і слыхавымі спосабамі стварэння паэтычных вобразаў карыстаюцца паэты? Прывядзіце прыклады.

✓ Узнавіце карціны прыроды, створаныя ў вершы “Зімой” М. Багдановіча і “Зоры спяваюць” А. Грачанікава. Знайдзіце “колеравыя” і “гукавыя” словаабазначэнні, запоўніце табліцу:

| Зрокавыя вобразы (фарбы) | Слыхавыя вобразы (гукі) | Настрой | Аўтар, твор |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

✓ Складзіце кросэнс з фотаздымкаў, якія асацыіруюцца з вершамі А. Куляшова (ці інш. паэта). Растлумачце, якія радкі натхнілі вас на падбор ілюстрацый.

<u>Для даведкі</u>: *Кросэнс* – табліца-загадка з малюнкамі (звычайна на 9 ячэек). Рашыць кросэнс – значыць знайсці сэнсавую сувязь паміж малюнкамі і адгадаць агульнае для іх паняцце (назву твора, пісьменніка і інш.).

✓ Распрацуйце канспект урока па вывучэнні верша Р. Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” (8 клас).

<u>Для даведкі</u>: Пры аналізе твора неабходна звярнуць увагу на:

a) асаблівасці эмацыйнага выказвання чалавека пад уплывам пачуццяў і перажыванняў, звязаных з успамінамі пра родных і блізкіх, як адна з праяў духоўнасці асобы;

b) асаблівасці стварэння лірычнага вершаванага тэксту: уплыў адносін аўтара да родных мясцін, дзе праходзіла яго дзяцінства і юнацтва, на вобразную сістэму твора;

c) ролю вобразных (эпітэт, метафара і інш.), рытмічных сродкаў у лірычным вершаваным творы, адметнасць аўтарскай інтанацыі.

### *Вывучэнне эпічных твораў*

❖ Распрацуйце канспект урока па вывучэнні апавядання Алены Васілевіч “Сябры” (6 клас).

Для даведкі: Пры аналізе твора неабходна звярнуць увагу на:

a) маральна-этычную праблему твора;
b) узаемаадносіны Лёні і Грышы;
c) прыёмы псіхалагічнай абмалёўкі характару;
d) сюжэт і кампазіцыю апавядання;
e) вобраз аўтара-апавядальніка ў творы.

❖ Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні наступных эпічных твораў вялікай формы:

a) Я. Колас “На ростанях” (частка першая “У палескай глушы”) (10 клас),
b) К. Чорны “Пошукі будучыні” (10 клас),
c) І. Мележ “Людзі на балоце” (10 клас),
d) В. Быкаў “Знак бяды”(11 клас),
e) У. Караткевіч “Чорны замак Альшанскі” (11 клас).

❖ Складзіце рэестр літаратуразнаўчых тэрмінаў, якія вучні павінны засвоіць пры вывучэнні эпічных твораў у школе. Да кожнага з паняццяў гэтага рэестра падбярыце 3–5 прыкладаў з эпічных твораў, якія вывучаюцца ў адпаведных класах.

❖ Азнаёмцеся з метадычнымі матэрыяламі:

*Праскаловіч, В.* Навучанне школьнікаў культуратворчасці на аснове жанравага падыходу: эпічныя творы / В. Праскаловіч // Роднае слова. – 2011. - № 6. – С. 72-76.

*Рагойша, В.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапаможнік / В. рагойша. – Мінск, 2001. – 384 с.

*Русілка, В.* Незвычайнае літаратуразнаўств: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы: 8 клас : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. Русілка. – Мінск, 2010. – 64 с.

*Руцкая, А.* Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / А. Руцкая, М. Грынько. – Минск, 2010. – 184 с.

### *Вывучэнне драматычных твораў*

➢ Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні камедыі К. Крапівы “Хто смяецца апошнім”.

➢ Распрацуйце канспект аднаго ўрока па вывучэнні камедыі К. Крапівы “Хто смяецца апошнім” (у сістэме вывучэння творчасці К. Крапівы).

Для даведкі: Пры аналізе твора неабходна звярнуць увагу на:

- час напісання;
- актуальнасць праблем, узнятых у творы;
- сюжэтную аснову камедыі;
- канфлікт у п’есе;
- маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна;
- эвалюцыю характару Тулягі;
- вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера;
- сродкі і прыёмы сатырычнай тыпізацыі і індывідуалізацыі;
- мову персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў;
- выкарыстанне сатырычных прыёмаў;
- сцэнічнае жыццё п’есы.

➢ Распрацуйце фрагмент урока па вывучэнні п’есы з апорай на творчы прыём – складанне кадрапланаў (узор ў табліцы):

| Сцэна і яе загаловак | Дзеючыя асобы і адносіны паміж імі | Дзеянні, рухі, паводзіны персанажаў | Рэмаркі | Дэкарацыі, касцюмы, музычныя і шумавыя эфекты | Цытаты з тэксту |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

➢ Азнаёмцеся з наступнымі матэрыяламі, зрабіце тэзісны канспект:

*Крапіва, К.* Канфлікт – аснова п’есы / К. Крапіва // Зб. тв. : у 5 т. – Мінск: Маст. літ., 1974-1976. – Т. 5: Нарысы, артыкулы, пераклады. – 1976. – С. 212-220.

*Праскаловіч, В.* Навучанне школьнікаў відам літаратурна-творчай дзейнасці на аснове жанравага падыходу: драматычныя творы / В. Праскаловіч // Роднае слова. – 2-11. - №11. – С. 54-57; 2012. - № 1. – С. 59-62.

➢ Напішыце рэцэнзію на прагледжаны вамі спектакль (на выбар студэнта)

## Практычныя заняткі 9. Урок літаратуры ў сучаснай школе

**Пытанні:**

1. Урок як асноўная форма арганізацыі навучальнай дзейнасці навучэнцаў. Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры. Выхаваўчы і развіццёвы патэнцыял сучаснага ўрока літаратуры.
2. Тыпы ўрокаў літаратуры, прынцыпы іх класіфікацыі.
3. Структура і асноўныя этапы сучаснага ўрока літаратуры.
4. Стандартныя і нестандартныя ўрокі як метадычная праблема. Віды нетрадыцыйных урокаў: *урок-завочная экскурсія, урок-дыспут, урок-залік, урок-літаратурная гасцёўня, урок-свята, урок-канферэнцыя* і інш.
5. Падрыхтоўка настаўніка да ўрока літаратуры: этапы, формы і змест.
6. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі навучання літаратуры, выкарыстанне актыўных (інтэрактыўных) формаў навучання.

**Заданні:**

- Абгрунтуйце слушнасць меркавання В. Сухамлінскага: “Урок – гэта люстэрка агульнай і педагагічнай культуры настаўніка, мерка яго інтэлектуальнага багацця, паказчык яго далягляду, эрудыцыі”.
- Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм: “*Праблемнасць навучання ў працах беларускіх вучоных (М.А. Лазарука, В.Я. Ляшук, В.У. Івашына, А.І. Бельскага, І.М. Гоўзіч, В.І. Русілкі, А.В. Руцкой і інш.)*”; “*Спецыфіка выкарыстання праблемнага навучання на ўроках беларускай літаратуры”; “Спецыфіка выкарыстання модульнага навучання на ўроках беларускай літаратуры*”.
- Складзіце тэзісы наступных дыдактычных матэрыялаў:

*Дубіна, А.* Сакрэты педмайстэрні, або якім павінен быць урок беларускай літаратуры // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2009. – № 5. – С. 41-44.

*Кендыш, Н.* Сучасны ўрок: шляхі падвышэння матывацыі да навучання : (з вопыту працы) / Н. Кендыш // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2019. – № 4. – С.14-16.

*Лойша, Т.* Рэфлексія як элемент сучаснага ўрока / Т. В. Лойша // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу". – 2017. – № 8. – С. 45-49.

*Марцэвіч, Т.* Актыўныя і інтэрактыўныя формы навучання, або Як зрабіць урокі літаратуры цікавымі : (з вопыту працы) / Т. Марцэвіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2022. – № 9. – С. 42-48.

*Руцкая, А.* Новыя формы ўрокаў па беларускай літаратуры / А. Руцкая // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу” . - 2011. – № 11. – С. 44-47.

*Ступчык, Н.* Відэаўрок як інструмент развіцця ключавых кампетэнцый ва ўмовах навучання анлайн / Н. Ступчык // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2021. – № 4. – С. 29-34.

*Ступчык, Н.* Скрайбінг і сторытэлінг як сродкі фарміравання кумунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры / Н. Ступчык // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2019. – № 8. – С.31-37.

*Церашкова, А.* Інструменты шматмернай дыдактычнай тэхналогіі ў якасці "разумных шпаргалак" : (майстар-клас) / А. Церашкова // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2022. – № 4. – С. 33-40.

*Цялега, А.* Сучасны ўрок: парная і групавая формы працы / А. Цялега // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2020. – № 9. – С. 39-41.

- Складзіце алгарытмы метадычнай дзейнасці настаўніка пры падрыхтоўцы да ўрока беларускай літаратуры (тып урока – на выбар студэнта).
- Падрыхтуйце канспект нестандартнага ўрока па беларускай літаратуры (клас, тэма – на выбар студэнта).
- “Мы пазбаўляем дзяцей будучыні, калі працягваем вучыць сёння так, як вучылі гэтаму ўчора”, - сцвярджаў амерыканскі вучоны Джордж Дзьюі (1776-1841). Прапануйце аргументы на карысць укаранення новых формаў навучання. Пакажыце на прыкладах, як можна іх выкарыстаць на ўроку.
- Лічыцца, што ў школе лекцыйная форма ўрока неэфектыўная. Прапануйце магчымыя віды заданняў вучням на ўроку-лекцыі для павелічэння эфектыўнасці ўрока.

**Рэфлексія.** Ацаніце ўласную дзейнасць на занятках. Запоўніце тэхналагічную карту эмацыянальна-вобразнай рэфлексіі “Астравы”.

**Інструкцыя**: у залежнасці ад эмацыянальнага стану пасля заняткаў “прышвартуйце” свій карабель да аднаго з астравоў на малюнку.

востраў радасці  востраў няўпэўненасці 

востраў смутку 



востраў трывогі  востраў задавальнення 

## Практычныя заняткі 10. Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм

**Пытанні:**

1. Спецыфіка выкладання курса беларускай літаратуры на гісторыка-храналагічнай аснове.
2. Спецыфіка вывучэння аглядавых тэм у курсе літаратуры IX–XI класаў.
3. Методыка правядзення ўрокаў па вывучэнні аглядавых тэм.
4. Спецыфіка выкарыстання нагляднасці, тэхнічных і інфармацыйных сродкаў пры вывучэнні аглядавых тэм.
5. Асаблівасці вывучэння манаграфічных тэм у курсе літаратуры на гістарычнай аснове.
6. Структура манаграфічнай тэмы.
7. Методыка вывучэння манаграфічнай тэмы: мэты, этапы, форма і змест.
8. Шляхі аналізу (паслядоўны, паралельны) манаграфічнага матэрыялу.

**Заданні:**

- Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм:

"*Як зрабіць лекцыю актыўным метадам навучання";*

*"Арганізацыя самастойнай працы пры вывучэнні аглядавых тэм*".

- Пацвердзіце або аспрэчце меркаванне метадыста: "*Сённяшні ўрок біяграфіі хутчэй за ўсё ўяўляе сабою кампазіцыю, дзе вядучым з'хяўляецца настаўнік, які аб'ядноўвае разнастайныя віды вучнёўскай самадзейнасці ў адзінае цэлае, ажыццяўляючы сувязь класна-ўрочнай сістэмы з пазакласнай работай*" (В. Ляшук); "*Педагагічныя магчымасці выкарыстання такога сродку, як біяграфіі славутых людзей Рэспублікі Беларусь, з мэтай фарміравання грамадзянскасці заключаюцца ў тым, што ў старшакласнікаў узнікае цікавасць і жаданне пераймаць іх і нават пераўзысці*" (В. Буткевіч).

**Творчае заданне**: распрацуйце буклет, прысвечаны жыццёвай і творчай біяграфіі пісьменніка.

- Пазнаёмцеся з аглядавай тэмай "Развіццё беларускай літаратуры на сучаным этапе" (вуч. дапаможнік для XI кл.). Распрацуйце кластар па тэме.
- Метадычны дыктант. Запоўніце пропускі.

| Азначэнне | Ключавое слова |
|---|---|
| Эпоха ў развіцці сусветнай культуры і мастацтва XIV-XVI стст. (у Беларусі працягвалася ў першай палове XVII ст.). Характарызуецца росквітам прыродазнаўчых і гуманітарных навук, вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі, зваротам да чалавека як разумнай і творчай асобы, фарміраваннем асноў гуманістычнага светапогляду | |
| Эпоха і напрамак у еўрапейскім мастацтве XVI-XVIII стст., для якога характэрна трагічнае ўспрыманне жыцця, высокая эмацыянальнасць, спалучэнне кантрасных з'яў: высокага і назкага, духоўнага і цялеснага, фантастыкі і рэальнасці | |
| Мастацкі напрамак у еўрапейскай літаратуры XVII-XVIII стст. Характэрна высокая грамадзянская тэматыка, строгае следаванне правілам, дзяленне жанраў літаратуры на высокія і нізкія, захаванне ў драматургіі трох адзінстваў – часу, месца, дзеяння і інш. | |

| | |
|---|---|
| Мастацкі напрамак, які ўзнік у Заходняй Еўропе ў канцы XVIII ст. Характэрны культ пачуцця, свабоды, арыентацыя на сярэдневяковую культуру, прынцып індывідуальнасці, самабытнасці творчасці. | |
| Мастацкі напрамак, які з'явіўся ўслед за рамантызмам, паставіўшы на месца выключнага тыповае, праўдзівае адлюстраванне рэчаіснасці. | |
| Мастацкі напрамак другой паловы XVIII- пачатку XIX ста., які засяродзіў увагу на паказе ўнутранага свету чалавека, яго пачуццяў, настрояў, перажыванннняў. | |

- Законспектуйце карысныя парады з метадычных матэрыялаў:

*Руцкая, А.* Вывучэнне аглядавых тэм / А. Руцкая // Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэбны дапам. / А. Руцкая, М. Грынько. – Мінск, 2010. – С. 120-121.

*Бельскі, А.* Вывучэнне тэмы "Беларуская літаратура ў гады Вялікай Айчыннай вайны" ў 10 класе // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2009. – № 5. – С. 9-12.

*Жыгалава, М.* Вывучэнне біяграфіі пісьменніка ў школе : полікультурны аспект / М. Жыгалава // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". - 2014. – № 8. – С. 16-21.

*Троцкая, Т.* Выкарыстанне прыёмаў "магічны квадрат" і "марфалагічная скрыня" пры вывучэнні біяграфіі і творчасці Янкі Купалы ў IX-X класах / Т. Троцкая // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2023. – № 10. – С. 29-31.

- Пазнаёмцеся з анатацыямі да манаграфічных тэм (гл. вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры для IX-XI класаў). Вызначце шляхі вывучэння манаграфічных тэм, іх мэтазгоднасць.
- Распрацуйце канспект урока па вывучэнні аглядавай тэмы (клас, тэма – на выбар).
- Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні манаграфічнай тэмы "Іван Шамякін. Раман "Сэрца на далоні". Распрацуйце канспект аднаго ўрока ў кантэксце прапанавай тэмы.

## Практычныя заняткі 11. Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні

**Пытанні:**

1. Сістэма тэарэтыка-літаратурных паняццяў, якія вывучаюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, іх месца ў літаратурнай адукацыі вучняў.
2. Паслядоўнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў пры вывучэнні літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
3. Прыёмы вывучэння тэорыі літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

**Заданні:**

- З воблака слоў выпішыце адзінкі, якія з'яўляюцца літаратуразнаўчымі паняццямі (тэрмінамі). Растлумачце іх сэнс.




- Распрацуйце фрагмент урока па вывучэнні тэарэтыка-літаратурнага паняцця (клас, тэма – на выбар студэнта).
- Зрабіце агляд метадычных работ па пытаннях фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў:

*Есіс, Я.* Маршрутны аркуш як элемент вывучэння тэорыі літаратуры ў VII-VIII класах / Я. Есіс // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2023. – № 1. – С. 14-16.

*Шаўлякова-Барзенка, І.* Навучанне тэорыі літаратуры ў 5-8 класах // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 10. – С. 47-53.

*Ялынцава, І.* Літаратуразнаўчая беларуская тэрміналогія школьных падручнікаў // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2010. – № 6. – С. 40-44.

## Практычныя заняткі 12. Развіццё маўлення вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі

**Пытанні:**

1. Патрабаванні школьнай праграмы па літаратуры да заняткаў па развіцці вуснага маўлення вучняў.
2. Прыёмы развіцця вуснага маўлення навучэнцаў, іх сутнасць і спецыфіка.
3. Пісьмовыя працы як сродак развіцця маўленчых навыкаў.
4. Сачыненні як від творчых работ па літаратуры: патрабаванні, класіфікацыя, этапы і формы падрыхтоўчай працы навучэнцаў, кампазіцыя. Этапы работы над сачыненнем.
5. Аналіз сачынення па літаратуры.
6. Развіццё маўлення лагічнага тыпу на ўроках літаратуры: складанне плана, тэзісаў, канспекта, напісанне рэферата, даклада па адной і некалькіх крыніцах.

**Заданні:**

- Карыстаючыся праграмай па беларускай літаратуры, запоўніце наступную табліцу:

*Асноўныя віды вусных і пісьмовых работ па беларускай літаратуры*

| клас | Віды вусных работ | Віды пісьмовых работ |
|---|---|---|
| 5 | | |
| 6 | | |
| 7 | | |
| 8 | | |
| 9 | | |
| 10 | | |
| 11 | | |

- Складзіце алгарытм аналізу школьнага сачынення.
- Складзіце памятку для навучэнцаў “*Як выконваць работу над памылкамі*”.
- Пры праверцы і ацэнцы сачыненняў настаўнік кіруецца двума асноўнымі дакументамі: “Адзіным моўным і арфаграфічным рэжымам установы, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі” і “Нормамі ацэнківедаў, уменняў і навыкаў вучняў V-XI класаў”. Як правіла, сачыненне чытаецца двойчы. Пры першым чытанні настаўнік асэнсоўвае змест і выпраўляе наступныя памылкі і недакладнасці:

**Z** – патрэбны чырвоны радок;

**Z/** - чырвоны радок лішні;

**[ ]** – лішняе ў тэксце;

**!** – станоўчая ацэнка фрагмента сачынення;

**?** – не зусім зразумела;

**Ф** – дапушчана фактычная памылка;

**П** – неапраўданы паўтор слова.

Пры другім чытанні выпраўляюцца арфаграфічныя, пунктуацыйныя і іншыя віды памылак.

Праверце сачыненне, зрабіце класіфікацыю памылак і пастаўце адзнаку:

*(па матэрыялах: Праскаловіч, В. Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум : вучэб. – метад. дапам. / В. Праскаловіч. – 2-е выд. – Мінск, 2-23. – С. 164-165.).*

***Мой любімы герой па аповесці “Жураўліны крык”***

*Я прачытаў аповесць В. Быкава “Жураўліны крык”. Гэта аповесць, як і іншыя творы Быкава, што я прачытаў, пра вайну. Апісання вайсковых дзеянняў у творы не шмат, больш старонак адведзенна апісанню настрою і стану герояў, іх успамінам і перажыванням. З пяці салдат, якія засталіся на пераездзе затрымліваць врага мне найбольш спадабаўся Свіст. Вясёлы і знаходлівы, Віцька дапамагаў воінам забыцца пра тое, што іх, магчыма чакае смерць.Яго жарты падымалі ў салдат настрой. Віцька Свіст сам вельмі шчодры чалавек і не любіць скупых. Гэтая рыса яго характару вельмі харашо раскрываецца ў эпізодзе з салам Пшанічнага. Іншы на яго месцы мог бы дагаварыцца з Пшанічным і ціхенька з’есці сала толькі ўдваём. Але Віцька так неколі не зрабіў б. Ён добра разумее, што усе воіны галодныя. Таму, забраўшы сала ў Пшанічнага Віцька прапануе зварыць кашу на усіх. Вядома, не вельмі добра, што ён зрабіў гэта падманам, але ў даннай сітуацыі іншага выхаду не было. Прошлае Свіста дае нам зразумець, што ў гэтага хлопца не ўсё ў жыцці было гладка. Ён быў уцягнуты ў нячыстую справу: абкрадванне дзяржавы. За гэта Свісту нават давялося пасядзець у турме. Але сваю памылку Віцька зразумеў сам, і хутка выправіў яе. Калі пачалася вайна, свіст разам з іншымі хлопцамі апынуўся на фронце. А ў хуткім часе і на пераездзе. Калі з’явіліся немцы і стала зразумела, што прыйдзецца загінуць, Свіст не на хвіліну не падумаў пра здраду. Ён смела і адважна змагаўся да канца, падтрымліваў дух астатніх.*

*Васіль Быкаў ставіць перад сваімі героямі праблему выбару, або здрадзіць радзіме, або стаць яе абаронцай. Віцька свіст выпрабаванне вытрымаў, не гледзячы на крымінальнае прошлае і памылкі ў жыцці. За гэта не патрэбна яго вельмі строга судзіць, таму што ў кожнага чалавека ёсць свае памылкі. Але адна справа, калі чалавек разумее свае памылкі і далей не робіць іх, і другая справа, калі чалавек робіць памылкі і ў далейшым іх не выпраўляе.*

*Вось за гэтыя рысы характару мне і падабаўся Віцька Свіст.*

- Азнаёмцеся з артыкулам, выпішыце карысныя парады:

*Захарчук, І.* Развіццё маўлення навучэнцаў сродкамі беларускай літаратуры : (з вопыту працы) / І. Захарчук // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2018. – № 5. – С. 26-33.

Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2009. – № 7. – С. 18-20.

*Праскаловіч, В*. Выкажыся, каб я цябе ўбачыў! (Мастацтва вусных выказванняў) : 9-ты клас / В. Праскаловіч, В. Кушнярэвіч. - Минск : Літаратура і Мастацтва, 2010. - 85 с.

*Смыкоўская, В.* Развіццё мовы вучняў на ўроках літаратуры / В. І. Смыкоўская. - Минск : Нар. асвета, 1988. - 149 с.

# 3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## Кантрольныя пытанні па вучэбнай дысцыпліне

1. Методыка выкладання беларускай літаратуры як вучэбная дысцыпліна. Змест, структура, задачы курса.
2. Сувязь методыкі выкладання беларускай літаратуры з іншымі дысцыплінамі.
3. З гісторыі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры.
4. Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры (агульная характарыстыка).
5. Школьныя праграмы па беларускай літаратуры (структура).
6. Падручнікі і хрэстаматыі па беларускай літаратуры.
7. Вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўніка па беларускай літаратуры.
8. Настаўнік беларускай літаратуры і прафесійныя патрабаванні да яго.
9. Чытацкія асаблівасці вучняў у залежнасці ад узросту.
10. Агульнадыдактычныя прынцыпы выкладання літаратуры.
11. Прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу.
12. Метады выкладання літаратуры.
13. Метады і прыёмы вывучэння мастацкага твора.
14. Каляндарнае планаванне.
15. Перспектыўнае планаванне.
16. Бягучае планаванне.
17. Улік і ацэнка ведаў вучняў.
18. Урок як асноўная форма выкладання літаратуры. Патрабаванні да сучаснага ўрока беларускай літаратуры
19. Аналіз урока, праведзенага настаўнікам.
20. Тыпы ўрокаў па дыдактычных мэтах.
21. Урокі акадэмічнага тыпу.
22. Віды ўрокаў па вядучым метадзе.
23. Вывучэнне твораў у залежнасці ад жанравых асаблівасцей.
24. Нестандартныя ўрокі.
25. Вывучэнне аглядавых тэм.
26. Вывучэнне манаграфічных тэм.
27. Спецыфіка вывучэння літаратурна-крытычных артыкулаў.
28. Вывучэнне біяграфіі пісьменніка.
29. Шляхі аналізу мастацкага твора ("следам за аўтарам", павобразны, свабодны, скрыты).
30. Шляхі аналізу мастацкага твора (кампазіцыйны, праблемны, аглядавы, камбінаваны).
31. Аналіз мастацкага твора на ўроках літаратуры.
32. Мэты і віды правядзення ўступных заняткаў.
33. Методыка правядзення ўступных заняткаў.
34. Заключныя заняткі.
35. Інавацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай літаратуры.

## Тэставыя заданні для кантролю

**1. У якім годзе Пастановай урада БССР у школах усіх тыпаў на тэрыторыі рэспублікі была ўведзена беларуская літаратура як абавязковы прадмет?**
а) 1917 г.;
б) 1923 г.;
в) 1935 г.;
г) 1948 г.

**2. У які перыяд МВБЛ развівалася надзвычай плённа?**
а) 90-я гады XIX ст.;
б) 20-я гады XX ст.;
в) 30-я гады XX ст.;
г) першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

**3. Калі выйшла праца В.Я. Ляшук "Методыка выкладання беларускай літаратуры", якая была зацверджана Міністэрствам светы БССР у якасці навучальнага дапаможніка:**
а) у 1986 г.;
б) у 1996 г.;
в) у 2002 г.;
г) у 2005 г.

**4. Якая з пералічаных кніг серыі "Пісьменнік у школе" НЕ змяшчала распрацоўкі ўрокаў па творчасці пісьменніка?**
а) Л. Семяноўская "Міхась Лынькоў у школе";
б) У. Міцкевіч "Пятрусь Броўка ў школе";
в) В. Ляшук "Іван Мележ у школе";
г) М. Барсток "Нарыс аб жыцці і творчасці М. Багдановіча".

**5. Гэты метадычны часопіс пачаў выходзіць у 1988 годзе, зараз ён называецца**
а) "Школа і культура Савецкай Беларусі";
б) "Беларуская думка";
в) "Роднае слова";
г) "Працаўнік асветы".

**6. Дзейнасць якога метадыста адносіцца да канца XX – пачатку XXI стст.**
а) К. Міцкевіч;
б) І. Замоцін;
в) В. Ляшук;
г) М. Каспяровіч.

**7. Агульныя мэты школьнага курса літаратуры акрэслены:**
а) Адукацыйным стандартам вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура" (I – XI класы);
б) Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь;
в) Інструкцыяй аб парадку фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь;
г) Ацэнкамі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура".

**8. Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” была распрацавана і зацверджана:**
а) у 1991 г.;
б) у 1998 г.;
в) у 2004 г.;
г) у 2009 г.

**9. З якога класа беларуская літаратура пачынае вывучацца як самастойны прадмет?**
а) з 1 класа;
б) з 4 класа;
в) з 5 класа;
г) з 9 класа

**10. У якіх класах згодна з канцэпцыяй вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” літаратура вывучаецца на гісторыка-літаратурнай аснове?**
а) 5 – 6 класах;
б) 7 – 8 класах;
в) 8 – 9 класах;
г) 10 – 11 класах.

**11. Метады навучання – гэта...**
а) адзінка вучэбнага працэсу;
б) спосабы работы настаўніка і вучняў, пры дапамозе якіх дасягаецца авалодванне ведамі, уменнямі і навыкамі, фарміруецца светапогляд вучняў, развіваюцца іх здольнасці;
в) структурны элемент урока;
г) асноўныя правілы настаўніка на ўроку.

**12. Да славесных метадаў навучання адносяцца:**
а) дэманстрацыя;
б) гутарка;
в) ілюстрацыя;
г) самастойная работа вучняў.

**13. Да наглядных метадаў навучання адносяцца:**
а) лекцыя;
б) каменціраванае чытанне;
в) ілюстрацыя;
г) самастойная работа вучняў.

**14. Які від пераказу выкарыстоўваецца з мэтай засяродзіць увагу на самым галоўным, арыентуе вучняў карыстацца сваімі словамі?**
а) падрабязны;
б) сціслы;
в) творчы;
г) выбарачны.

**15. Які від пераказу вядзецца ад імя адной з дзеючых асоб?**
а) падрабязны;
б) сціслы;

в) творчы;
г) выбарачны.

**16. Метад, пры якім ажыццяўляецца паслядоўны выклад навучальнага матэрыялу настаўнікам, называецца:**
а) лекцыя;
б) пераказ;
в) мастацкае расказванне;
г) дэманстрацыя.

**17. Якая гутарка праводзіцца для таго, каб вучні аднавілі веды, атрыманыя з мастацкага твора, са слоў настаўніка, з падручніка і іншых крыніц інфармацыі?**
а) рэпрадуктыўная;
б) эўрыстычная;
в) рэпрадуктыўна-эўрыстычная;
г) праблемная.

**18. Які метад з'яўляецца найвышэйшай ступенню навучання літаратуры, прымяняецца толькі ў тым выпадку, калі вучні авалодалі прыёмамі самастойнай працы?**
а) даследчы;
б) эўрыстычны;
в) рэпрадуктыўны;
д) метад творчага чытання.

**19. Сутнасць якога метаду ў тым, што вучні атрымліваюць веды ў гатовым выглядзе са слоў настаўніка, са школьнага падручніка, з навукова-папулярнай літаратуры?**
а) даследчага;
б) эўрыстычнага;
в) рэпрадуктыўнага;
д) метаду творчага чытання.

**20. Асноўным метадам вывучэння аглядавых тэм з'яўляецца:**
а) лекцыя;
б) гутарка;
в) дэманстрацыя;
г) самастойная работа.

**21. Да агульнаадукацыйнага прынцыпу выкладання беларускай літаратуры адносіцца:**
а) гістарызм;
б) паслядоўнасць;
в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;
г) вывучэнне мастацкага твора ў адзінстве формы і зместу.

**22. Да прыватнага прынцыпу выкладання беларускай літаратуры адносіцца:**
а) навуковасць;
б) сістэматычнасць;
в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;
г) паслядоўнасць.

**23. Які прынцып выкладання беларускай літаратуры рэалізуецца, калі настаўнік абавязвае чытаць мастацкі твор поўнасцю?**
а) навуковасць;
б) гістарызм;
в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;
г) паслядоўнасць.

**24. Які прынцып выкладання беларускай літаратуры рэалізуецца, калі настаўнік падае вучэбны матэрыял у адпаведнасці з самымі новымі дасягненнямі літаратуразнаўства?**
а) гістарызм;
б) навуковасць;
в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;
г) вывучэнне мастацкага твора ў адзінстве формы і зместу.

**25. Дэманстрацыя карціны на ўроку па вывучэнні верша Я. Коласа "Ручэй" – гэта выкарыстанне:**
а) слыхавой нагляднасці;
б) зрокавай нагляднасці;
в) дынамічнай нагляднасці;
г) не з'яўляецца нагляднасцю.

**26. Нагляднасць на ўроках беларускай літаратуры выкарыстоўваецца, каб:**
а) своеасабліва адрэгуляваць сувязь паміж пачуццёвым і лагічным пазнаннем у працэсе ўспрымання мастацкага вобраза;
б)прадэманстраваць вучням інтэлектуальнае развіццё настаўніка;
в) скасаваць сувязь паміж пачуццёвым і лагічным пазнаннем у працэсе ўспрымання мастацкага вобраза;
г) заняць больш часу на ўроку.

**27. Нагляднасць на ўроку беларускай літаратуры:**
а) павінна падмяніць сабой вывучэнне мастацкага твора;
б) служыць сродкам міжпрадметных сувязяў;
в) не павінна выкарыстоўвацца;
г) адцягвае ўвагу вучня ад вывучэння мастацкага твора.

**28. Праграма па беларускай літаратуры:**
а) не дае ніякіх рэкамендацый па выкарыстанні нагляднасці;
б) дае рэкамендацыі па выкарыстанні нагляднасці адным блокам у пачатку праграмы;
в) дае рэкамендацыі па выкарыстанні нагляднасці адным блокам у канцы праграмы;
г) дае рэкамендацыі па выкарыстанні нагляднасці ў рубрыцы "Мастацтва" пасля асобных раздзелаў.

**29. Прынцып нагляднасці:**
а) адносіцца да агульнадыдактычных прынцыпаў навучання;
б) адносіцца да прыватных прынцыпаў выкладання беларускай літаратуры;
в) адносіцца да агульнадыдактычных і прыватных прынцыпаў выкладання беларускай літаратуры;
г) не з'яўляецца прынцыпам дыдактыкі.

**30. Якімі баламі ацэньваецца нізкі (рэцэптыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**
а) 1-2;
б) 3-4;
в) 5-6;
г) 7-8.

**31. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 1-2 балы?**
а) узровень пазнавання аб'екта вывучэння;
б) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
в) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
г) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі.

**32. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць толькі на пытанні "Што адбываецца ў творы? Пра каго ідзе гаворка ў творы?"**
а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);
г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**33. Выкананне вучнем задання тыпу "Назавіце галоўных герояў мастацкага твора" адносіцца да ўзроўню:**
а) здавальняльнага (рэцэптыўна-рэпрадуктыўнага);
б) нізкага (рэцэптыўнага);
в) дастатковага (прадуктыўнага);
г) высокага (прадуктыўнага, творчага).

**34. Якімі баламі ацэньваецца здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**
а) 1-2;
б) 3-4;
в) 5-6;
г) 7-8.

**35.Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 3-4 балы?**
а) узровень пазнавання аб'екта вывучэння;
б) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
в) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
г) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі.

**36. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць толькі на пытанні "Якая тэма твора? Станоўчы ці адмоўны гэта герой?"**
а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);
г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**37. Выкананне вучнем задання тыпу "Назавіце асаблівасці пэўнага літаратурнага роду" адносіцца да ўзроўню:**
а) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўнага);
б) нізкага (рэцэптыўнага);

в) дастатковага (прадуктыўнага);
г) высокага (прадуктыўнага, творчага).

**38. Якімі баламі ацэньваецца сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**
а) 3-4;
б) 5-6;
в) 7-8;
г) 9-10.

**39. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 5-6 балаў?**
а) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
б) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
в) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі;
г) узровень прымянення ведаў у незнаёмай сітуацыі, перанос ведаў.

**40. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць на пытанні: "Як Вы ацэньваеце падзеі, апісаныя ў творы? Чаму такі герой і яго ўчынкі":**
а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);
г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**41. Якімі баламі ацэньваецца дастатковы (прадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**
а) 3-4;
б) 5-6;
в) 7-8;
г) 9-10.

**42. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 7-8 балаў?**
а) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
б) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
в) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі;
г) узровень прымянення ведаў у незнаёмай сітуацыі, перанос ведаў.

**43. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць на пытанні "Якая аўтарская пазіцыя выказана ў мастацкім творы?":**
а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) дастатковы (прадуктыўны);
г) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны).

**44. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 9-10 балаў?**
а) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
б) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
в) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі;
г) узровень прымянення ведаў у незнаёмай сітуацыі, перанос ведаў.

**45. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць на пытанні "Якія вы можаце прасачыць паралелі з ужо вядомым, іншымі творамі аўтара і творамі?":**
а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);
г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**46. Якая мэта пры складанні канспекта ўрока па беларускай літаратуры НЕ ставіцца?**
а) адукацыйная;
б) развіваючая;
в) тэарэтычная;
г) выхаваўчая.

**47. Да нетрадыцыйных урокаў адносяцца:**
а) урок-канферэнцыя;
б) урок тлумачэння новага матэрыялу;
в) урок абагульнення і сістэматызацыі;
г) урок камбінаванай будовы.

**48. У залежнасці ад роду вывучаемага твора вылучаецца:**
а) урок па вывучэнні лірыкі;
б) урок па развіцці мовы вучняў;
в) урок-лекцыя;
г) урок аналізу творчых работ.

**49. У залежнасці ад асноўнага метаду і прыёму працы вылучаецца:**
а) урок кантролю і карэкцыі ведаў, уменняў;
б) урок па вывучэнні манаграфічных тэм;
в) урок па вывучэнні аглядавых тэм;
г) урок-гутарка.

**50. Спецыфічным патрабаваннем да ўрока літаратуры НЕ з'яўляюцца:**
а) эмацыянальна-псіхалагічнае адзінства ўрока;
б) абавязковае чытанне і мэтанакіраваны адбор мастацкіх тэкстаў і ўрыўкаў з іх;
в) вывучэнне літаратуры ў кантэксце з іншымі відамі мастацтва, узаемасувязь з урокамі гуманітарнага цыклу;
г) пастаянны кантроль і самакантроль, эканомія часу.

## Правільныя адказы

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1-б | 11-б | 21-б | 31-а | 41-в |
| 2-б | 12-б | 22-в | 32-а | 42-в |
| 3-а | 13-в | 23-в | 33-б | 43-в |
| 4-г | 14-б | 24-б | 34-б | 44-г |
| 5-в | 15-в | 25-б | 35-б | 45-г |
| 6-в | 16-а | 26-а | 36-б | 46-в |
| 7-а | 17-а | 27-б | 37-а | 47-а |
| 8-г | 18-а | 28-г | 38-б | 48-а |
| 9-в | 19-в | 29-а | 39-б | 49-г |
| 10-г | 20-а | 30-а | 40-в | 50-г |

# 4. ДАДАТКОВЫ РАЗДЗЕЛ

У раздзеле змешчаны матэрыялы, карысныя для студэнтаў пры самастойнай падрыхтоўцы па вучэбнай дысцыпліне.

## 4.1 Змест вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання беларускай літаратуры”

**Методыка выкладання беларускай літаратуры як навуковая дысцыпліна.** Тэарэтычныя асновы курса методыкі выкладання літаратуры. Прадмет, змест і задачы курса, яго структура. Сувязь з прадметамі гуманітарнага, псіхолага-педагагічнага, літаратуразнаўчага і лінгвістычнага цыклу.

**Беларуская літаратура як вучэбны прадмет у сучаснай сярэдняй школе.** Своеасаблівасць літаратуры ў шэрагу іншых школьных прадметаў. Мэты і задачы вывучэння беларускай літаратуры ў школе: далучыць вучняў да набыткаў айчыннай мастацкай славеснасці (у кантэксце сусветнай), развіць іх здольнасці да эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі з'яў літаратуры; фарміраваць на гэтай падставе эстэтычны густ, інтарэсы, грамадзянскую, духоўна-маральную, камунікатыўную культуру вучняў.

**Прынцыпы, змест і асноўныя этапы адукацыі ў сучаснай школе.** Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і іх рэалізацыя пры выкладанні літаратуры. Канцэпцыя развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура". Дыдактычныя, літаратуразнаўчыя, метадычныя прынцыпы выкладання літаратуры. Кампаненты зместу літаратурнай адукацыі. Этапы літаратурнай адукацыі: I ступень агульнай сярэдняй адукацыі (I-IV класы), II ступень агульнай сярэдняй адукацыі (V-IX класы), III ступень агульнай сярэдняй адукацыі (X-XI класы) і задачы курса літаратуры.

**Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу.** Прафесійныя веды і педагагічныя ўменні настаўніка-славесніка. Класіфікацыя педагагічных уменняў, якія вынікаюць з функцый педагога. Асобасныя якасці настаўніка. Планаванне і імправізацыя як умовы педагагічнай творчасці. Уплыў асобы настаўніка на школьнікаў. Роля самаадукацыі. Светапоглядная аснова асобы настаўніка, ажыццяўленне ім сучаснай культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Школьны кабінет літаратуры.

**Літаратурнае развіццё школьнікаў.** Узроставыя асаблівасці і этапы літаратурнага развіцця вучняў. Літаратурныя здольнасці вучняў: чытацкія і творчыя. Праблема крытэрыяў літаратурнага развіцця вучняў. Вывучэнне чытача-школьніка як метадычная праблема. Этапы развіцця чытача-школьніка: пачатковы, малодшыя падлеткі, старэйшыя падлеткі, юнацкі ўзрост.

**Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры.** Выдатныя беларускія асветнікі і мысліцелі. Роля рускіх педагогаў і метадыстаў XIX – XX ст. Першыя беларускія чытанкі. Выкладанне беларускай літаратуры ў 20-я гг. XX ст., асаблівасці выкладання ў 30-я гг. Развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры ў 40-80-я гг. XX ст. Перыядычны друк, метадычная літаратура. Праграмы і падручнікі. Метадычныя дапаможнікі настаўніку. Сучасны стан (з 1990-х гадоў і па цяперашні час) і перспектывы літаратурнай адукацыі.

**Метады і прыёмы навучання літаратуры.** Асноўныя класіфікацыі метадаў у дадактыцы. Класіфікацыя метадаў навучання ў методыцы выкладання літаратуры: па крыніцах атрымання ведаў, па характары пазнавальнай дзейнасці вучняў, па метадах і

прыёмах спасціжэння літаратурных твораў і інш. Суадносіны паняццяў “метад” і “прыём”. Прыёмы эмацыянальна-вобразнага спасціжэння літаратурнага твора. Прыёмы спасціжэння аўтарскай пазіцыі. Інавацыйныя метады і прыёмы аналізу мастацкага твора: эксплікацыя, метад кагнітыўнай камунікацыі, метад літаратурнага пошуку і інш. Камунікатыўна-дзейнасны, крэатыўны, культуралагічны падыходы да літаратуры.

**Этапы вывучэння мастацкага твора.** Уступныя заняткі як этап вывучэння мастацкага твора. Чытанне твора і арыенціровачныя заняткі. Аналіз як этап вывучэння літаратурнага твора. Заключны этап вывучэння літаратурнага твора.

**Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы.** Залежнасць аналізу мастацкага твора ад яго родава-жанравай спецыфікі. Своеасаблівасць метадаў і прыёмаў вывучэння твораў. Вывучэнне эпічных твораў: спецыфіка вывучэння ў сярэдніх і старэйшых класах. Метады і прыёмы аналізу эпічных твораў. Вывучэнне лірычных твораў. Спецыфіка вывучэння лірыкі на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.  Метады і прыёмы аналізу лірычнага твора. Вывучэнне драматычных твораў. Метады і прыёмы стварэння сцэнічнага эфекту.

**Фарміраванне чытацкіх уменняў на ўроках літаратуры.** Асноўныя групы чытацкіх уменняў. Уменні, звязаныя з успрыманнем мастацкага твора: уяўляць карціны, намаляваныя пісьменнікам; эмацыянальна выказваць першасныя ўражанні аб творы; прыўносіць у сваю інтэрпрэтацыю новыя моманты, якія не супярэчаць вобразнай прыродзе твора. *Аналітычныя ўменні*: выяўляць родава-жанравую спецыфіку твора; вызначаць асноўную праблематыку твора; выяўляць матывы ўчынкаў герояў, прасочваць развіццё сюжэта ў эпічным творы, канфлікту – у драматычным творы, змену пачуццяў – у лірычным вершы; выяўляць аўтарскую пазіцыю ў творы; вызначаць асаблівасці стылю твора. *Сінтэтычныя ўменні*: супастаўляць герояў і сітуацыі розных твораў; выяўляць агульныя якасці твораў аднаго жанру і адрозніваць індывідуальную своеасаблівасць пісьменнікаў у межах аднаго жанру; суадносіць твор, творчасць пісьменніка з літаратурным накірункам дадзенай эпохі; супастаўляць творы розных літаратурных накірункаў. *Уменні, звязаныя з ацэнкай мастацкага твора*: фармуляваць і абгрунтоўваць сучасную актуальную праблему, сугучную разглядаемаму твору; абгрунтоўваць сваю трактоўку твора і параўноўваць яе з іншымі трактоўкамі гэтага ж тэксту. Этапы засваення школьнікамі чытацкіх уменняў, іх сувязь з этапамі навучання. Узаемасувязь чытацкіх і літаратурна-творчых уменняў. Асноўныя літаратурна-творчыя ўменні, фарміруемыя на аснове чытацкіх уменняў.

**Урок літаратуры ў сучаснай школе.** Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры. Класіфікацыі ўрокаў літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Чатырохэлементная (традыцыйная) структура ўрока. Традыцыйныя і нетрадыцыйныя ўрокі як метадычная праблема. Віды нетрадыцыйных урокаў. Падрыхтоўка настаўніка да ўрока. Планаванне. Новыя педагагічныя тэхналогіі навучання літаратуры, выкарыстанне актыўных форм навучання. *Класіфікацыя ўрокаў у залежнасці ад этапаў вывучэння мастацкага твора і шляхоў яго аналізу* (уступныя заняткі (урокі), арыентацыйныя заняткі (урокі), заключныя заняткі (урокі), урокі аналізу (вобраза, праблемы, кампазіцыі, эпізода, раздзела, дзеі). *Класіфікацыя ўрокаў па жанравай спецыфіцы твора*: урокі вывучэння фальклорных твораў, урокі вывучэння лірыкі, урокі вывучэння эпічных твораў, урокі вывучэння драматычных твораў, урокі пазакласнага чытання. Урокі вывучэння асноў гісторыі літаратуры. Урокі вывучэння аглядавых тэм. Урокі вывучэння манаграфічных тэм. Урокі аналізу сачыненняў. Тыпы ўрокаў у залежнасці ад методыкі іх правядзення.  Урокі, у аснове якіх адзін з метадаў, прыёмаў выкладання літаратуры. Тыпы урокаў, у аснове якіх адна з формаў пазакласнай працы.

Нестандартныя ўрокі. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках літаратуры.

**Гісторыя літаратуры ў школьным вывучэнні.** Гістарызм у выкладанні літаратуры на розных этапах курса. Значэнне і месца гісторыка-літаратурных ведаў на ўроках літаратуры ў V-IX класах. Спецыфіка сістэматычнага курса літаратуры на заключным этапе літаратурнай адукацыі. Задачы і спецыфіка вывучэння аглядавых і манаграфічных тэм. Задачы вывучэння аглядных тэм і іх роля ў літаратурнай адукацыі школьнікаў. Тыпы аглядавых тэм. Змест і структура.

**Вывучэнне манаграфічных тэм.** Разнастайны характар вывучэння мастацкага твора ў рамках манаграфічнай тэмы. Вывучэнне жыцця і творчасці пісьменніка ў межах манаграфічнай тэмы. Прыёмы работы: слова пра пісьменніка, каменціраванне партрэтаў, фотаздымкаў, экскурсіі ў літаратурны музей, выкарыстанне дадатковай літаратуры (II ступень агульнай сярэдняй адукацыі); лекцыя настаўніка, кінаўрокі, розныя формы нагляднасці, самастойная работа з дакументальнай і мемуарнай літаратурай, літаратурна-краязнаўчая работа (III ступень агульнай сярэдняй адукацыі).

**Вывучэнне літаратурна-крытычных артыкулаў.** Літаратурна-крытычныя артыкулы ў гісторыка-літаратурным аспекце. Этапы вывучэння літаратурна-крытычных артыкулаў. Прыёмы работы над літаратурна-крытычным артыкулам ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

**Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні.** Сістэмна-функцыянальны падыход да вывучэння тэорыі літаратуры ў школе. Паслядоўнасць фарміравання тэорыка-літаратурных паняццяў. Шляхі спасціжэння вобраза ў сярэдніх класах. Сувязь тэорыі літаратуры ў старшых класах з гісторыка-літаратурнымі ўстаноўкамі курса. Пераемнасць, этапнасць прымянення вывучаных ведаў. Значэнне вывучэння твораў беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай для фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў. Выкарыстанне міжпрадметных сувязей з урокамі рускай літаратуры для фарміравання ведаў і ўменняў па тэорыі літаратуры.

**Развіццё маўлення вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі.** Развіццё маўлення як сацыяльная і метадычная задача. Асноўныя прынцыпы работы па развіцці маўлення. Накірункі работы: узбагачэнне, удасканаленне, актывізацыя слоўнікавага запасу. Крытэрыі маўленчага развіцця вучняў. Віды вусных выказванняў. Узаемасувязь вуснага і пісьмовага маўлення. Віды пісьмовых работ у V-VIII кл. Віды пісьмовых прац у IX-XII кл. Сачыненні розных форм, іх роля ў фарміраванні творчай самастойнасці, светапогляду вучняў, у пазнанні літаратурнага твора. Класіфікацыі сачыненняў, патрабаванні да іх. Авалоданне жанрамі пісьмовага маўлення. Аналіз і ацэнка пісьмовага маўлення. Рэцэнзія настаўніка. Работа над памылкамі.

**Літаратурная творчасць школьнікаў.** Літаратурная творчасць школьнікаў як адзін з кампанентаў зместу літаратурнай адукацыі. Асноўныя мэты літаратурнай творчасці школьнікаў. Асноўныя прынцыпы развіцця літаратурнай творчасці школьнікаў. Жанры мастацкай літаратуры (казка, верш, апавяданне і інш.), публіцыстычныя жанры (нататка ў газету, інтэрв'ю, водгук, рэцэнзія і інш.), літаратурна-крытычныя жанры (сачыненне праблемнага характару, характарыстыка персанажа, даклад, рэферат і інш.), вучэбна-традыцыйныя жанры (сачыненне-апавяданне, сачыненне-разважанне, сачыненне-апісанне і інш.). Метадычныя шляхі, прыёмы і ўмовы развіцця літаратурнай творчасці школьнікаў.

**Пазакласная і пазашкольная работа па літаратуры.** Узаемадзеянне, урокаў, пазакласнай і пазашкольнай работы. Урокі пазакласнага (дадатковага) чытання, іх мэты і спецыфіка. Задачы і роля пазакласнага (дадатковага) чытання, формы яго арганізацыі і кантролю. Віды і формы пазакласнай працы па літаратуры: гурткі, таварыствы, клубы, літаратурныя святы, экскурсіі, паходы, конкурсы, віктарыны і г.д.

Літаратурныя вечары і ранішнікі. Гульнёвыя тэхналогіі навучання на пазакласных занятках. Літаратурныя гульні ў пазаўрочны час. Літаратурнае краязнаўства як сродак выхавання нацыянальна-дзяржаўнай самасвядомасці, павагі да дзяржаўнай сімволікі, патрыятызму і інтэрнацыяналізму.

**Факультатыўныя заняткі.** Месца факультатыўных заняткаў у сістэме школьнай літаратурнай адукацыі. Асноўныя віды, змест і прынцыпы пабудовы факультатыўных курсаў. Структурна-змястоўная характарыстыка новых ВМК (вучэбная праграма, дапаможнік для настаўнікаў, дапаможнік для вучняў) факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры. Адметнасць методыкі правядзення факультатыўных заняткаў. Лекцыі, семінарскія заняткі, рэфераты, даклады, дыспуты, іх месца і спецыфіка на факультатыўных занятках.

## 4.2 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны Спецыяльнасць 6-05-0232-01 Беларуская філалогія

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | Практычныя заняткі | | |
| **2 курс 4 семестр** | **34** | **24** | **4** | **экзамен** |
| **Модуль 1.** | | | | |
| Методыка выкладання беларускай літаратуры як навуковая дысцыпліна | 2 | | | Даклады, вуснае апытванне |
| Беларуская літаратура як вучэбны прадмет у сучаснай сярэдняй школе | 2 | 2 | | Прэзентацыі, вуснае апытванне |
| Прынцыпы, змест і асноўныя этапы адукацыі ў сучаснай школе | 2 | | | Прэзентацыі, вуснае апытванне |
| Настаўнік літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу | 2 | 2 | | Даклады, вуснае апытванне |
| Літаратурнае развіццё школьнікаў | 2 | 2 | | Прэзентацыі, вуснае апытванне |
| Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры | 2 | 2 | | Даклады, рэфераты, вуснае апытванне |
| Метады і прыёмы навучання | 4 | 2 | | Прэзентацыі, вуснае |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| літаратуры | | | | апытванне |
| Этапы вывучэння мастацкага твора | 2* | 2 | | Даклады, вуснае апытванне |
| Форма бягучай атэстацыі па модулю | | | | Распрацоўка і аналіз плана-канспекта |
| **Модуль 2.** | | | | |
| Вывучэнне мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы | 2 | 4 | | Планы-канспекты ўрокаў, вуснае апытванне |
| Фарміраванне чытацкіх уменняў на ўроках літаратуры | | | 2 | Даклады, вуснае апытванне |
| Урок літаратуры ў сучаснай школе | 4 | 2 | | Даклады, планы-канспекты ўрокаў |
| Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм | 2 | 2 | | Прэзентацыі, вуснае і пісьмовае апытванне |
| Вывучэнне літаратурна-крытычных артыкулаў | 1 | | | Даклады, вуснае і пісьмовае апытванне |
| Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні | 1 | 2 | | Планы-канспекты ўрокаў, вуснае і пісьмовае апытванне |
| Развіццё маўлення вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі | 2 | 2 | | Планы-канспекты ўрокаў, вуснае і пісьмовае апытванне |
| Літаратурная творчасць навучэнцаў | 1 | | | Даклады, вуснае і пісьмовае апытванне |
| Пазакласная і пазашкольная работа па літаратуры* | 2 | | | Сцэнарыі пазакласных мерапрыемстваў, вуснае і пісьмовае апытванне |
| Факультатыўныя заняткі | 1 | | | Даклады, рэфераты, вуснае і пісьмовае апытванне |
| Кантроль КСР | | | 2 | Індывідуальнае апытванне, даклад, презентацыя |
| Форма бягучай атэстацыі па модулю | | | | Правядзенне ўрока па распрацаваным плане-канспекце |

## 4.3 Матэрыялы для самастойнай работы

**Рэцэнзія на вучэбны дапаможнік “Беларуская літаратура”**
*(указаць выхадныя дадзеныя)*

1. **Адпаведнасць зместу вучэбнага дапаможніка канцэпцыі вучэбнага прадмета, патрабаванням методыкі навучання вучэбнаму прадмету**.

Ці адпавядае змест вучэбнага дапаможніка канцэпцыі вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура”? У якой ступені рэалізаваныя метадалагічныя падыходы да навучання вучэбнаму прадмету, заяўленыя ў канцэпцыі вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура”?

2. **Змест вучэбнага дапаможніка**. Ці адпавядае змест вучэбнага дапаможніка вучэбнай праграме для адпаведнага класа? Адзначыць асаблівасці структуры вучэбнага дапаможніка ў цэлым і асобных раздзелаў.

Адзначыць наяўнасць вучэбных заданняў, накіраваных на забеспячэнне асноўных патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў. Адзначыць мэтазгоднасць выкарыстання памятак, інструкцый, апорных схем, культурна-гістарычнай інфармацыі, неабходнай для арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

*Апарат арыенціроўкі*: адзначыць даведачна-дапаможныя сродкі, якія дапамагаюць хутка і беспамылкова знаходзіць неабходны матэрыял: рубрыкі і тэматычныя сімвалы; выдзяленні шрыфтам; каляровыя фонавыя застаўкі і інш.

*Навігацыйны апарат*: наяўнасць у змесце спасылак на друкаваныя і электронныя кампаненты ВМК. Як ажыццяўляецца праца з асноўнымі модулямі ЭАР?

*Ілюстрацыйны матэрыял*: метадычная мэтазгоднасць выкарытсання ілюстрацыйнага матэрыялу (малюнкі, рэпрадукцыі карцін, карты, схемы і інш.).

3. **Адпаведнасць вучэбнага дапаможніка дыдактычным прынцыпам**. Прынцып навуковасці. Прынцып даступнасці. Прынцып сістэмансці і паслядоўнасці. Прынцып актыўнасці навучання.

Адзначыць наяўнасць заданняў, якія патрабуюць інтэграваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц; пытанняў і заданняў для самаправеркі засваення вучэбнага матэрыялу.

Прынцып практыкаарыентаванасці (сувязі з жыццём). Прынцып нагляднасці. Ці дастатковы аб’ём ілюстрацыйнага матэрыялу? Як спалучаюцца ў змесце падручніка вербальная і візуальная формы вучэбнага матэрыялу?

Прынцып рэалізацыі ўнутры- і міжпрадметных сувязей. Ці ёсць спасылкі на матэрыял па іншых вучэбных прадметах?

4. **Рэалізацыя ў вучэбным дапаможніку дыдактычных функцый**.

Навучальная функцыя. Матывацыйная функцыя. Функцыя замацавання, кантролю і самаадукацыі. Развіццёвая функцыя. Ці садзейнічае падручнік развіццю інтэлектуальгных, камунікатыўных, крэатыўных здольнасцей вучняў? Прывесці прыклады.

Выхаваўчая функцыя. Ці накіраваны змест вучэбнага дапаможніка на фарміраванне ў вучняў светапогляду, каштоўнасных арыентацый, значымых для беларускага грамадства? Прывесці прыклады. Як ажыццяўляецца патрыятычнае выхаванне сродкамі мастацкай літаратуры?

Навігацыйная функцыя. Ці забяспечвае вучэбны дапаможнік навігацыю па адукацыйным кантэнце: арыентацыю вучняў ва ўсіх кампанентах ВМК па вучэбным прадмеце? Прывесці прыклады.

Зрабіць **вывад**.

**Заданні для самастойнай работы:**

❖ Распрацуйце пытанні і заданні для індывідуальнай праверкі ведаў і ўменняў навучэнцаў па пэўнай тэме (тэма, клас – на выбар студэнта), зрабіце пяць картак для апытвання (па два пытанні – асноўнае і дадатковае).

❖ Распрацуйце 10 тэставых заданняў markрознага тыпу для тэматычнага кантролю (твор, тэма – на выбар).

❖ Звярніцеся да педагагічных сайтаў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры (напрыклад, сайт настаўніка-метадыста М. Жуковіча, сайт настаўніцы А. Мігаль і інш.): https://zhukovich4.narod.ru/

https://www.nastaunik.info/workshop/biellit

Дайце характарыстыку сайтам, прапануйце свой варыянт настаўніцкага сайта.

❖ **Планаванне.**

Настаўніку ў працэсе працы даводзіцца звяртацца да ***каляндарнага, перспектыўнага і бягучага (паўрочнага)*** планавання.

Каляндарны план складаецца на паўгоддзе / навучальны год.

Віды каляндарнага плана: просты і разгорнуты. Яны складаюцца па наступных формах:

***Просты каляндарны план***

| **№ п/п** | **Тэма** | **Колькасць гадзін (але не больш за 2)** | **Дата** |
|---|---|---|---|
| | | | |

***Разгорнуты каляндарны план***

| **№ п/п** | **Тэма** | **Колькасць гадзін** | **Дата** | **Развіццё маўлення** | **Тэорыя літаратуры** | **Паўтарэнне** | **Нагляднасць** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |

**Перспектыўнае планаванне.** Выкарыстоўваецца пры разглядзе манаграфічных тэм або твораў вялікага аб'ёму, на вывучэнне якіх адводзіцца больш за тры гадзіны. Узор афармлення наступны:

***Тэматычна-паўрочнае планаванне***

| **Тэма** | **Метадычныя прыёмы** | **Заўвагі** |
|---|---|---|
| | | *Нагляднасць, старонкі вучэбнай літаратуры для чытання вучнямі, метадычнай – для настаўніка* |

***Тэматычна-мэтавае планаванне***

| Тэма | Адукацыйная мэта | Матывацыйная мэта | Развіваючая мэта | Выхаваўчая мэта |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

**Бягучае (паўрочнае) планаванне.** Прадугледжвае складанне плана, тэзіснага плана. Плана-канспекта, канспекта ўрока, тэхналагічнай карты ўрока. Асновай для паўрочнага планавання выступае каляндарнае і тэматычнае. Сучаснай формай канспекта ўрока з'яўляецца яго электронная версія. Вучням з канспекта могуць дэманстравацца ключавыя тэзісы ўрока, фотаздымкі, прэзентацыі і г.д.

**Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планіраванне (КТП).** Складаецца ў адпаведнасці з дзеючымі вучэбнымі праграмамі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. КТП дапамагае настаўніку наладзіць адукацыйны працэс, але не павінна стрымліваць яго ініцыятыву і творчы падыход да выкладання прадмета. Настаўнік можа размеркаваць матэрыял па-іншаму з улікам асаблівасцей класа.

**Прыкладны ўзор рабочага плана ўрока літаратуры**

**Дата. Клас.**

**Назва тэмы.**

**Мэты:**

-*адукацыйная:*

- *развіваючая:*

- *выхаваўчая:*

**Абсталяванне.**

**Ход урока**

1. **Праверка ведаў і ўменняў (формы, прыёмы, сродкі, заданні).**
2. **Падвядзенне вучняў да вывучэння новай тэмы.**
3. **Вывучэнне новай тэмы (асноўныя пытанні, заданні для вучняў і г.д.).**
4. **Абагульненне новага матэрыялу (высновы, заданні на ўзнаўленне і сістэматызацыю).**
5. **Дамашняе заданне.**
6. **Падвядзенне вынікаў урока.**

❖ Пазнаёмцеся з КТП па беларускай літаратуры для 10 класа. Распрацуйце план-канспект па адной з тэм (на ваш выбар). Прыкладны варыянт плана-канспекта глядзіце ў Дадатку.

## Схема цэласнага аналізу вершаванага твора

1. Час напісання верша.
2. Рэальна-біяграфічны (калі ёсць) каментарый.
3. Жанр.
4. Ідэйны змест:
   - вядучая тэма;
   - асноўная думка, праблема;
   - эмацыянальная афарбоўка пачуцця (у дынаміцы ці ў статыцы);
   - адметнасць інтанацыі.
5. Структура верша.
6. Сродкі выразнасці і іх роля.
7. Асаблівасці рыфмы, рытмікі і строфікі.
8. Уласныя ўражанні, ацэнка.

## Схема аналізу эпізоду эпічнага твора

1. Чытанне (пераказ).

2. Абмеркаванне ўражанняў.
3. Вызначэнне месца эпізода ў сюжэце твора (кампазіцыйная роля).
4. Значэнне эпізода для характарыстыкі персанажаў.
5. Тэкстуальны аналіз, асэнсаванне ролі мастацкіх сродкаў.
6. Канкрэтызацыя высноў.

## Алгарытм працы над вялікім эпічным творам

1. Агульная характарыстыка гістарычных абставін, у якіх быў напісаны твор (або пра якія напісаны твор).
2. Месца твора ў літаратурнай спадчыне пісьменніка.
3. Звесткі аб першай публікацыі твора, яго крытычных ацэнках (звярнуць увагу на новае прачытанне).
4. Характарыстыка: тэматыка, праблематыка, асноўны канфлікт; асаблівасць сюжэту, кампазіцыі, стылёвай манеры пісьменніка;сістэма персанажаў; моўныя мастацка-выяўленчыя сродкі; ідэйны змест твора.
5. Аналіз мастацка-філасофскай канцэпцыі (этычныя, эстэтычныя, сацыяльныя ідэі і погляды аўтара).
6. Месца твора ў гісторыі нацыянальнай і сусветнай літаратуры.

## 4.4 Узор плана-канспекта ўрока па беларускай літаратуры

Настаўнік беларускай літаратуры Ліцэя ВДУ імя П.М. Машэрава Гладкова Ганна Аляксандраўна

**Тэма ўрока: Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя (10 клас)**

**Тып урока:** Урок вывучэння новага матэрыялу.

Месца ўрока: 1/1

Форма работы: індывідуальная, групавая, парная

***Мэта ўрока*** *(кагнітыўная): мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні:*

*прыгадаюць і дадуць ацэнку найбольш значным гістарычным падзеям пачатку ХХ стагоддзя;*

*прааналізуюць першыя легальныя газеты "Наша доля" і "Наша ніва";*

*вызначаць асаблівасці развіцця паэзіі і прозы пачатку ХХ стагоддзя; раскажуць пра станаўленне драматургіі і літаратурнай крытыкі;*

*абагульняць і сістэматызуюць набытыя веды па тэме ўрока праз кластар.*

***Задачы развіцця і выхавання асобы вучняў:***

***стварыць умовы для:***

- фарміравання і развіцця ўмення працаваць з тэкстам, аналізаваць, структурыраваць і параўноўваць інфармацыю;

***садзейнічаць:***

- развіццю навыкаў вуснага маўлення;
- выхаванню эстэтычнага густу і цікавасці да літаратурнай спадчыны.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для 10 класа (Мн., 2020); мультымедыйны праектар; дошка; карціны І. Рэпіна "Маніфестацыя 17 кастрычніка 1905 года", В. Несцярэнкі "Мы – рускія, з намі Бог!", М. Авілава "Прарыў польскага фронту Першай коннай арміяй"; партрэты паэтаў і пісьменнікаў беларускай літаратуры першай паловы ХХ стагоддзя; дыдактычны раздатачны матэрыял.

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

✓ ***Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.***

✓ ***Праверка дамашняга задання шляхам правядзення экспрэс-тэсту па наступных пытаннях:***

1. Назавіце аўтараў паэм "Тарас на Парнасе" і "Энеіда навыварат" (*Канстанцін Вераніцын, Вікенцій Равінскі*)
2. Вызначце жанр твораў "Тарас на Парнасе" і "Энеіда навыварат" (*бурлескна-травесційныя творы – жартоўнае "пераапрананне" высокіх антычных вобразаў багоў у "нізкія"*).
3. Які дзеяч беларускай літаратуры ХІХ стагоддзя ўзначальваў універсітэт у Сант'яга, таксама з'яўляецца нацыянальным героем Чылі? (*Ігнат Дамейка*)
4. Які беларускі абрад даў назву вядомай паэме А. Міцкевіча? (*Дзяды*)
5. Які беларускі паэт быў збіральнікам фальклорных твораў, у 1837 годзе ў Вільні выдаў шэсць фальклорных зборнікаў пад агульнай назвай "Сялянскія песні з-над Нёмана і Дзвіны"? (*Ян Чачот*)
6. Як называецца першы зборнік паэзіі Ф. Багушэвіча? У якім годзе ён выйшаў? Пад якім псеўданімам? (*"Дудка беларуская", 1891, Мацей Бурачок*)
7. Як называецца другі зборнік паэзіі Ф. Багушэвіча? У якім годзе ён выйшаў? Пад якім псеўданімам? ("*Смык беларускі", 1894, Сымон Рэўка з-пад Барысава*)
8. Як звалі галоўнага героя паэмы "Кепска будзе!", які распавядае пра сваё жыццё? (*Аліндарка*)
9. Што рабіў айчым, как вызваліць героя з астрога? (*Наведаў тройчы Вільню і сем разоў Ліду*)

10. Каму з беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя належаць словы: "… не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не умёрлі"? (*Францішку Багушэвічу*).

Узаемаправерка вучнямі выкананых тэстаў, выстаўленне адзнак.

✓ ***Актуалізацыя раней вывучанага. Франтальная гутарка.***

Г.А.: Мы працягваем знаёмства з беларускай літаратурай, вы ўжо ведаеце асаблівасці развіцця літаратуры на беларускіх землях у часы Сярэднявечча, у эпоху адраджэння, Асветніцтва, і ў XIX стагоддзі. Наперадзе нас чакае вывучэнне мастацкай літаратуры XX стагоддзя. Узгадайце з урокаў гісторыі найбольш значныя падзеі пачатку XX стагоддзя ў Беларусі і свеце (рэвалюцыйныя падзеі 1905-1907 і 1917 гг., Першая сусветная вайна (1914-1918), савецка-польская вайна (1919-1921).

Звярніце ўвагу на карціны, прысвечаныя гэтым падзеям (*дэманструюцца на мультымедыйнай дошцы карціны Ільі Рэпіна "Маніфестацыя 17 кастрычніка 1905 года", Васіля Несцярэнкі "Мы – рускія, з намі Бог!", Міхаіла Авілава "Прарыў польскага фронту Першай коннай арміяй"*). **Дадатак 1.**

- Якія пачуцці перадаюць аўтары (*пачуццё страху, гора, страты і аднačасова імкненне да перамогі*).
- Што аб'ядноўвае гэтыя карціны? (*ваенныя падзеі*).
- Якімі эпітэтамі вы ахарактарызавалі б гэты час? (*жорсткі, бязлітасны, крывавы*).

✓ ***Мэтавызначэнне.***

Г.А.: Сёння на ўроку мы высветлім, як у такі няпросты час развівалася беларуская літаратура. Тэма ўрока: "Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя".

Прапаную вызначыць мэты сённяшняга ўрока (*мэты запісаны на слайдзе і дэманструюцца з дапамогай мультымедыйнай дошкі*). Спадзяюся, што напрыканцы ўрока вы зможаце:

- прыгадаць і даць ацэнку найбольш значным гістарычным падзеям пачатку XX стагоддзя;
- прааналізаваць першыя легальныя газеты "Наша доля" і "Наша ніва";
- вызначыць асаблівасці развіцця паэзіі і прозы пачатку XX стагоддзя;
- расказаць пра станаўленне драматургіі і літаратурнай крытыкі;
- абагульніць і сістэматызаваць набытыя веды па тэме ўрока праз кластар.

✓ ***Пастаноўка праблемнага пытання.***

Г.А.: У пачатку XX стагоддзя беларуская літаратура развівалася паскорана, засвойваючы за лічаныя гады тое, на што ў іншых народаў былі дзесяцігоддзі. Чаму, на вашу думку, наша літаратура развівалася паскорана? (*Настаўнік слухае, прымае першапачатковыя меркаванні вучняў і пакідае пытанне адкрытым*).

**II. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

✓ ***Франтальная гутарка.***

Г.А.: Па фотаздымках назавіце, хто пачынаў свой творчы шлях у гэты час. (Дэманструюцца партрэты: М. Багдановіч, А. Гарун, М. Гарэцкі, Я. Колас, Я. Купала, В. Ластоўскі, Цётка, Ядвігін Ш.). **Дадатак 2.**

- Падумайце, чаму пісьменнікі, працягваючы традыцыі рэалізму, разам з тым звяртаюцца да ідэй мадэрнізму? Звернемся да азначэння напрамку ў вашых падручніках (*Зачытваецца азначэнне мадэрнізму на с. 83 вучэбнага дапаможніка*).

✓ ***Праца ў групах.***

**1 група.** Запоўніце пашпарт на прапанаваныя перыядычныя выданні і раскажыце, якую ролю ў развіцці тагачаснай беларускай літаратуры адыграў перыядычны друк. (*Варта карыстацца матэрыялам вучэбнага дапаможніка на с. 80*).

*Прыкладны адказ:*

| | **"Наша доля"** | **"Наша ніва"** |
|---|---|---|
| **Год і месца выдання** | З 1906 па 1907 год у Вільні (выдадзена 6 нумароў) | З 1906 да жніўня 1915 года ў Вільні |
| **Мова** | беларуская | беларуская |
| **Каму адрасавана** | Для сельскага і гарадскога люду | |
| **Мэта выдання** | Мела рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак. Выпуск нумароў суправаджаўся судовымі канфліктамі і забаронамі | Выконвала асветніцкія мэты, знаёміла з падзеямі тагачаснага жыцця і гісторыяй Беларусі; спрыяла нацыянальна-культурнаму адраджэнню, згуртавала вакол сябе творчыя сілы |

**2 група.** Прааналізуйце паэзію і прозу беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. (*Варта карыстацца матэрыялам вучэбнага дапаможніка на с. 80-81.*).

*Прыкладны адказ:*

| **Паэзія** | | **Проза** |
|---|---|---|
| *Паэты адшурхоўваліся ад набыткаў фальклору, абапіраліся на традыцыйныя прынцыпы і прыёмы вершаскладання* | **Сувязь з традыцыямі** | *Цесная сувязь з фальклорам* |
| *Цяжкая доля селяніна, адраджэнне культуры, абуджэнне нацыянальнай свядомасці* | **Тэмы і праблемы** | *Жыццё вёскі, праблема нацыянальна-культурнага адраджэння, Першая сусветная вайна* |
| *Паэма, байка, верш* | **Жанры** | *Сацыяльна-бытавыя апавяданні, гумарыстычныя і псіхалагічныя навелы, навелы-прытчы, алегорыі, імпрэсіі, абразкі* |

**Вывады:** *Беларуская літаратура развівалася хутка і інтэнсіўна: адштурхоўвалася ад набыткаў фальклору; гучалі новыя тэмы і праблемы, змешваліся розныя напрамкі, узнікалі новыя жанры. У прозе пераважалі малыя жанры. За некалькі гадоў беларуская літаратура прайшла шлях, які іншыя народы праходзілі стагоддзямі. Пачынальнікі беларускай літаратуры сталі класікамі.*

**3 група.** Прааналізуйце матэрыял вучэбнага дапаможніка на с. 81-82. Запоўніце табліцу і раскажыце пра станаўленне прафесійнага беларускага тэатра і крытыкі.

*Прыкладны адказ:*

| **Драматургія і літаратурная крытыка** | |
|---|---|
| **Гледачы** | *Доўгі час арыентаваліся на гледача сельскай мясцовасці. Пазней – пераарыентацыя на горад. У гарадах было шмат адукаваных беларусаў, здольных да сцэнічнай дзейнасці* |
| **Арганізатары** | *Алесь Бурбіс, Францішак Аляхновіч* |

| | |
|---|---|
| **Беларускія драматургі і іх творы** | *Ядвігін Ш. “Злодзей”, Карусь Каганец “Модны шляхцюк”, Янка Купала “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”* |
| **Рэпертуар** | *Спачатку ставіліся ў асноўным перакладныя п’есы Элаізы Ажэшкі, Антона Чэхава* |
| **Крытыкі** | *М. Багдановіч, М. Гарэцкі, В. Ластоўскі, А. Луцкевіч* |
| **Умовы ўзнікнення** | *З’явіліся беларускамоўныя тэксты і легальныя перыядычныя выданні на беларускай мове* |

***Фізкультхвілінка.***

✓ **Прэзентацыя вынікаў работы.** (*Групы адказваюць, а вучні занатоўваюць вывады ў сшыткі.*)

Г.А.: Перыёдыка Беларусі мела свой пачатак з першых беларускіх газет, пра якія вы сёння даведаліся. Давайце пазнаёмімся з ўзорамі сучаснай перыёдыкі і параўнаем тэматыку разгледжаных нумароў з тэматыкай газет пататку ХХ стагоддзя. (*Вучням прапануюцца нумары сучасных беларускіх перыядычных выданняў – часопіс “Полымя”, “Маладосць”, газета “ЛіМ”. На слайдах дэманструюцца нумары газеты “Наша ніва”, “Наша доля”*). **Дадатак 3.**

**Вывады:** сучасныя перыядычныя выданні Беларусі вызначаюцца разнастайным матэрыялам, на старонках часопісаў і газет друкуюцца, як і сто гадоў таму, творы беларускіх пісьменнікаў, робяцца літаратуразнаўчыя крытычныя разгляды твораў. Маладыя пісьменніцкія сілы беларускай літаратуры друкуюцца на старонках часопіса “Маладосць”, часопіс “Полымя” працягвае традыцыі беларускай публіцыстыкі, з’яўляецца аўтарытэтным сучасным выданнем.

**III. Рэфлексійна-ацэначны этап.**

✓ **Зварот да праблемнага пытання.**

Г.А.: Чаму, на вашу думку, беларуская літаратура развівалася паскорана? Як цяпер вы адказалі б на праблемнае пытанне?

Г.А.: Назавіце пяць новых фактаў пра развіццё беларускай літаратуры на пачатку ХХ стагоддзя, пра якія вы даведаліся на ўроку?

✓ **Рэфлексія.**

Г.А.: Запоўніце кластар па тэме ўрока. Рабіце пэўныя адзнакі колерам, з якім асацыіруецца тая ці іншая інфармацыя.

*Прыкладны адказ:*

| | | |
|---|---|---|
| **Гістарычныя падзеі:** рэвалюцыйныя падзеі 1905-1907 і 1917 гг., Першая сусветная вайна (1914-1918), савецка-польская вайна (1919-1921). | | **Перыядычныя выданні:** **п**ачатак легальнага друку на беларускай мове. Газеты “Наша ніва” і “Наша доля” выконваюць асветніцкія мэты. |
| | **Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя** | |
| **Паэзія і проза:** паскоранасць, фальклорныя матывы, | | **Драматургія і крытыка:** арыентацыя на гарадскога |

| | | |
|---|---|---|
| фарміраванне нацыянальнага корпуса мастацкіх твораў | | гледача, на змену перакладным п’есам прыйшлі п’есы Ядвігіна Ш., Каруся Каганца, Янкі Купалы. Набірала сілу літаратурная крытыка. |

✓ **Падвядзенне вынікаў. Каменціраванае выстаўленне адзнак.**

Г.А.: Ці справіліся вы з пастаўленымі мэтамі ўрока? Якое заданне на ўроку было для вас самым цікавым?

✓ **Дамашняе заданне.**

Выканаць заданне 11 на с. 82 вучэбнага дапаможніка, заданне 3 на с. 85. Індывідуальнае заданне: с. 85, заданне 4.

## 4.5 Асноўная і дадатковая літаратура

**Асноўная**

Праскаловіч, В.У. Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум : вучэб.- метад. дапам. / В. У. Праскаловіч. – 2-е выд. – Мінск : БДУ, 2023. – 167 с.

**Дадатковая**

Бельскі, А.І. Вучэбна–метадычны комплекс па беларускай літаратуры (структура, склад, крытэрыі і паказчыкі ацэнкі якасці) / А.І. Бельскі, І.Л. Шаўлякова-Барзенка // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 2. – С. 3-8.

Бельскі, А.І. Методыка напісання сачынення / А.І. Бельскі // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 2. – С. 91-115.

Грыцаль, Т.М. Праблема вывучэння жанравай спецыфікі празаічных твораў на ўроках беларускай літаратуры ў 11 класе / Т.М.Грыцаль. – Мінск : Тэхнапрынт, 2003. – 97 с.

Казакова, І.В. Роля фальклору ў сістэме адукацыі / І.В. Казакова // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе : новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 81–82.

Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск : РИВШ, 2011. – 352 с.

Кудряшев, Н.И. Взаимосвязь методов обучения на уроках литературы / Н.И. Кудряшев. – М. : Просвещение, 1981. – 320 с.

Кухарава, І.А. Схема аналізу мастацкага твора / І.А. Кухарава // Беларуская мова і літаратура. – 2001. – № 1. – С. 95–100.

Лугоўскі, А.І. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / А.І. Лугоўскі. – Мінск : БДПУ, 2005. – 92 с.

Лугоўскі, А.І. Слоўнік студэнта-філолага па методыцы выкладання беларускай літаратуры / А.І. Лугоўскі. – Мінск : БДПУ, 2006. – 127 с.

Ляшук, В.Я. Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе : гісторыкаметадычны нарыс (даваенны перыяд) / В.Я. Ляшук. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 128 с.

Ляшук, В.Я. Літаратурнае краязнаўства ў школе / В.Я. Ляшук. – Мінск : Выш. школа, 1991. – 148 с.

Макарэвіч, А.М. Методыка выкладання беларускай літаратуры [Электронны рэсурс] : вучэб. – метад. матэрыялы / А.М. Макарэвіч, Н.П. Дзеравяга, В.І. Караткевіч. – Электрон. даныя. – Магілёў: УА “МДУ імя А.Куляшова”, 2012.

Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. для ВНУ / пад рэд. В. Я. Ляшук. – Мінск : Асар, 2002. – 416 с.

Рагойша, В. Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 576 с.

Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапаможнік / В. Рагойша. – Мінск : БелЭн, 2001. – 384 с.

Русілка, В.І. Эпас, лірыка, драма: дыферэнцыяцыя метадаў і прыёмаў школьнага аналізу твораў / В.І. Русілка // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе : новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі ; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 171–174.

Руцкая, А.В. Методыка выкладання беларускай літаратуры / А.В. Руцкая, М.У. Грынько. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2010. – 184 с.

Руцкая, А.В. Пазакласная праца па беларускай літаратуры : дапам. для настаўнікаў / А.В. Руцкая. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 165 с.

Урок літаратуры ў школе : кніга для настаўніка / пад рэд. М.А. Лазарука, В.У. Івашына. – Минск : Нар. асвета, 1995. –148 с.

# ДАДАТАКІ

Дадатак 1



Ілья Рэпін “Маніфэстацыя 17 кастрычніка 1905 года”, 1907—1911.



Васіль Несцярэнка “Мы – рускія, з намі Бог!”, 2015.



Міхаіл Авілаў, “Прарыў польскага фронту Першай коннай арміяй”, 1928.

Дадатак 2


1


2


3


4.


5.


6.


7.


8.

## *Тэхналагічная карта ўрока*
## *(па тэме “Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя”)*

| Этапы ўрока, час | Задачы | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў | Прагназуемыя вынікі |
|---|---|---|---|---|
| 1. Арганізацыйна-матывацыйны этап<br><br>15 хвілін | Падрыхтоўка вучняў да працы на занятках | Арганізацыя ўвагі вучняў | Самаарганізацыя на прадуктыўную дзейнасць | Поўная гатоўнасць класа і абсталявання, адпаведны псіхалагічны і эмацыянальны настрой вучняў |
| | Забеспячэнне матывацыі і прыняцця вучнямі мэты ўрока | Стварэнне сітуацыі для ўспрымання мэты ўрока вучнямі | Асэнсаванне і прыняцце вучнямі мэты і задач для паспяховай дзейнасці на ўроку | Уяўленне пра мэту ўрока, наяўнасць матывацыі на далейшую пазнавальную дзейнасць |
| | Праверка дамашняга задання | Азнаямленне вучняў з тэставай работай і ўмовамі яе выканання | Адказы на пытанні тэста, узаемаправерка, аналіз памылак, самакарэкцыя | Ацэнка ступені падрыхтаванасці вучняў па папярэдняй тэме |
| | Актуалізацыя апорных ведаў | Правядзенне франтальнай гутаркі з класам па ўводных пытаннях тэмы | Адказы вычняў на прапанаваныя настаўнікам пытанні | Гатоўнасць вучняў да актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці на аснове апорных ведаў |
| 2. Аперацыйна-пазнавальны этап+ Фізкультхвілінка<br><br>20 хвілін | Вывучэнне новага матэрыяла, фарміраванне практычных уменняў і навыкаў | Дэманстрацыя слайдаў, слова настаўніка, франтальная гутарка, арганізацыя работы па групах, кансультаванне (пры неабходнасці) | Актыўная пазнавальная дзейнасць, адказы на пытанні настаўніка, праца з вучэбным дапаможнікам, выкананне заданняў у сшытках, работа з раздатачным матэрыялам, прэзентацыя вынікаў работы | Засваенне новага матэрыялу па тэме ўрока |
| 3. Рэфлексійна-ацэначны этап<br><br>7 хвілін | Рэфлексія дзейнасці, высвятленне ўзроўню авалодвання новымі ведамі, забеспячэнне карэкцыі | Арганізацыя франтальнай гутаркі па праблемным пытанні тэмы, высвятленне якасці засваення новага матэрыялу | Запаўненне кластару па тэме ўрока | Атрыманне інфармацыі аб дасягненнях вучнямі плануемых вынікаў навучання |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4. Падвядзенне вынікаў. Каменціраванае выстаўленне адзнак 2 хвіліны | Падвядзенне вынікаў працы на ўроку | Падагульняючае слова настаўніка, каменціраванае выстаўленне адзнак | Рэфлексійнае асэнсаванне ўрока | Асэнсаванне вучнямі сваёй дзейнасці на ўроку |
| 5. Дамашнее заданне 1 хвіліна | Забеспячэнне ўсведамлення вучнямі зместу дамашняга задання | Фармуліроўка і каментарый дамашняга задання | Запіс дамашняга задання ў дзённікі | Рэалізацыя ўмоў для выканання дамашняга задання вучнямі ў адпаведнасці з актуальным узроўнем іх развіцця |

Вучэбнае выданне

# МЕТАДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 6-05-0232-01 БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАЛОГІЯ

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне

Складальнік
**ГЛАДКОВА** Ганна Аляксандраўна

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Камп’ютарны дызайн *А.У. Табанюхава*

Падпісана ў друк 2024. Фармат 60х84 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 5,06. Ул.-выд. арк. 4,49. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.